# У Н У М А Р Ы


**Ад рэдакцыі**

## ГІСТОРЫЯ

*Марзалюк Ігар* (Магілёў). Да пытання аб этнічнай і палітычнай свядомасці ўсходнеславянскага насельніцтва ў 10-13 стст.
*Гардзееў Юры* (Кракаў-Гародня). Да пытання аб планіроўцы Гародні ў другой палове 13 пачатку 15 ст.
*Смалянчук Алесь* (Гародня). Краёвец Антон Луцкевіч

**АРХЕАЛОГІЯ**
*Бохан Юры* (Менск). Класіфікацыя познясярэднявечных шпор Вялікага Княства Літоўскага другой паловы 14-16 ст.

**ДАКУМЕНТ**
Антон Луцкевіч пра беларускае Адраджэнне пачатку 20 ст.

**РЭЦЭНЗІІ**
Zasztowt L. Kresy. 1832-1863. Szkolnictwo na ziemiach litewskich i ruskich dawwnej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1997. 456 s. *(Куль-Сяльверстава Святлана)*
Szwarc A. Od Wielopolskiego do Stronnictwa Polityki Realnej. Zwolennicy ugody z Rosją, ich poglądy i próby działalności politycznej (1864-1905). Warszawa, 1996. - 332 s. *(Смалянчук Алесь)*

**НАВУКОВАЯ ХРОНІКА**
"Краёвасць: традыцыі згоды народаў у эпоху нацыяналізму". Міжнародная навуковая канферэнцыя. Познань (Польшча). 11-13 траўня 1998 г.

## КРАЯЗНАЎСТВА

*Краўцэвіч Аляксандр* (Гародня). Дынастыя Ягелонаў –
– міф ці рэальнасць?
*Гайба Мікола* (Наваградак). Наваградак і ягоныя жыхары ў поль скай краязнаўчай літаратуры першай трэці 20 ст.

**КРАЯЗНАЎЧАЕ ЖЫЦЦЁ**
*Вяршыцкая Тамара* (Наваградак). Наваградскі "Прамень".

# ГІСТАРЫЧНЫ АЛЬМАНАХ

**навуковы гістарычны і краязнаўчы часопіс**

**1998 №1**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:**

Аляксандр Краўцэвіч (рэдактар),
Алесь Смалянчук (намеснік рэдактара),
Валянцін Голубеў
Павел Лойка

Адрас рэдакцыі:

в. Будзёнага 48а
230023 Гародня
Беларусь
тэл./факс **(+152) 44 22 90**
**E-mail:**
**root@ratusha.belpak.grodno.by**

**Падпісана да друку 7.08.98.**
**Афсетны друк**
**Фармат 60х90/16**
**Наклад 60 асобнікаў**

*Надрукавана пры падтрымцы*
*Гарадзенскага грамадскага аб'яднання "Ратуша"*

*Навуковыя артыкулы рэцэнзуюцца*

**© "Гістарычны альманах", 1998.**

# АД РЭДАКЦЫІ

Часопіс выразна падзелены на дзве часткі. Навуковая частка (Гісторыя) - гэта артыкулы, публікацыі, рэцэнзіі, навуковая хроніка. Краязнаўчая частка (Краязнаўства) - адлюстраванне бягучага краязнаўчага жыцця, матэрыялы канферэнцый, семінараў і іншых збораў, навукова-метадычныя матэрыялы, папулярныя тэксты, лісты краязнаўцаў, першыя публікацыі маладых аўтараў, краязнаўчы каляндар, падборкі матэрыялаў па гісторыі асобных паселішчаў і мясцовасцей і інш. Размеркаванне тэкстаў па раздзелах адбываецца паводле іх зместу. Навуковая ступень, пасада, узрост, рэгаліі аўтара ў разлік не прымаюцца.

Рэдакцыя спадзяецца на поспех задуманай справы. Праз пэўны час плануецца распачаць падрыхтоўку да афіцыйнай рэгістрацыі часопіса з мэтай павелічэння яго накладу.

* * *

# ГІСТОРЫЯ

Ігар Марзалюк (Магілёў)

## ДА ПЫТАННЯ АБ ЭТНІЧНАЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў 10 - 13 СТСТ.

У савецкай паваеннай гістарыяграфіі трывала замацаваўся погляд аб існаванні старажытнарускай народнасці і фармаванні ў выніку яе дывергенцыі асобных усходнеславянскіх народнасцяў у 14-16 стст.[1] Аднак, што разумее большасць даследчыкаў, ужываючы тэрмін "народнасць" у дачыненні да славянскага насельніцтва Кіеўскай Русі? Звычайна падразумяваецца існаванне ўстойлівага моўнага ўсходнеславянскага адзінства і досыць позняе ўтварэнне ўласна беларускай, украінскай і расейскай моваў. Але даследаванне моўнай сітуацыі, якая існавала ва Усходняй Еўропе ў 10-13 стст., ставіць пад вялікае пытанне абгрунтаванасць гэткай высновы. Пасля вывучэння А.Залізняком мовы ноўгарадскіх берасцяных грамат быў канчаткова даведзены факт існавання ў 11-12 стст. старажытнейшага ноўгарадска-пскоўскага дыялекта, які адрозніваўся ў гэты час ад паўднёварускага (кіеўскага) не менш чым двума дзесяткамі істотных прыкмет. Адначасова гэты дыялект многімі элементамі быў падобны да моваў балтыйскіх славянаў, а таксама да моваў сербска-славенскай групы. І толькі ў 13-15 стст. назіраецца паступовая нівеліроўка гэтых дыялектных адметнасцяў у выніку ўзаемадзеяння з суседнімі суздальскімі дыялектамі[2].

Тое ж самае тычыцца і беларускай мовы. У свой час Л. Аляксееў адзначыў той факт, што "некаторыя межы, падзяляючыя розныя дыялектныя з'явы, паўтараюць

---

[1] Фроянов И.Я. Киевская Русь. Ленинград, 1990. С. 9-27.

[2] Зализняк А.А. Значение новгородских берестяных грамот для истории русского и других славянских языков // Вестник АН СССР. Москва. 1988. №8. С. 99.

племянныя межы ранняга жалезнага веку"[3]. Гэта ж самае пераканаўча давёў і В.Сядоў[4]. Тэорыя В.Сядова аб балцкім субстраце ў этнагенэзе беларусаў і фармаванні ў 8-13 стст. беларускай этнічнай супольнасці на сённяшні дзень прызнаецца большасцю даследчыкаў. Аналіз усяго комплексу дадзеных дазваляе казаць аб наяўнасці ўжо на пачатку 2 тысячагоддзя новай этнічнай супольнасці, якая пазней атрымала назву беларусаў[5]. Бясспрэчным фактам зараз лічыцца і ўдзел іранскага і фіна-вугорскага субстрата ва ўкраінскім і, адпаведна, расейскім этнагенэзе, аб чым яскрава сведчаць дадзеныя антрапалогіі, мовазнаўства і фальклору[6].

Нельга сур'ёзна ставіцца і да апеляцыі пра аднароднасць матэрыяльнай культуры Кіеўскай Русі як этнаўтвараючага фактару. Па-першае, ужо неаднаразова адзначаўся той факт, што культурная агульнасць унутры ўстойлівых летапісных племянных саюзаў прасочваецца па курганных матэрыялах 12-13 стст. і па яшчэ больш позніх дадзеных дыялекталогіі[7]. Па-другое, кажучы пра матэрыяльную культуру ўсходнеславянскіх гарадоў, трэба памятаць, што культавая архітэктура, прыкладное мастацтва нясуць на сабе выразны адбітак магутнейшых рэцэпцыяў візантыйскай цывілізацыі. Менавіта майстры Візантыі непасрэдна прычыніліся да ўзнікнення шэрагу помнікаў Усходняй Еўропы[8]. Калі прытрымлівацца логікі прыхільнікаў агульнасці гарадской культуры Кіеўскай Русі як фактару этнічнай кансалідацыі ў адзіную народнасць, то

---

[3] Алексеев Л.В. Полоцкая земля. Москва, 1966. С. 32.

[4] Седов В.В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья. Москва, 1982. С. 184-185.

[5] Дучыц Л. Балты і славяне на тэрыторыі Беларусі ў пачатку II тыс. н.э. // Беларускі гістарычны агляд. 1995. Т. 2. Сш. 1. С. 29.

[6] Седов В.В. Восточные славяне в VI - XIII вв. Москва, 1982. С. 113, 195-196.

[7] Рыбаков Б.А. Первые века русской истории. Москва, 1964. С. 148-149; Седов В.В. Восточные славяне ... С. 270.

[8] Пуцко В. Аб еўрапейскім кантэксце сярэдневяковага мастацтва Беларусі // Беларусіка. Мінск, 1993. Кн. 1. С. 303-306.

можна нават абвясціць існаванне адзінай народнасці ў межах ВКЛ у 16-17 стст., бо ў гэты час ад Інфлянтаў да Магілёва мы бачым аднародную гарадскую культуру (аднолькавыя тэхнічныя прыстасаванні і тэхналогіі, сінхроннасць у развіцці розных відаў рамёстваў, узнікненне новых тыпаў вырабаў, іх стылістыкі і ўпрыгожванняў). Аднароднасць матэрыяльнай культуры ўсходнеславянскіх гарадоў не можа быць аргументам у пытанні існавання ці адсутнасці ўсходнеславянскага этнасу.

Аднак аўтара найперш цікавіла праблема этнічнай і палітычнай самаідэнтыфікацыі ўсходнеславянскага насельніцтва ў эпоху Кіеўскай Русі, бо менавіта яна з'яўляецца важнейшай у вырашэнні гэтага пытання.

## Этнічная свядомасць.

Аксіёмай афіцыйнай савецкай гістарыяграфіі стала сцвярджэнне, што стрыжнёвай ідэяй "Аповесці мінулых часоў" з’яўляецца ідэя ўсходнеславянскага адзінства[9]. Наколькі гэтаму адпавядаюць рэаліі пачатку 12 ст., калі Нестар працаваў над летапісам? Тэкст "Аповесці" наскрозь прасякнуты "патрыятычным" пачуццём русіна - паляніна ў дачыненні да ўласна Кіеўскай зямлі і выразным супрацьпастаўленнем ёй усіх астатніх славянскіх плямёнаў, што ўвайшлі ў склад Русі. "Мы" для патрыёта-кіяўляніна - гэта "поляне яже ныне зовомая Русь". Яны "живуще особе" ад усіх іншых, вядуць свой пачатак ад мужоў "мудрых и смысленых" легендарных часоў Кія, Шчэка і Харыва і "дожыли они в Киеве и до сего дне"[10].

За межамі ягонай палянскай Русі цягнуўся свет, па словах Б.А.Раманава, "двуногіх звяроў і быдла"[11], да якіх немагчыма ўжываць хрысціянскія меркі, бо ўсе яны (вяцічы, радзімічы, драўляне, крывічы ды іншыя) без вынятку "паганцы", што "живяху звериньским образам, живуще

[9] Толочко П.П. Древняя Русь. Киев, 1987. С. 182.
[10] Повесть временных лет [у:] Повести Древней Руси. Москва; Ленинград, 1983. С. 27-28, 34; Романов Б.А. Люди и нравы Древней Руси. Москва-Ленинград, 1966. С. 94.
[11] Романов Б.А. Люди и нравы Древней Руси. С. 95.

скотьски"[12]. Продкі ноўгарадцаў - славене, таксама недалёка адыйшлі ад "паганцаў". І абсмяяў іх сам апостал Андрэй, і не "задалися" ім тонкія ветразі падчас Візантыйскага пахода, і князь, які паважае сябе, да іх на стол не пойдзе[13].

Найменні летапісных плямён існуюць да сярэдзіны 12 ст., прычым не заўсёды як рэтраспекцыя. Калі ў 1128 г. адбылася выправа на Полаччыну, то летапісец ведаў, што кааліцыя ідзе на "кривиче", як і тое, што Глеб Менскі ў 1113 г. "воевал дреговичи". А Уладзімір Давыдавіч, які пісаў у 1147 г. да Ізяслава Мсціславіча ў Кіеў, ясна ўсведамляў, што яго воласць - гэта "вятиче"[14].

У якасці этноніма ва ўсіх дамангольскіх пісьмовых крыніцах тэрміны "Русь", "русін", "рускі" ужываліся толькі ў дачыненні да жыхароў паўднёвых княстваў -- "Рускай зямлі" ў вузкім сэнсе гэтага слова, якая размяшчалася вакол гарадоў Кіева, Пераяслаўля, Чарнігава і Ноўгарада-Северскага. У летапісных крыніцах 12 ст. жыхары іншых княстваў-земляў выразна супрацьпастаўлялі сябе гэтай "Русі". Гэта тычыцца як насельніцтва Уладзіміра-Суздальскай, гэтак і Смаленскай, Галіцкай ды іншых земляў[15]. Аўтар "Слова пра паход Ігаравы" ўжываў тэрмін "Руская зямля" ў першапачатковым сэнсе, як і яго сучаснікі-летапісцы. Русічамі ён называў воінаў з Чарнігаўскага і Ноўгарад-Северскага княства[16].

Як вядома, існавала і ўяўленне аб "Рускай зямлі" ў шырокім сэнсе. Аднак наколькі абгрунтавана лічыць гэты

---

[12] Повесть временных лет... С. 28-29.

[13] Пашуто В.Т. Летописные традиции о "племенных княжениях" и варяжский вопрос [у:] Летописи и хроники. Москва, 1973. С. 103-110.

[14] Полное собрание русских летописей (далей ПСРЛ). Т 1. Вып 2. Ленин-град, 1927. С. 297-298; ПСРЛ. Т 2. Москва-Ленинград, 1962, Стб. 282; Рыбаков Б.А. Древняя Русь. Сказания. Былины. Летописи. Москва, 1963. С. 319.

[15] Тихомиров М.Н. Русское летописание. Москва, 1979. С. 23-24.

[16] Штыхаў Г.В. Погляды аўтара "Слова пра паход Ігаравы" на гісторыю Полацкай зямлі // Вечна жывое "Слова". Мінск, 1989. С. 105.

тэрмін этнонімам? Не выклікае пярэчання той факт, што ў шырокім сэнсе тэрмін "Руская зямля" прыкладаецца да ўсіх усходнеславянскіх земляў, якія ўваходзілі ў склад Кіеўскай дзяржавы і падпарадкоўваліся дынастыі Рурыкавічаў[17]. Аднак у такім выпадку лагічна казаць пра палітычны, а не этнічны змест гэтага тэрміну. Менавіта так трактаваў "Рускую зямлю" 11-12 стст. В.Ключэўскі[18]. Даследчыкамі адзначалася адна агульная рыса паведамленняў аб "Русі" ў шырокім сэнсе, а менавіта тое, што Валынская, Ноўгарадская альбо Растоўская зямля становяцца для летапісца "Руссю" толькі тады, калі размова ідзе аб канфліктах з суседнімі дзяржавамі і народамі, якія ў склад "Рускай зямлі" як дзяржаўнагенеалагічнай агульнасці не ўваходзяць[19].

Не пераканаўча выглядаюць і спасылкі на такую крыніцу, як "Слово о погибели Рускыя земли", створаную ў другой палове 13 ст. у Паўночна-Усходняй Русі. "Руская зямля", якая займала тэрыторыю ад "Угор" і да "Балгар" і супрацьпастаўлялася іншаверным суседзям ("поганьским странам"), выступае як адзінае цэлае, падпарадкаванае вярхоўнай уладзе родапачынальніка ўладзіміра-суздальскіх князёў 13 ст. - Усевалада Вялікае Гняздо. Тут акрэслена не месца рускіх сярод іншых народаў, як беспадстаўна сцвярджаецца да гэтага часу асобнымі даследчыкамі, а акцэнтуецца ўвага на тым, што "<...>то всё покарено было богом крестияньскому языку"[20]. Тэрмін "Руская зямля" ў дадзеным выпадку пазначаў тэрыторыю, якая ўваходзіла ў склад Кіеўскай Русі, і выступаў у якасці канфесіоніма і палітоніма, а не этноніма. Відавочна і імкненне летапісца адлюстраваць прэтэнзіі "свайго" княскага роду на спадчыну Кіеўскага перыяду.

[17] Флоря Б. Н. Исторические судьбы Руси и этническое самосознание восточных славян в ХП - XV веках // Славяноведение. 1993. № 2. С. 43-44.
[18] Ключевский В.0. Сочинения. Москва, 1956. Т. 1. Ч. 1. С. 167.
[19] Флоря Б. Н. Исторические судьбы Руси ... С. 46.
[20] Памятники литературы Древней Руси. XIII век. Москва, 1981. С. 130; Флоря Б. Н. Исторические судьбы Руси ... С. 48.

Нельга таксама блытаць з этнонімамі і канфесіонімы. Паказальны ў гэтым "Список русских городов дальних и ближних", цікавейшая крыніца канца 14 ст. У гэтым дакуменце да "рускіх" гарадоў аднесены "Болгарскыи и волоскии гроди"[21], што ставіць у тупік даследчыка, які жадае бачыць у гэтай крыніцы сведчанне пра захаванне ўсведамлення ўсходнімі славянамі свайго этнічнага адзінства. Як пераканаўча паказаў Е.Навумаў, у 1394-1396 гг. Кіеўскі мітрапаліт Кіпрыян склаў схему паслядоўнага падпарадкавання Кіеву Балгарыі, Малдовы і Галіча ў сферы кананічнай, царкоўнай юрысдыкцыі. Для гэтага па ініцыятыве Кіпрыяна і быў складзены "Список". Аднак Канстанцінопальскі патрыярх Антоній у 1397 г. даў рашучы адпор дамаганням Кіеўскага мітрапаліта. "<...>"Список русских городов дальних и ближних" застаўся неажыццяўлёным праектам і сведчаннем памкненняў Кіпрыяна"[22]. Як бачым, у выпадку кананічнага падпарадкавання неўсходнеславянскіх земляў яны аўтаматычна становяцца "рускімі", г. зн. залежнымі ад Кіеўскай метраполіі.

Калі ж лічыць тэрмін "Руская зямля" ў шырокім сэнсе этнонімам, то згодна такой логікі трэба разглядаць у якасці этнонімаў і тэрміны "Літва" і "Літоўская зямля" ў шырокім сэнсе. У канцы 15-16 ст. яны адлюстроўвалі ўсведамленне прыналежнасці розных этнічных земляў да Літвы як палітыка-тэрытарыяльнага цэлага. І ў гэтым выпадку перад намі ні што іншае як палітонім.

У сувязі з важнасцю элементаў палітычнай свядомасці паспрабуем прасачыць этапы яе фармавання ў насельніцтва Кіеўскай Русі на розных этапах існавання апошняй.

## Палітычная свядомасць.

**П**аняцце "Русь" у палітычным і сацыяльным сэнсе гэтага слова ў 11-12 стст. азначала найперш за ўсё княскую

---

[21] Тихомиров М.Н. Русское летописание. С. 94-96.

[22] Наумов Е.П. К истории летописного "Списка русских городов дальних и ближних" [у:] Летописи и хроники... С. 150-164.

дружыну, вышэйшую дзяржаўную арыстакратыю[23]. Тэрмін "рускія князі" азначаў сукупнасць членаў княскага роду Рурыкавічаў. Кожная з галінаў княскага роду мела фармальнае права на "прычасце" (долю) Рускай зямлі ў вузкім сэнсе, а значыць і права на вялікакняскі Кіеўскі стол. Сярод Яраславічаў жыло ўсведамленне права ўсіх членаў іх роду на Кіеўшчыну, бо яны "не угры и не ляхи, а единого деда внуки"[24]. Заклік аўтара "Слова..." да ўсіх "рускіх князёў" - гэта якраз заклік да іх, як да "единого деда внуков", заклік да агульнага пахода супраць полаўцаў, якія пагражалі ўласна "Рускай зямлі", заклік да іх агульнародавай уласнасці.

У сувязі з гэтым цікава прасачыць узнікненне выразнай генеалагічнай свядомасці ў розных галінах роду Рурыкавічаў. Аўтар "Слова..." падзяліў усіх князёў Кіеўскай Русі на дзве галіны: "Ярославли вси внуци и Всеславли"[25].

У пачатку 12 ст. (як лічыць Ю.Заяц, у 1128 г.) у летапісы было занесена родавае паданне полацкіх князёў. У ім выразна падкрэслівалася выключнае права полацкага роду на валоданне Полаччынай і яго генеалагічная асобнасць: 1) Яны "Роговоложи внуци" і таму адзіна законныя спадчыннікі Полацкай зямлі; 2) Рагнеда выступае як мсціўца за вынішчэнне свайго рода і за захоп Уладзімірам "Отчины", якая належыць ёй па праву. Гэтае права на "Отчину" прызнавалася, згодна падання, і "болярством" Уладзіміра[26].

Істотна адзначыць тую акалічнасць, што Полацкая зямля ва ўсходнеславянскіх крыніцах 11-12 стст. нідзе ў складзе "Рускай зямлі" ў шырокім сэнсе не згадваецца. Гэта тлумачыцца якраз вышэйзгаданымі генеалагічнымі прычынамі.

Як вядома, ужо ў 11 ст. на ўсёй тэрыторыі Кіеўскай Русі пачало складвацца ўяўленне аб княскай "Отчине". Рашэнне з'езда ў Любечы ў 1097 г. ("кождо да держит

---

[23] Мельникова Е.А., Петрухин В.Я. Название "Русь" в этнокультурной истории Древнерусского государства (IX - X вв.) // Вопросы истории. 1989. № 8. С. 29.

[24] Ключевский В.0. Сочинения. Т 1. Ч. 1. С. 175.

[25] Слово о Полку Игореве **[у:]** Повести Древней Руси… С. 390.

[26] Заяц Ю.А. Заславль X - XVIII веков. Минск, 1987. С. 8-27.

отчину свою") замацавала права кожнага Яраславіча на тую воласць-княства, якой валодаў іх бацька па Яраслававу падзелу[27]. Паняцце "Отчины" фармавала своеасаблівы рэгіянальны "патрыятызм". Паказальны адказ аднаго з Манамахавічаў Усеваладу Ольгавічу Чарнігаўскаму, які, заняўшы ў 1139 г. Кіеў, хацеў перавесці яго з "отческого" Пераяслаўля ў Курск: "<...>лучше мне смерть на своей отчине и дедине, чем Курское княжие; отец мой в Курске не сидел, а Переяславле: хочу умереть на своей отчине"[28].

Яскравай праявай далейшай дыферэнцыяцыі дынастычнай свядомасці з'яўлялася ўзнікшая ў гэты час выразная тэндэнцыя падкрэслівання асаблівай значнасці сваёй галіны роду, яе ўхваленне. Гэта адбілася і на тэрміналогіі. "Яраславы внуцы", памятаючы аб агульнасці паходжання, мянуюць сябе па імені заснавальнікаў удзельных дынастыяў. Цяпер яны найперш Ольгавічы, Манамахавічы, Расціславічы. У помніках летапісання кожнай з земляў акцэнтуецца ўвага на мужнасці і славе "свайго" княскага роду, які не здольны на благія ўчынкі, не здраджвае клятвам і з павагай ставіцца да іншых "братоў"-князёў. Разам з гэтым не шкадуецца "чорнай фарбы" для прадстаўнікоў варожых дынастыяў іншых земляў[29].

Кіеўскі стол па-ранейшаму найбольш пажаданы і прэстыжны, алё ён ужо толькі першы сярод роўных. У 12 ст. тытул "великое княжение" і "великий князь" ужываўся і да чарнігаўскіх, і да ўладзімірскіх ды іншых уладароў асобных земляў-княстваў[30]. Той жа працэс дыферэнцыяцыі дынастычнай свядомасці мы бачым і ў княскай геральдыцы. Кожная галіна роду Рурыкавічаў скарыстоўвала агульнародавы трызуб і відазмяняла яго. З'явіліся цэлыя серыі знакаў, кожная з якіх адпавядала толькі асобнай дынастычнай галіне рода[31].

---

[27] Ключевский В.0. Сочинения. Т 1. Ч. 1. С. 183.

[28] Там же. С. 184.

[29] Рыбаков Б.А. Древняя Русь... С. 302-311.

[30] Рыбаков Б.А. Киевская Русь и русские княжества XII - XIII вв. Москва, 1982. С. 476.

[31] Молчанов А.А. 0б атрибутации лично-родовых знаков князей

Князь гэтага часу мысліўся тым жа Даніілам Заточнікам у маштабах стольнага горада, уласнага княства-дзяржавы, а не ўсёй "Рускай зямлі": "Дуб крепок множеством корения; тако и град наш твоею державою"[32]. Што гэта не выключэнне, а правіла, сведчаць і іншыя тэксты. Узорнай у гэтым сэнсе з'яўляецца "Похвала роду рязанских князей". "Похвала" распадаецца на некалькі ўзаемазвязаных сюжэтаў, адзначаецца, што "сии бо государа рода Владимира Святославича", падкрэсліваецца іх хрысталюбства і выключныя асабістыя якасці, клопат і абарона імі Разанскай зямлі, якую яны "от супостат велми без ленности храняща". Галоўнае для іх - княскі стол, "агульназямельныя" інтарэсы, падтрымка і захаванне якіх з'яўляецца ў вачах летапісца адной з найвялікшых княскіх дабрадзейнасцяў[33].

Усё гэта спрыяла кансалідацыі насельніцтва княстваў, усведамлення ім свайго тэрытарыяльна-палітычнага адзінства. У выніку да сярэдзіны 12 ст. зніклі племянныя назвы і адзіным найменнем зямлі стала назва, вытворная ад назвы горада - адміністрацыйнага і культурнага цэнтра княства.

Як паказалі даследаванні Б.Флоры, пасля мангольскай навалы адбыліся істотныя змены ў этнічнай і палітычнай ментальнасці насельніцтва былой Кіеўскай Русі. На працягу 13-14 стст. выразна прасочваецца тэндэнцыя атаясамлення менавіта свайго палітычнага ўтварэння з "всей Руской землёй". У выніку развіцця гэтага працэсу ў 14-15 стст. на поўначы Русі і ў ВКЛ канчаткова замацавалася атаясамліванне сваёй дзяржавы з "всей Руской землёй", а насельніцтва адпаведна - з "русінамі", "рускімі". Пры гэтым на ўсходнеславянскіх землях ВКЛ пазбягалі распаўсюджваць гэту назву на тыя землі ўсходніх славянаў, што знаходзіліся за межамі іх дзяржавы. Так, у якасці назвы насельніцтва ўсходнеславянскіх земляў, якія аб'ядналіся вакол Масквы,

---

Рюриковичей X -XIII вв. // Вспомогательные исторические дисциплины. Москва, 1985. Т. 16. С. 66-83.

[32] Романов Б.А. Люди и нравы Древней Руси. С. 21.

[33] Памятники литературы Древней Руси... С. 200-202.

пастаянна ўжываецца тэрмін "масквічы"[34]. Больш таго, як у беларуска-літоўскіх летапісах, гэтак і ў маскоўскіх, складваецца традыцыя ўсяляк падкрэсліваць пераемнасць кіеўскай традыцыі сваёй дзяржавай. Напрыклад, у беларуска-літоўскіх летапісах даказваецца легітымнасць права вялікіх князёў на валоданне ўсімі ўсходнеславянскімі землямі, на кіеўскую спадчыну. Суверэнітэт ВКЛ супрацьпастаўляецца васальнай залежнасці Маскоўскай Русі ад Арды[35].

Мы бачым добра знаёмы этнолагам працэс ператварэння палітоніма ў этнонім, які першапачаткова і для беларуска-ўкраінскай супольнасці, і для земляў будучай Расеі быў агульным ("русь", "рускі"). Аднак "рускім" лічылася толькі сваё насельніцтва як і "ўсёй Рускай зямлёй" - толькі ўласнае палітычнае ўтварэнне. Перад намі яскравая дыферэнцыяцыя як этнічнай, гэтак і палітычнай свядомасці.

Падобныя рэчы добра вядомы з гісторыі іншых этнапалітычных утварэнняў Еўропы. З сярэдзіны 7 ст. у выніку адасаблення кожнага з меравінгскіх каралеўстваў знікла агульная самасвядомасць "палітычнага" народа gens Francorum. У канцы 7 ст. пачалося фармаванне асобнай нейстрыйскай самасвядомасці, у сістэме якой франкамі лічыліся толькі жыхары Нейстрыі. Тэрытарыяльная раз'яднанасць знішчыла адзіную самасвядомасць у каралеўстве вестготаў. Паняцце "готы" стала распаўсюджвацца толькі на жыхароў уласна Іспаніі[36].

Няма ніякіх падставаў казаць аб насельніцтве Кіеўскай Русі як устойлівым, аднародным этнічным утварэнні. У выніку падпарадкавання земляў усходніх славянаў дынастыі Рурыкавічаў склалася ўяўленне аб палітычнай і тэрытарыяльнай агульнасці гэтых земляў. У гэты час адбывалася фармаванне надплемяннога "палітычнага" народа.

---

[34] Флоря Б. Н. Исторические судьбы Руси ... С. 46-61.

[35] ПСРЛ. Т.35. Москва, 1980. С. 42-43, 59, 91-92, 129-132, 146.

[36] Ронин В.К. Франки, вестготы, лангобарды в VI - VIII вв.: политические аспекты самосознания // Одиссей. Под ред. А.Гуревича. Москва, 1989. С. 69-70.

Кіеўская Русь - гэта метаэтнапалітычная супольнасць, падобная на такія ўтварэнні, як арабскі Халіфат, Габсбургская манархія, імперыі Карла Вялікага, Чынгісхана, Вялікіх Маголаў. На погляд аўтара, досыць пераканаўча выглядае выказанае В.Каралюком меркаванне аб старажытнарускай і старажытнапольскай народнасцях як пэўных кангламератах "пранароднасьцяў"[37].

[37] Обсуждение доклада А.Р.Корсунского // Средние века. Москва, 1968. Вып. 31. С. 144.

KAMUNIKAT.org

***Юры Гардзееў*** **(***Кракаў - Гародня***)**

# ДА ПЫТАННЯ АБ ПЛАНІРОЎЦЫ ГАРОДНІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 13 - ПАЧАТКУ 15 СТ.

Сярэдзіна-другая палова 13 ст. была часам радыкальных перамен на палітычнай карце Усходняй Еўропы. Паўднёвыя і ўсходнія землі Кіеўскай Русі моцна пацярпелі ад татарскага нашэсця. Пагроза з боку ваяўнічых орд, а таксама небяспека крыжацкіх нападаў адыгралі ролю вонкавага імпульса, які падштурхнуў працэс фарміравання ў Панямонні новай балта-славянскай дзяржавы - Вялікага Княства Літоўскага. Яшчэ адным з вынікаў палітычных змен у рэгіёне было часовае ўзвышэнне Галіцка-Валынскага княства. У канцы 40-х гадоў 13 ст. адносіны паміж гэтымі двумя дзяржавамі пагоршыліся і перараслі ў ваенны канфлікт, які працягваўся да 70-х гадоў стагоддзя[1]. Стратэгічнай мэтай галіцка-валынскіх князёў, якія арганізавалі некалькі паходаў на землі Панямоння (у тым ліку на Гародню ў 1253, 1259, 1274, 1277)[2], было поўнае падпарадкаванне гэтай тэрыторыі.

Пачынаючы з 1283 г. Гародню чакалі новыя выпрабаванні, бо з'явіўся новы вораг - крыжакі. У выніку пяцідзесяцігадовай экспансіі яны канчаткова захапілі землі прусаў і яцвягаў. Чарговай мэтай крыжацкай агрэсіі стала авалоданне тэрыторыяй Панямоння і ўстанаўленне кантролю над галоўнай воднай артэрыяй рэгіёна - Нёманам[3]. З 80-х гадоў 13 і да пачатку 15 ст. Гародня, якая была "ключом" да кантролю над сярэднім цячэннем ракі, каля дваццаці разоў падвяргалася іх нападам. Часам найбольш крывавых

---

[1] Пашуто В.Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси. Москва, 1950. С. 247, 281.

[2] Полное собрание русских летописей (далей ПСРЛ). Т. 2. Санкт-Петербург, 1843, С. 188, 197, 207, 345; Пашуто В.Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси... С. 281, 283, 294.

[3] Łowmiański H. Prusy - Litwa - Krzyżacy. Warszawa, 1989. S. 190-192.

---

сутыкненняў з ордэнскімі рыцарамі стала мяжа 13 і 14 ст. Крыжакі некалькі разоў (1284, 1296, 1305, 1306, 1311, 1328 гг.) палілі і рабавалі пасады і ваколіцы Гародні[4]. Крыжацкія напады адбываліся і ў 60-70-я гады 14 ст. (1361, 1363, 1375, 1377)[5]. 13 верасня 1379 года князі Ягайла і Кейстут падпісалі мірны дагавор з крыжакамі на дзесяць год, які павінен быў запэўніць для ВКЛ, а значыць і для гарадоў Панямоння, хаця б кароткачасовы спакой[6].

Пачатак 90-х гадоў 14 ст. быў перыядам новых ваенных сутыкненняў, якія непасрэдна закранулі Гародню. За валоданне гарадзенскім замкам змагаліся Ягайла і Вітаўт[7]. У 1392 і 1393 гадах замак спалілі крыжакі. Так яны адпомсцілі Вітаўту за разрыў ранейшых добрых адносін. У 1394 і 1402 г. рыцары яшчэ двойчы спрабавалі захапіць гарадзенскі замак[8].

Такім чынам, палітычныя прычыны (працэс дзяржаваўтварэння, частыя ваенныя канфлікты) непасрэдна абумовілі новы этап горадабудаўнічага развіцця Гародні. Фармальным пачаткам гэтага этапа была сярэдзіна-другая палова 13 ст., а яго верхняй мяжой, як лічыць Аляксандр Краўцэвіч, быў 1410 г., год Грунвальда[9]. Варта ўдакладніць гэтыя храналагічныя рамкі, "прывязаўшы" верхнюю мяжу да няўдалага крыжацкага нападу 1402 г.

Аргументам на карысць прапанаванай храналогіі з'яўляецца факт стылістычнай пераарыентацыі архітэктуры

---

[4] Scriptores Rerum Prussicarum (далей SRP). Leipzig, 1861. B. 1. S. 147, 162, 170, 172, 176, 214.

[5] **SRP**. B. 2. Leipzig, 1863. S. 526, 527, 576, 577; Chronicon sei Annales Wigandi Marburgensis. Poznań, 1842. S. 143, 245.

[6] Skarbiec diplomatów papieskich, cesarskich, królewskich, książęcych, uchwał narodowych, postanowień różnych władz i urzędów posługujących do krytycznego wyjaśnienia dziejów Litwy, Rusi Litewskiej i ościennych im krajów. T. 1. Wilno, 1860. S. 228-229.

[7] ПСРЛ. Т. 32. Москва, 1975. С. 67-68.

[8] Skarbiec diplomatów ... S. 292, 293, 298, 329; SRP. B. 2. S. 641, 646, 647, 650, 651, 661; Chronicon ... S. 327, 329, 339, 342, 343, 347.

[9] Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння 14-18 стст. (планіроўка, культурны слой). Мінск, 1991. С. 61-62.

беларускіх зямель на ўзоры і мастацка-будаўнічыя асаблівасці заходнееўрапейскага дойлідства, што адбывалася якраз у другой палове 13 ст.[10] Гарадзенская архітэктура - добры прыклад такой пераарыентацыі.

Новае архітэктурнае аблічча горада было вынікам спалучэння пануючых у тыя часы культурна-мастацкіх традыцый з выгадным геаграфічным становішчам горада.

Нестабільная палітычная сітуацыя стала галоўнай прычынай пэўнай затрымкі працэсаў гарадскога будаўніцтва. У другой палове 13-пачатку 15 ст. тэрыторыя горада не выходзіла за межы забудовы 12-першай паловы 13 ст., а, магчыма, нават зменшылася[11]. Застой у развіцці Гародні ў разглядаемы перыяд пацвярджаюць матэрыялы археалагічных раскопак на дзядзінцы[12]. Падобныя вынікі далі даследаванні і ў іншых гарадах Панямоння[13].

Планіроўка Гародні ў другой палове 13-пачатку 15 ст. застаецца невядомай. Першую спробу яе рэканструкцыі зрабіў Юзаф Ядкоўскі, які вызначыў верагодную тэрыторыю горада з сеткай вуліц і плошчаў[14]. Аднак гэтую спробу нельга лічыць удалай. У сярэднявечнай Гародні не складаліся гарадскія дакументы, якія б датычылі яе ўнутранага жыцця. Гэтая акалічнасць ускладніла працу Ядкоўскага. Ягоная рэканструкцыя, выкананая на падставе крыніц 16 ст., насіла вельмі гіпатэтычны характар. Акрамя таго ў храналагічныя межы гэтага перыяду даследчык уключыў фактычна тры этапы горадабудаўнічага развіцця Гародні, якія выразна адрозніваліся адзін ад другога: 1) пачатак-сярэдзіна 13 ст. (пачаўся ў 11-12 стст.) - этап дынамічнага развіцця, 2) другая палова 13 ст.-пачатак 15 ст. - стагнацыя гарадскога жыцця, 3) 15 ст. - час адраджэння Гародні і фарміравання новай планіровачнай структуры.

---

[10] Кушнярэвіч А.М. Культавае дойлідства Беларусі 13-16 стст. Мінск, 1993. С. 22-23, 129-130.

[11] Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі … С. 27, 61.

[12] Воронин Н.Н. Древнее Гродно. Москва, 1954. С. 165, 167.

[13] Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі … С. 27.

[14] Jodkowski J. Grodno i okolice w zaraniu dziejów Litwy i Rusi nad Niemnem. Grodno, 1928. S. 17.

Адрывачнасць і агульнасць дадзеных негатыўна паўплывала на рэканструкцыю планіроўкі сярэднявечнай Гародні Мікалая Вароніна [15].

Спецыяльнай увагі заслугоўвае план-рэканструкцыя горада канца 14-пачатку 15 ст., якую зрабіў Аляксандр Краўцэвіч. На ягоную думку, гарадскі ўрбаністычны комплекс складаўся з Верхняга замка, Ніжняга замка на тэрыторыі вакольнага горада, пасадаў на ізаляваным ад асноўнай часткі горада Каложскім узвышшы і пасадаў на Падоле, што мясціліся на тэрасе ўздоўж Нёмана. Абарончую ролю выконвалі натуральныя ўмовы рэльефу: узвышшы, водныя артэрыі (Нёман і Гараднічанка), якія агіналі Гародню з поўдня, захаду і поўначы, яр ля ўсходняй мяжы горада[16]. Рэкі і яр, магчыма, выконвалі ролю гарадскіх межаў.

Рэканструкцыя познясярэднявечнай вулічнай сеткі Гародні стала мажлівай дзякуючы картаграфічным матэрыялам 18 ст. Дэталёвая рэканструкцыя пляніровачнай сеткі 16 ст. была праведзена Аленай Квітніцкай, якая абапіралася на план Гародні 1780 г. і валочную памеру горада сярэдзіны 16 ст.[17] Аналіз планаў Гародні 1780 і 1795 гг.[18] паказаў істотную розніцу прасторавай кампазіцыі заходняй (падзамкавай) і ўсходняй часткі горада, што, зрэшты, не аднаразова падкрэслівалася даследчыкамі[19]. Планіроўка заходняй часткі горада 11-пачатку 15 ст. характарызавалася нерэгулярнай сеткай вуліц, якая сфарміравалася стыхійна. Некалькі паўкруглых кольцаў шчыльна забудаваных вуліц акружалі Стары (Верхні) замак. Галоўнымі фактарамі, якія абумовілі фарміраванне радыяльна-кальцавога "малюнка" кампазіцыі, былі фізіяграфія рэльефу, існуючыя ў тыя часы гарадскія

---

[15] Воронин Н.Н. Древнее Гродно … С. 17.

[16] Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі … С. 61, 62, 74, 75.

[17] Квитницкая Е. Планировка Гродно в 16-18 вв. // Архитектурное наследство. 1964. № 17. С. 17.

[18] Российский Государственный Военно-Исторический Архив в Москве, ф. 846, о. 16, д. 21872, 21873.

[19] Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі … С. 75,77; Квитницкая Е. Планировка Гродно … С. 15.

ўмацаванні, а таксама восі паўночнага, паўднёвага і ўсходняга гандлёвых шляхоў. Крыжацкія хронікі 14 і 15 ст. упамінаюць дарогі, якія злучалі Гародню з Салечнікамі, Крэвам, Наваградкам, Візнай, Наравам і Райградам[20]. Гэтыя дарогі ў межах горада станавіліся вуліцамі. Асноўнымі восямі горада былі вуліца *Замкавая,* якая з'яўлялася працягам усходняга тракту, і вуліцы, што ішлі ўздоўж Гараднічанкі ў паўночным віленскім напрамку. На месцы іх перакрыжавання, па ўсёй верагоднасці, была заснавана першапачатковая гандлёвая плошча горада - Рынак.

Месцазнаходжанне гэтага найважнейшага планіровачнага элемента горада дакладна не ўстаноўлена. Паводле Юзафа Ядкоўскага і Ванды Рэвеньскай[21] галоўная плошча знаходзілася паблізу Гараднічанкі і займала тэрыторыю Нямецкага рынка[22]. Аднак размяшчэнне галоўнай гандлёвай плошчы горада ў даволі аддаленым ад замка месцы выклікае пэўныя сумненні.

Лакалізацыю першапачатковага гарадскога Рынку трэба звязаць з найбліжэйшым да замка пунктам перакрыжавання паўночнага і ўсходняга трактаў. У аналагічным месцы, г.зн. блізка замка, знаходзіліся першыя гандлёвыя плошчы ў Вільні і Наваградку[23]. На месцазнаходжанне Рынку можа ўказаць і першы каталіцкі храм у Гародні - Фара Вітаўта, які заняў пляц у яго ўсходняй частцы. Зрэшты, агульна вядомым з'яўляецца факт цеснай сувязі паміж лакалізацыяй Рынка і парафіяльнага касцёла[24]. В.Рэвеньская, аналізуючы праблему самага старажытнага гродзенскага Рынку, адзначыла, што Фара ў Гародні сваёй апсідай звернута да сучаснага Рынку (плошча Савецкая), і

---

[20] SRP. B. 2. , S. 691, 692, 701, 703, 707.

[21] Jodkowski J. Śródmieście grodzieńskie dawne a jutrzejsze. Grodno, 1930, S. 1-2; Rewieńska W. Miasta i miasteczka w północno-wschodniej Polsce. Wilno, 1938. S. 59.

[22] Писцовая книга Гродненской экономии (далей ПКГЭ). Вильно, 1882. С. 44.

[23] Rewieńska W. Miasta **i miasteczka** ... S. 49, 52.

[24] Rewieńska W. Miasta i miasteczka ... S. 43; Hensel W. Archeologia o początkach miast słowiańskich. Wrocław, 1963. S. 118.

дадала: "*<...>калі б сучасны Рынак існаваў у часы Вітаўта, цяжка сабе ўявіць, каб будаваны тады фарны касцёл мог быць пастаўлены да яго тылам. Ён павінен быў стаяць фасадам да Рынку так, як праз некалькі стагоддзяў стала езуіцкая фара*"[25]. Пацвярджэннем гіпотэзы размяшчэння Рынку паблізу замка з'яўляецца факт знаходжання ў тым месцы Прачысценскай і, верагодна, Малой царквы. Вядома, што, напрыклад, у сярэднявечным Кіеве, Ноўгарадзе ці Чарнігаве цэрквы стаялі якраз каля Рынка[26]. Магчыма, што ў 15 ст., калі на ўсход ад замка і старога горада пачала фарміравацца новая ўжо неабмежаваная ўмацаваннямі сетка вуліц, старажытны Рынак на гэтым месцы знік. Працэс пераносу рынкаў у сувязі з пашырэннем гарадской тэрыторыі быў звычайнай з'явай у Заходняй Беларусі[27].

Крыніцы не дазваляюць вызначыць межы Гародні ў другой палове 13-пачатку 15 ст. Гэтую праблему можна вырашыць толькі з дапамогай супастаўлення вынікаў археалагічных даследаванняў і пазнейшых іканаграфічных матэрыялаў. Застаюцца адкрытымі і шматлікія іншыя пытанні: ці ўваходзіла ў гарадскія межы левабярэжжа Нёмана? Ці існавалі пасяленні па-за межамі шчыльна забудаванай падзамкавай часткі горада ўздоўж Гараднічанкі? Якую плошчу займаў Падол? Ці не было на яго тэрыторыі храма яшчэ ў старажытнарускі час?

Дамінуючым элементам часткі Гародні, якая цягнулася па-над р. Гараднічанкай, мог быць *Нямецкі рынак*. Рынак выконваў ролю другога гандлёвага асяродка Гародні. У адпаведнасці з мірным дагаворам 1379 г. паміж ВКЛ і Ордэнам мяжа праходзіла паблізу Гародні ў раёне вёскі Пералом. Дагавор пералічваў шэраг гарадоў *рускага краю, якія ляжаць часткова над Нёманам у бок прускі*[28]. У адрозненні ад іншых гарадоў Гародня названа *краінаю*

---

25 Rewieńska W. Miasta i miasteczka ... S. 59.

26 Куза А.В. Города в социально-экономической системе древнерусского феодального государства // Краткие сообщения Института Археологии АН СССР. Москва. 1983. Вып. 139. С. 5.

27 Rewieńska W. Miasta i miasteczka ... S. 60.

28 Skarbiec diplomatów... S. 228.

*Гародня,* а *гарадзенскі народ* ці *гарадзенцы* вылучаюцца сярод насельніцтва памежнай зоны[29]. Усё гэта мела ўплыў на заснаванне Рынку з назвай "Нямецкі" яшчэ ў перадмагдэбургскі перыяд гісторыі Гародні. На карысць гэтага меркавання сведчыць знойдзены тут ў час раскопак посуд мазавецкага тыпу 11-12 стст.[30]

На працягу ўсяго 15 ст. Нямецкі рынак заставаўся важным планіровачным элементам горада. Перад 1494 г. тут быў заснаваны кляштар і касцёл св. Тройцы[31]. Аднак у сярэдзіне 16 ст. Нямецкі рынак страціў ролю гандлёвага цэнтра. Валочная памера 1560-1561 гг. адзначыла, што на ім "<...> *ніякага гандлю не бывае* <...>"[32]. Прычынай стаў перанос акцэнту гарадскога жыцця пасля атрымання магдэбурскага права ў 1496 г. на тэрыторыю новага горада з новым вялікім Рынкам.

На фарміраванне архітэктурнага аблічча Гародні ў другой палове 13 і на працягу ўсяго 14 ст. значны ўплыў аказалі ваенныя падзеі. У гэты перыяд крыжакі неаднаразова нападалі на драўляны гарадзенскі замак. Падчас раскопак 80-х гадоў на Старым замку, якімі кіраваў Алег Трусаў, часта сустракалася гарэлае дрэва і попел[33]. У 1971 г. Яраслаў Звяруга і Міхась Ткачоў на паўднёвым схіле Замкавай гары знайшлі рэшткі дубова-сасновай канструкцыі абарончых сцен замка 14 ст.[34] У той час замак меў рубленыя сцены з бярвенняў. На верхняй іх частцы знаходзіліся баявыя пляцоўкі[35]. У канцы 13-пачатку 14 ст. мураваная абарончая

---

[29] Там жа.

[30] Акінчыц Р. Ганчарства старажытнай Гародні (11-першая палова 15 ст.) // Краязнаўчыя запіскі. Гродна,1997. Вып. 4. С. 56.

[31] Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej. Kraków, 1932. T. 1. **Z.** 1. **S**. 474.

[32] ПКГЭ. Т. 2б. С. 43-44.

[33] Трусаў А., Собаль В., Здановіч Н. Стары замак у Гродне **XI** - **XVIII** стст. Мінск, 1993. С. 41.

[34] Зверуго Я.Г., Ткачёв М.А. Археологические исследования в Гродно // Археологические открытия 1971 г. Москва, 1972. С. 407-408.

[35] Воронин Н.Н. Древнее Гродно… С. 153

сцяна 12 ст. была знішчана[36]. Аб нападах і знішчэннях замка ўзгадваюць таксама крыжацкія хронікі. Яны ж зафіксавалі рамонт замка ў 1393 г.[37]

У 1398 г. драўляны замак згарэў, і Вітаўт узвёў новы мураваны гатычны замак з каменя і цэглы. Дзеля гэтага з боку ракі была пашырана пляцоўка дзядзінца. Замак атрымаў форму няправільнага трохвугольніка. Сцены ў ніжняй частцы былі выкладзены з валуноў, у верхняй - з цэглы, якая з пачатку 14 ст. стала галоўным матэрыялам у замкавым будаўніцтве. Прасла сцяны з боку Нёмана мела 120 м даўжыні, з боку Гараднічанкі - 90 м. На сценах, прарэзаных радамі бойніц, знаходзіліся крытыя галерэі. Таўшчыня сцен, умацаваных контрафорсамі, складала 2,5 - 3 м. У паўночна-ўсходняй частцы замка быў пабудаваны двухпавярховы палац. Замак меў чатыры квадратныя вежы памерамі 12×12 м (з боку горада, на гараднічанскім мысе, з боку Нёмана, уязная вежа-брама з пад'ёмным мастом) і круглы данжон, злучаны з двухпавярховым княскім палацам. Невялікія фрагменты сцен і вежаў замка канца 14 ст. захаваліся да нашых дзён[38].

Умацаванне абарончага комплекса гарадзенскага замка было звязана са складанай палітычнай сітуацыяй і пераменамі ў ваеннай тактыцы. Пасіўная аблога, як асноўны сродак захопу замка, усё больш саступала месца штурму з выкарыстаннем каменекідальных машын[39]. Гэтыя перамены прывялі да будаўніцтва веж-данжонаў (ці *стаўпоў*). Яны выконвалі функцыю галоўнага пункта абароны і адначасова былі месцам апошняга выратавання насельніцтва замка і горада. Тут захоўваўся рыштунак і правіянт. Вежы-данжоны былі даўно вядомыя ў Заходняй Еўропе, на Каўказе і на арабскім Усходзе. У 13 ст. яны будаваліся на Валыні,

[36] Трусаў А., Собаль В., Здановіч Н. Стары замак у Гродне... С. 21.
[37] **SRP**. B. 2. **S**. 650.
[38] Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі. Мінск, 1978. С. 53; Трусаў А., Собаль В., Здановіч Н. Стары замак у Гродне... С. 24, 40, 55.
[39] Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні ... С. 16-17.

адкуль трапілі на беларускія землі[40]. Не выключана аднак, што гатычныя мастацка-будаўнічыя прыёмы маглі быць запазычаны непасрэдна з Прыбалтыкі, Польшчы ці нямецкіх зямель[41].

Аб данжоне ў Гародні ўпамінае Іпацьеўскі летапіс у 1277 г.: "*Столп бо бе камен высок стоя перед вороты города, и бяху в нем заперлися Прузи, и не бысть им мимо он пойти к городу, побивахут бо со столпа того; и тако приступиша к нему и взяша и, страх же велик и ужасть паде на город, и быша аки мертв стояще на заборалех города, о взятьи столпа, зане то бысть упование их*"[42]. Данжон, які выступаў па-за лінію замкавых умацаванняў і стаяў побач з уязной брамай, быў адной з нешматлікіх мураваных пабудоў гарадзенскага замкавага комплекса фактычна да канца 14 ст. Пазней ён быў уключаны ў склад гатычнага замка Вітаўта. У час перабудовы замка ў 80-я гады 16 ст. вежу разабралі. На жаль, археалагічныя даследаванні не выявілі рэшткаў данжона. Культурны слой 13-16 стст. каля ўсходняга фасада Старога замка быў знішчаны падчас земляных работ, якія праводзіліся ў міжваеннае дваццацігоддзе[43].

Дакладны час узвядзення гарадзенскага данжона, як і імёны ініцыятараў будаўніцтва невядомыя. Па меркаванні Паўла Рапапорта данжон быў пабудаваны ў 1259 ці 1276 г., калі гарадзенскі замак часова захапілі валынскія князі[44]. Аднак гэтая думка выклікае сумненні. Летапісы адзначаюць толькі намеры, а не факт правядзення пахода на Гародню князям Даніілам у 1260 г. Што тычыцца пахода 1274 г. (не 1276 г.), то татары разам з галіцка-валынскімі князямі Львом, Уладзімірам і Мсціславам сапраўды " <...> *пойде <...> на Тройденя князя Литовского, и много зла в его*

---

[40] Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні ... С. 17-19, 23-26.
[41] Кушнярэвіч А.М. Культавае дойлідства ... С. 6
[42] ПСРЛ. Т. 2. С. 207.
[43] Трусаў А., Собаль В., Здановіч Н. Стары замак у Гродне... С. 21.
[44] Раппопорт П.А. Волынские башни // Материалы и исследования по археологии СССР. Москва, 1952. № 31. С. 211.

---

*сотвориша, потом же под градом Городном, за свое лукавствие и несогласие, зле поражены быша* <...>"[45]. Узвядзенне гарадзенскага данжона цяжка звязаць з мэтанакіраванай дзейнасцю галіцка-валынскіх князёў.

KAMUNIKAT.org

Фрагмент гравюры Адэльхаўзэра-Цюндта 1568 г.

Выяву гарадзенскага "стаўпа", які быў дамінантай замкавага комплексу, захаваў медзярыт Адэльхаўзэра-Цюндта 1568 г.[46] Данжон уяўляў сабой мураванае круглае шмат'яруснае (мабыць 4-х'яруснае[47]) збудаванне. На гравюры выразна відаць тры верхнія паверхі, сцены якіх праразалі вокны-байніцы. Уваход у данжон знаходзіўся на прылягаючым да яго другім паверсе замка. Канструкцыю збудавання ў ніжняй надземнай частцы ўмацоўвалі контрафорсы, а завяршала вежу баявая галерэя з масіўным

---

[45] ПСРЛ. Т. 2. С. 197, 345.

[46] Schiemanns T. **Ruβland**, Polen und Livland bis ins 17.Jahrhundert. Berlin, 1886. B. 1. **S**. 636.

[47] Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні ... С. 24.

зубчатым атыкам і шатровым дахам. Згодна меркавання Міхася Ткачова вышыня данжона была каля 20 м, дыяметр збудавання - 12 м, а таўшчыня муроў - 3 м[48]. Як відаць, гарадзенскі "стоўп" узводзіўся з улікам канструкцыйна-тэхнічных традыцый раманскай і гатычнай эпох (масіўнасць канструкцыі, спічастыя вокны, атык).

KAMUNIKAT.org

Планіроўка Гародні ў другой палове 13-пачатку 15 ст.

1. Верхні (Стары) Замак; 2. Верхняя царква; 3. Ніжні Замак; 4. Васкра-сенская царква; 5. Барысаглебская царква; 6. Прачысценская царква; 7. Малая царква; 8. Фарны касцёл; 9. Першапачатковы Рынак; 10. Ня-мецкі Рынак; 11. Магчымыя ўмацаванні і гарадскія межы; 12. Тракт ва ўсходнім накірунку; 13. Тракт у паўночным накірунку.

[48] Там жа.

Суседняе з Замкавай гарой узвышша было заселена ў 11 ст. Тут знаходзіўся рамесна-гандлёвы пасад. З поўдня яго бараніў высокі бераг Нёмана, з усходу - яр (пазней штучна паглыблены), з паўночнага боку - абарончы роў, які аддзяляў пасад ад дзядзінца. Міхась Ткачоў выказаў здагадку, што пасад быў умацаваны ў першай палове 12 ст., г. зн. ён стаў *вакольным горадам*[49]. У гэтым жа стагоддзі тут быў узведзены мураваны храм. Як мяркуецца, гэта была *Васкрасенская царква*. Яна функцыянавала да пажару 1613 г., пасля якога была перанесена на тэрыторыю пасада. У канцы 14 ст. на вакольным горадзе знаходзіўся *Ніжні замак*.

Акрамя двух гарадзенскіх замкаў на пачатку 90-х гадоў 14 ст. пад Гародняй быў пабудаваны яшчэ адзін замак. Яго ўзвялі крыжакі з дазволу Вітаўта. Фактычна гэта была плата за крыжацкую ваенную дапамогу. Драўляны замак *Нойгартэн (Neugarten)* паўстаў на левым беразе Нёмана насупраць Ніжняга замка. Хутчэй за ўсё, яго збудавалі на тым самым месцы, дзе спрабаваў паставіць драўляны замак Вітаўт у 1390 г. падчас вайны з Ягайлам. У тым самым годзе Ягайла з трох бакоў аблажыў Стары (у летапісу: *Вышшы*) гарадзенскі замак. Каб дапамагчы замкаваму гарнізону, узмоцненаму крыжакамі, Вітаўт "*<...>над Немном против замку обозом положился, новый замок на копцу будовати казал <...>*". Але калі "*<...>Ніжні замок кролевские жолнере <...> взяли были <...> Витолт переставши нового замку будовати <...>*"[50].

Пасля прымірэння Вітаўта і Ягайлы замак ордэнскіх рыцараў у 1392 г. быў разбураны[51]. Акрамя Нойгартэна ў ваколіцах горада знаходзіліся яшчэ два - Рытэрсвэрдэр і Мітэнбург.

Адным з цікавейшых культавых помнікаў Гародні разглядаемага перыяду была т. зв. *Верхняя царква*. Для яе архітэктуры, як зрэшты і для архітэктуры іншых тагачасных культавых помнікаў рэгіёна, было характарна спалучэнне

---

[49] Ткачоў М.А. Археалагічныя помнікі г. Гродна // Археалагічныя помнікі Гродзеншчыны. Гродна, 1992. С. 14.

[50] ПСРЛ. Т. 32. С. 67.

[51] Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923. S. 54.

прыёмаў усходнееўрапейскага і заходнееўрапейскага дойлідства. Да апошняга часу даследчыкі разыходзіліся ў пытанні датавання помніка[52]. Аднак у выніку апошніх археалагічных і архітэктурных пошукаў на падставе аналізу тэхнікі муроўкі, складу рошчыны, фарматаў цэглы і асаблівасцяў планіроўкі храма акрэслены час яго ўзвядзення. Алег Трусаў вызначыў, што царква была пабудавана на мяжы 13 і 14 стст. Галоўным аргументам у ягоных разважаннях сталі вынікі супастаўляльнага аналізу параметраў цэглы, з якой быў пабудаваны храм на гарадзенскім дзядзінцы з аналагамі цэглы замкаў у Крэве і Лідзе, мураваных збудаваняў у Вільні і Наваградку[53]. Аляксандр Кушнярэвіч удакладніў гэтыя храналагачныя рамкі. На яго думку, царква была ўзведзена ў канцы 13-першай палове 14 ст[54]. З гэтым удакладненнем можна пагадзіцца.

Не выключана, што непасрэднае дачыненне да пабудовы Верхняй замкавай царквы меў славуты гарадзенскі кашталян Давыд. Па-першае, час яго кіравання супаў з часам узвядзення храма. У 1314 г. Давыд упершыню ўпамінаецца ў хроніцы Пятра Дзюсбурга як castellanus de Gartha. У 1326 г. гарадзенскі кашталян быў забіты[55]. Варта адзначыць, што кашталян фактычна з'яўляўся вялікакняскім намеснікам цэлай воласці, у якую ўваходзіў гарадзенскі замак і сам горад. Усе адміністрацыйныя, судовыя і ваенныя справы знаходзіліся пад ягоным кантролем. Па-другое, дзякуючы кашталяну Давыду, ваенныя здольнасці якога былі добра вядомыя крыжакам яшчэ з часоў ягонага намесніцтва ў Пскове[56], унутранае жыццё гарадзенскага замка стабілізавалася. Гарадзенцы хутчэй за ўсё выкарысталі

---

[52] Падрабязную гістарыяграфію пытання гл.: Кушнярэвіч А.М. Культавае дойлідства ... С. 24-27; Трусаў А., Собаль В., Здановіч Н. Стары замак у Гродне... С.22.

[53] Трусаў А., Собаль В., Здановіч Н. Стары замак у Гродне... С.23.

[54] Кушнярэвіч А.М. Культавае дойлідства ... С. 26.

[55] SRP. B. 1. S. 180-181, 610.

[56] Пашуто В.Т. Гродно в хронике Петра Дюсбурга // Культура Древней Руси. Москва, 1966. С. 192.

магчымасць пабудовы праваслаўнага храма на дзядзінцы, якая з'явілася ў гэты час.

Верхняя царква была аднанефным, амаль квадратным (8,8×8,9 м) будынкам з паўкруглай апсідай. У архітэктуры храма спалучаліся мастацка-будаўнічыя рысы гарадзенскай архітэктурнай школы 12 ст. (абрэзаныя вуглы храма, шліфаваныя камяні ў сценах, рошчыны з напаўняльнікам з таўчонай цэглы) і гатычныя элементы (крыжовыя скляпенні ўнутранай прасторы, гатычны дах). Будынак не быў атынкаваны. Знаходкі дахоўкі, якая выкарыстоўвалася на Беларусі ў канцы 15-16 стст., сведчаць аб функцыянаванні храма яшчэ ў першай палове 16 ст. Царкву разабралі ў канцы 16 ст. падчас перабудовы замка Стэфанам Баторыям[57].

Важнай культавай пабудовай Гародні 14 ст. быў фарны каталіцкі касцёл. Першыя дзесяць каталіцкіх касцёлаў у ВКЛ былі заснаваны Ягайлам у 1387 г. Большасць з іх знаходзілася каля Вільні. Вітаўт прадоўжыў гэтую справу. На працягу 38 год (1392-1430) ён заснаваў 11 новых парафій. Яшчэ некалькі касцёлаў у віленскай дыэцэзіі было заснавана баярамі. Усяго ў перыяд з 1387 па 1430 г. узнікла 27 каталіцкіх храмаў[58]. Фундатарам гарадзенскага фарнага касцёла ў імя Прасвятой Маці Божай стаў сам вялікі князь Вітаўт. Драўляны храм, які быў узведзены на старажытным гарадзенскім Рынку пасля 1392 г., традыцыйна называюць Фарай Вітаўта[59]. Яго месцазнаходжанне сведчыць аб тым, што касцёл акрамя сваёй асноўнай духоўнай функцыі павінен быў адыгрываць ролю галоўнага асяродка грамадскага жыцця Гародні. Каля Фары знаходзіліся першыя каталіцкія могілкі горада. Апсідай касцёл быў звернуты да гарадскіх умацаванняў.

---

[57] Трусаў А., Собаль В., Здановіч Н. Стары замак у Гродне... С. 22-24; Кушнярэвіч А.М. Культавае дойлідства ... С. 24-27.

[58] Ochmański J. Biskupstwo wileńskie w średniowieczu. Ustrój i uposażenie. Poznań, 1972. S. 55 - 63.

[59] Paszenda J. Kościół pojezuicki (farny) w Grodnie // Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litewskiego w epoce baroku. Warszawa, 1995. S. 191; Краўцэвіч А., Трусаў А., Трусаў І. Вяртанне да людзей // Мастацтва. 1993. № 8. С. 45.

Меркаванне аб існаванні гарадскіх умацаванняў Гародні 13-14 стст. выказаў яшчэ Юзаф Ядкоўскі. Ён змясціў іх на тэрыторыі кляштара бернардынаў[60]. Аб лініі ўмацаванняў пісаў таксама Яраслаў Звяруга, звярнуўшы ўвагу на Ніжні замак (вакольны горад)[61]. Месца знаходжання лініі гарадскіх умацаванняў 14 ст. спрабаваў вызначыць і Аляксандр Краўцэвіч. Пры гэтым ён абапіраўся на рэканструкцыю планіроўкі Гародні 16 ст., зробленую Аленай Квітніцкай. Згодна меркаванню А.Краўцэвіча ўмацаванні праходзілі плаўнай дугой ад Гараднічанкі, дзесьці ў раёне сучаснай вуліцы Кастрычніцкай, уздоўж пралёту вуліцы Маставой да яра, які даходзіў да берага Нёмана[62].

Крыніцы і сапраўды ўказваюць на існаванне гарадскіх умацаванняў. Як відаць з ліста мазавецкіх князёў Сэмавіта (Земавіта) і Трайдэна, а таксама плоцкага біскупа Фларыяна да папы рымскага Яна **XXII** (1325 г.) Гародня было *нядаўна* ***(nuper)*** *напраўлена і ўмацавана*[63]. Азначэнне Гародні як ***oppidum*** (даслоўна ***opem dare,*** ці акружаны мурам) пацвярджае здагадку. Час правядзення работ па ўмацаванні гарадскіх межаў можна адназначна звязаць з дзейнасцю кашталяна Давыда.

На пачатку 15 ст., калі мінула небяспека ваеннай пагрозы, межы Гародні пачалі разрастацца ў паўночным і ўсходнім кірунку. Сфарміравалася новая сетка вуліц, ужо неабмежаваных ніякімі ўмацаваннямі.

Аўтар паспрабаваў засяродзіць увагу на даволі складанай праблеме горадабудаўнічай эвалюцыі сярэднявечнай Гародні. На вялікі жаль, адсутнасць паўнавартасных пісьмовых і графічных крыніц не дазваляе дакладна рэканструяваць архітэктурна-планіровачнае развіццё горада другой паловы 13-пачатку 15 стст., у якім

---

[60] Jodkowski J. Grodno i okolice … **S**. 8.

[61] Зверуго Я.Г. Верхнее Понеманье в 9-12 вв. Минск, 1989. С. 65.

[62] Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі … С. 77.

[63] Nowy kodeks dyplomatyczny Mazowsza. Wrocław, 1989. Cz. 2. **S**. 178.

спалучаліся заходнееўрапейскія (рамана-гатычныя) і ўсходнееўрапейскія традыцыі. Па гэтай прычыне некаторыя палажэнні артыкула маюць гіпатэтычны характар. Канчатковы адказ на шматлікія пытанні могуць даць толькі мэтанакіраваныя архітэктурна - археалагічныя даследаванні.

KAMUNIKAT.org

***Алесь Смалянчук*** *(Гародня)*

# КРАЁВЕЦ АНТОН ЛУЦКЕВІЧ

Пра Антона Луцкевіча ў апошняе дзесяцігоддзе напісана шмат. Але знаёмства з новымі для айчыннай гістарыяграфіі крыніцамі па гісторыі беларускага Адраджэння пачатку 20 ст. дае дадатковыя падставы для сцвярджэння, што асоба славутага беларуса яшчэ не атрымала належнай ацэнкі гісторыкаў.

Гэты артыкул прысвячаецца выдавецкай дзейнасці Антона Іванавіча Луцкевіча ў 1912-1915 гг. і ягоным адносінам да так званай "краёвай ідэалогіі".

Адной з асноўных крыніц даследавання з'яўляецца дзённік Міхала Ромера, а дакладней, першыя шэсць тамоў гэтага дзённіка, якія ахопліваюць перыяд з 1911 па 1915 г.* Міхал Ромер (1880-1945) - вядомы юрыст, публіцыст, навуковец, грамадскі і палітычны дзеяч як "гістарычнай" так і "этнаграфічнай" Літвы. На пачатку 20 ст. ён з'яўляўся адным з галоўных ідэолагаў дэмакратычнай плыні Краёвага руху.

На сутнасці краёвай ідэалогіі трэба спыніцца. Яна мае непасрэдныя адносіны да поглядаў Антона Луцкевіча ў разглядаемы перыяд і дазваляе зразумець грамадска-палітычную пазіцыю аўтара дзённіка. Зыходзячы з яе, М.Ромер даваў ацэнкі падзеям і людзям, у т.л. і А.Луцкевічу.

Краёвая ідэалогія грунтавалася на ідэі палітычнай нацыі. Большасць краёўцаў лічыла, што ўсе карэнныя жыхары гістарычнай Літвы з'яўляюцца, у першую чаргу, грамадзянамі Краю і тым самым належаць да адзінай нацыі. Этнічнасць, як і сацыяльнае паходжанне адыгрывалі другарадную ролю. Якраз такой была пазіцыя М.Ромера. Але сярод краёўцаў сустракалася і іншае разуменне краёвасці. Так, большасць сяброў віленскага польскага дэмакратычнага кола 1911-1915 гг., якое гуртавалася

---

* Яны захоўваюцца ў аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі Навук Летувы ў фондзе Міхала Ромера (F - 138).

вакол штотыднёвіка "Пшэглёнд Віленьскі", разумела краёвасць толькі як супрацоўніцтва розных этнасаў краю. У гэтым выпадку этнічнае паходжанне і, адпаведна, патрабаванні развіцця культуры ўласнага этнаса другараднымі не з'яўляліся. Але і М.Ромера, і прыхільнікаў "Пшэглёнда" аб'ядноўвала перакананне, што толькі пры дэмакратычным ладзе з'явяцца належныя ўмовы для культурнага і палітычнага развіцця ўсіх этнасаў краю.

Асноўныя прынцыпы краёвасці былі распрацаваны ў мясцовым польскім асяродку. У пэўным сэнсе краёўцы выйшлі з грамадскасці, якую ў адпаведнасці з яе культурнай арыентацыяй можна называць польскай. Для часткі палякаў беларуска-летувіскага паходжання краёвасць была не проста сродкам абароны польскіх пазіцый, а праявай натуральнага імкнення абараняць інтарэсы сваёй Радзімы – гістарычнай Літвы. Яны сапраўды адчувалі сябе "грамадзянамі Краю" і з гатоўнасцю ішлі на кантакты з прадстаўнікамі ўсіх этнічных рухаў. А Вільня стварала выдатныя магчымасці для такіх кантактаў. Краёвасць станавілася іх ідэалагічным падмуркам. Дзеячы дэмакратычных плыняў польскага, беларускага, летувіскага і яўрэйскага рухаў пагаджаліся з яе асноўнымі прынцыпамі. Хаця зачастую трактавалі іх на карысць уласных этнасаў.

Другой асноўнай крыніцай даследавання з'яўляюцца публікацыі двух віленскіх выданняў краёвага і дэмакратычнага накірунку - "Вечерней газеты" і "Кур'ера краёвага". Справа ў тым, што вывучэнне запісаў дзённіка М.Ромера ў спалучэнні з іншымі матэрыяламі дае ўсе падставы сцвярджаць, што Антон Луцкевіч з'яўляўся фактычным кіраўніком, рэдактарам і адным з галоўных аўтараў "Вечерней газеты"*. Адначасова менавіта ён вызначаў краёвы і дэмакратычны накірунак "Кур'ера краёвага"** , у выданні якога прымаў самы актыўны ўдзел.

---

* "Вечерняя газета" - штодзённая газета на рускай мове. Выходзіла з 18.09 (1.10).1912 да 11(24).06.1915 г. Назва №№ 1,2 - "Вечерняя газета-копейка". Афіцыйны рэдактар-выдаўца - Ф.М.Хатэнка, пазней - Н.В.Сперанская.

** "Кур'ер краёвы" - штодзённая газета на польскай мове. Выходзіла

Імя Антона Луцкевіча ўпершыню згадваецца ў дзённіку ў запісу ад 10 (23).05.1911 г.[1] Міхал Ромер апісаў польска-беларускі сход, на якім было прынята рашэнне пра арганізацыю сумеснага краёвага выдання ў форме т.з. "аднадзёнкі" ("jednodniówki"), г.зн. аднаразовага выдання. З беларускага боку ў сходзе ўдзельнічалі браты Луцкевічы. Пазней ідэя сумеснага выдання набыла форму штотыднёвіка, да ўдзелу ў якім планавалася прыцягнуць і летувісаў.

Варта адзначыць, што супрацоўніцтва польскіх, беларускіх, летувіскіх (і яўрэйскіх ?) дэмакратаў пачалося яшчэ ў часы рэвалюцыі 1905-1907 гг. Можна згадаць пра публікацыю артыкула Антона Луцкевіча "Аграрная праграма" ("Program agrarny") ў № 46 ад 13(26).04. 1906 г. "Газеты Віленьскай"[*]. Артыкул быў надрукаваны пад псеўданімам "Ян Мялешка" і знаёміў чытачоў польскага дэмакратычнага выдання з аграрнай праграмай БСГ. З таго часу супрацоўніцтва фактычна не перапынялася.

Арганізацыю штотыднёвіка ўзяла ў свае рукі польская віленская суполка краёўцаў-дэмакратаў, у якую ўваходзілі Вітольд Абрамовіч, Міхал Ромер, Аляксандр Заштаўт, Браніслаў Крыжаноўскі, Зыгмунт Нагродскі і інш. М.Ромер бачыў кіраўніком сумеснага выдання Яна Яленьскага[**], які ў

---

з 30.11(12.12).1912 да 18.04(1.05).1914 г. Афіцыйны рэдактар-выдаўца - Юліўш Сумарок, пазней - Алена Юрэвічава, Стэфан Піатровіч.

[1] Дзённік М.Ромера. Т. 1. **S. 130.**

[*] "Газета Віленьска" - штодзённая польская газета дэмакратычнага і краёвага накірунку. Выходзіла з 15(28).02 да 25.07(8.08).1906 г. Рэдактар-выдаўца - М.Ромер, рэдактар - З.Пяткевіч.

[**] Сапраўднае імя - Вітаўт Чыж. Крытык і публіцыст. У 1910-1911 гг. працаваў у рэдакцыі "Нашай Нівы" (Дзённік М.Ромера. Т. 2. S. 3. Запіс ад 19.08(1.09).1911 г.). Аўтар рэцэнзій, апавяданняў, артыкулаў па пытаннях беларускага музычнага жыцця, беларускай этнаграфіі. З 1911 г. друкаваўся ў польскіх выданнях. У 20-я гады чыноўнік віленскай польскай адміністрацыі. У 1928 г. - віцэ-прэзідэнт Вільні.

гэты час актыўна працаваў у рэдакцыі "Нашай Нівы". Але Ромера падтрымаў толькі Аляксандр Заштаўт. Большасць суполкі выказалася за кандыдатуру Людвіка Абрамовіча. Пры гэтым беларусы і летувісы былі фактычна адхілены ад арганізацыі выдання. 12(25).11.1911 г. выйшаў першы нумар "Пшэглёнда Віленьскага"***.

Асоба Л.Абрамовіча не выклікала даверу ў дзеячаў беларускага і летувіскага рухаў. У 1906 г. Л.Абрамовіч супрацоўнічаў з "Газетай Віленьскай" (псеўданім "Licz"), але пазней перайшоў у рэдакцыю яе ідэйнага праціўніка консерватыўнага "Кур'ера Літэўскага" (псеўданім "Alf"). У ягоных артыкулах краёвасць выглядала як форма абароны польскіх інтарэсаў.

Прызначэнне Л.Абрамовіча канчаткова перакрэсліла праект стварэння міжэтнічнага дэмакратычнага краёвага выдання. Л.Абрамовіч зрабіў "Пшэглёнд Віленьскі" дэмакратычным і краёвым органам польскай грамадскасці. (А.Луцкевіч пазней характарызаваў гэтую газету як орган польскіх нацыянал-ліберлаў.) Такім чынам, ідэя міжэтнічнага краёвага выдання не была рэалізавана і па-ранейшаму хвалявала дэмакратычную грамадскасць Вільні. Між тым, задачы барацьбы з этнічным шавінізмам, прапаганды краёвай ідэалогіі, распаўсюджвання інфармацыі пра сапраўдныя імкненні дэмакратычных плыняў беларускага, летувіскага і польскага рухаў станавіліся ўсё больш актуальнымі.

На пачатку лістапада 1911 г. на сустрэчы з удзелам Івана Краскоўскага, Антона Луцкевіча, Браніслава Крыжаноўскага, Зыгмунта Нагродскага і Міхала Ромера была выказана думка пра выданне ў Вільні рускамоўнага дэмакратычнага штотыднёвіка[2]. Мэтай выдання павінна была стаць прапаганда краёвай ідэалогіі ў яе ліберальна-дэмакратычным варыянце сярод рускай грамадскасці Вільні. Аднак непасрэдных вынікаў гэтая размова не мела. Толькі

*** "Пшэглёнд Віленьскі" - польскі штотыднёвік. Выходзіў з 15(28).02.1911 да 29.08(11.09).1915 г. Кіраўнік газеты Людвіг Абрамовіч. Рэдактар-выдаўца - Вітольд Абрамовіч, пазней - Е.Баеўскі, З.Астахевічава, С.Студніцка.

[2] Дзённік М.Ромера. Т. 2. S. 82. Запіс ад 6(19).11.1911 г.

ўвосень 1912 г. напярэдадні выбараў у Дзяржаўную думу ідэя пачала набываць канкрэтныя формы. На гэты раз ініцыятыву ўзяў у свае рукі Антон Луцкевіч.

18.09(1.10).1912 г. выйшаў першы нумар "Вечерней газеты". Падпісаў яго да друку ў якасці рэдактара Ф.М.Хатэнка. Але сапраўдным кіраўніком газеты (і аўтарам большасці "передавых" артыкулаў) быў А.Луцкевіч. Пра гэта сведчаць не толькі шматлікія запісы ў дзённіку М.Ромера. Сапраўднага кіраўніка газеты заўважылі і агенты Дэпартамента паліцыі[3].

"Вечерняя газета" адразу прыцягнула ўвагу віленскай грамадскасці. Гэтаму спрыяў высокі ўзровень публіцыстыкі ліберальна-дэмакратычнага накірунку. Дарэчы, гэты накірунак прымушае задумацца пра магчымыя сувязі выдаўцоў газеты з Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыяй. На магчымасць такіх сувязяў указваюць і некаторыя іншыя ўскосныя дадзеныя.

На жаль, амаль усе публікацыі ў "Вечерней газете"(у т.л. і перадавыя артыкулы, якія рэгулярна пісаў А.Луцкевіч) друкаваліся без подпісаў. "Вечерняя газета" была досыць таямнічам выданнем. Толькі праз два месяцы пасля выхаду першага нумара пад некаторымі матэрыяламі пачалі з'яўляцца псеўданімы. Сярод іх можна заўважыць псеўданімы і крыптонімы, якія належалі А.Луцкевічу - "А.Иванов" і "А.Н."[4]. Да ліку крыптонімаў беларускага дзеяча можна аднесці і крыптонім "Г.Б." Магчыма, ён звязаны з псеўданімам "Генрык Букавецкі", пра які яшчэ будзе гаворка. Але хто "хаваўся" пад іншымі псеўданімамі і крыптонімамі ("Бо-вичъ"[*] , "Б-ов", "С.У.", "Кий" і інш.) дакладна пакуль не ўстаноўлена.

Прапаганда ліберальна-дэмакратычнай ідэалогіі, якую разгарнула "Вечерняя газета", адыграла сваю ролю падчас

---

[3] Государственный архив Российской Федерации, ф. 102, особый отдел, 1913, о.243, д.157, с.1.

[4] Сідарэвіч А. Антон Іванавіч Луцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі (далей ЭГБ). Т. 4. Мінск, 1997. С. 402-403.

[*] У.Конан лічыць, што гэты псеўданім мог належаць М.Бабровічу ("Лявону Гмыраку"). Гл. ЭГБ. Т. 2. Мінск, 1994. С. 9.

выбрання ўдзельнікаў віленскага губернскага выбарчага сходу па "рускай курыі". Газета сапраўды паспрыяла распаўсюджванню сярод рускай грамадскасці Вільні ідэй ліберальных дэмакратаў. Гэта паўплывала і на вынікі выбараў. Адначасова высветлілася, што газета знайшла свайго чытача. І Антон Луцкевіч вырашыў працягваць выданне. Магчыма, ужо ў гэты час у яго ўзнік план цэнтралізацыі віленскага дэмакратычнага друку, пра які пазней спамянуў у сваім дзённіку М.Ромер[5].

Істотнай часткай гэтага плана было выданне штодзённай польскамоўнай газеты. Гэты праект А.Луцкевіч збіраўся рэалізаваць у цесным кантакце з польскімі дэмакратамі.

У сярэдзіне кастрычніка 1912 г. "група" А.Луцкевіча (Іван Луцкевіч і Язэп Манькоўскі[**] ) звярнулася да польскай віленскай дэмакратычнай суполкі з прапановай арганізацыі сумеснага выдання. Тым больш, што і палякі шукалі сродкі для выдання штодзённай дэмакратычнай газеты. На пачатку перагавораў беларусы прапанавалі двайное рэдактарства, і нават пагаджаліся на тое, што беларускі рэдактар будзе мець толькі права дарадчага голасу. А.Луцкевіч, магчыма, палічыў для сябе больш важнай працу ў "Вечерней газете". Усё ж такі дэмакратычныя элементы сярод польскай грамадскасці ў параўнанні з рускай былі значна мацнейшымі. Кампанію Л.Абрамовічу павінен быў скласці Я.Манькоўскі. Апроч гэтага прапанавалася існаванне двух рэдакцыйных рад або адной супольнай. Аднак палякі вырашылі весці перагаворы толькі з мэтай

[5] Дзённік М.Ромера. Т. 2. S. 450. Запіс ад 8(21).11.1912 г.

[**] Публіцыст і перакладчык. З 1909 г. супрацоўнічаў з "Нашай Нівай". Друкаваўся пад крыптонімамі (Я.О., Я.М-скі, Я.М., і-м-і) або псеўданімамі (Кірмашова П-ч, Окліч Янка). З 1912 г. - у "Кур'еры краёвым". Адзін з заснавальнікаў кнігавыдавецкага таварыства "Наша хата". З канца 1917 г. жыў у Варшаве. М.Ромер характарызаваў яго ў сваім дзённіку як паляка, які актыўна працаваў у беларускім руху і часам "дзейнічаў як беларускі нацыяналіст" (Дзённік М.Ромера. Т. 2. S. 178. Запіс ад 10(23).02.1912 г.).

выкарыстання сабраных беларусамі сродкаў[6]. М.Ромер як прыхільнік рэальнага супрацоўніцтва параіў А.Луцкевічу самастойна распачаць выданне польскамоўнай газеты[7]. Ён разлічваў, што пасля выхаду першых нумароў палякі далучацца да беларускай ініцыятывы. А.Луцкевіч так і зрабіў. Беларусы выкарысталі ліцэнзію на выданне "Кур'ера краёвага", выдадзеную ўладамі аднадумцу М.Ромера Юліўшу Сумароку.

8(21).12.1912 г. выйшаў першы нумар "Кур'ера краёвага". Яго рыхтаваў Язэп Манькоўскі, але праграмны артыкул напісаў Антон Луцкевіч[8].

Выйсце першага нумара сапраўды актывізавала польска-беларускія перагаворы, але паразуменне так і не было дасягнута. Галоўнай прычынай было імкненне большасці польскай групоўкі атрымаць газету ў выключна ўласнае распараджэнне[9]. (Так, па меншай меры, бачыліся перагаворы М.Ромеру.) Беларусы з гэтым пагадзіцца не маглі.

М.Ромер досыць высока ацэньваў узровень публіцыстыкі першых нумароў "Кур'ера краёвага". Ён спадзяваўся на з'яўленне такога органа дэмакратычнага краёвага друку, пазіцыя якога будзе адпавядаць ягонаму разуменню краёвасці.

Галоўнай прычынай поспеху новай "польскай" газеты М.Ромер лічыў ідэйнае кіраўніцтва Манькоўскім з боку Антона Луцкевіча і непасрэдны ўдзел беларускага дзеяча ў падрыхтоўцы гэтых нумароў да выдання.

У сваіх ацэнках "Кур'ера" М.Ромер неаднаразова звяртаў увагу на ролю А.Луцкевіча: "Адным з галоўных, хоць звонку непрыкметных супрацоўнікаў газеты з'яўляецца Антон Луцкевіч, адзін са стаўпоў "Нашай Нівы". Гэта, магчыма, самы дзелавіты работнік і самая здольная галава беларускага народнага руху. Адначасова ён рэдагуе

---

[6] Дзённік М.Ромера. Т. 2. S. 435. Запіс ад 24.10(6.11).1912 г.
[7] Там жа. S. 445. Запіс ад 3(16).11.1912 г.
[8] Там жа. S. 450. Запіс ад 8(21).11.1912 г.
[9] Там жа. S. 464. Запіс ад 22.11.(5.12).1912 г.

"Вечернюю газету". Антон Луцкевіч трымаецца трохі ў ценю, не становіцца на чале "Кур'ера краёвага", але фактычна выконвае "партыю першай скрыпкі". Ён аказвае рашаючы ўплыў на кірунак і арганізацыю газеты"[10*] .

На пачатку сакавіка 1913 г. М.Ромер прыняў запрашэнне ўвайсці ў склад рэдакцыі "Кур'ера". Разам з ім увайшоў і А.Заштаўт. Яны павінны былі ўзмацніць творчыя магчымасці рэдакцыі і кампенсаваць занятасць А.Луцкевіча. Апошні не быў у стане рэгулярна дапамагаць Я.Манькоўскаму. Да таго ж, можна меркаваць, што беларускі дзеяч быў зацікаўлены ў тым, каб "Кур'ер краёвы", захоўваючы вызначаны накірунак, станавіўся ўсё больш польскім па складу сваёй рэдакцыі. Фактычнае кіраўніцтва "Кур'ерам" з боку А.Луцкевіча ў першыя месяцы існавання гэтай газеты не было таямніцай для дзеячаў дэмакратычнай плыні польскага руху. "Пшэглёнд Віленьскі" ў палеміцы з "Кур'ерам" неаднаразова выказваў сумненні ў сапраўднай польскасці газеты і дазваляў сабе празрыстыя намёкі на "пабочныя ўплывы" ў яе рэдакцыі. Усё гэта магло прывесці да дыскрэдытацыі газеты сярод польскай грамадскасці.

М.Ромер актыўна ўключыўся ў працу. Аўтарытэт гэтага вядомага грамадскага і палітычнага дзеяча значна павысіў цікавасць да газеты з боку польскай грамадскасці. Ягоныя артыкулы звычайна выходзілі пад лёгка пазнаваемымі крыптонімамі: "m.r.", "m." Іншым разам ён падпісваўся сапраўдным прозвішчам. А вось А.Луцкевіч па-ранейшаму захоўваў у таямніцы свой удзел у выданні. Імя беларускага дзеяча або тыя крыптонімы ці псеўданімы, пад якімі ён выступаў раней на старонках іншых органаў друку, у "Кур'еры" не сустракаліся ніколі. Аднак спалучэнне дзённікавых запісаў з публікацыямі "Кур'ера" дазволіла вызначыць два псеўданімы

---

[10] Дзённік М.Ромера. Т. 3. S. 61. Запіс ад 27.02(12.03).1913 г.

[*] Пераклад з рускай і польскай мовы А. Смаленчука. У беларускіх тэкстах і ў рускамоўным дадатку захавана арфаграфія і пунктуацыя арыгінала. Скарачэнні ў тэкстах пазначаны шматкроп'ем у дужках - <...>.

А.Луцкевіча: "Веслаў Каліноўскі" і "К-вец". Гісторык Ян Юркевіч вызначыў яшчэ адзін - "Генрык Букавецкі"[11]. Яго ж згадаў у сваім артыкуле ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі Анатоль Сідарэвіч.

Улетку і ўвосень 1913 г. выдавецкія справы "Кур'ера краёвага" складваліся не лепшым чынам. У сувязі з занятасцю А.Луцкевіча і ад'ездам з Вільні М.Ромера ўзровень публікацый панізіўся, абвастрыліся фінансавыя праблемы. Я.Манькоўскі, які застаўся без падтрымкі, не здолеў захаваць на былым узроўні краёвы и дэмакратычны накірунак газеты. У кастрычніку 1913 г. М.Ромер адмовіўся супрацоўнічаць з газетай, якая, па яго словах, ператварылася ў "бульварны свісток"[12]. Лёс газеты хваляваў і А.Луцкевіча. У лістападзе беларусы ініцыіравалі беларуска-польска-летувіскі сход для абмеркавання будучыні "Кур'ера краёвага".

У сходзе, які адбыўся 16 (29) лістапада 1913 г., з беларускага боку ўдзельнічалі браты Луцкевічы, В.Іваноўскі і А.Уласаў, з летувіскага - Ян Вілейшыс і Міколас Сляжэвіч (ад сацыял - дэмакратаў), Міколас Біржышка і Сцяпонас Кайрыс (ад нацыянал-дэмакратаў), з польскага - Міхал Ромер, Аляксандр Заштаўт, Уладзіслаў Асмалоўскі, Юліўш Сумарок. Да польскіх удзельнікаў М.Ромер у сваім дзённіку аднёс і Я.Манькоўскага (?). Ён таксама прысутнічаў на сходзе, хаця А.Луцкевіч і М.Ромер ужо прынялі рашэнне пра адхіленне Я.Манькоўскага ад рэдакцыйнай працы ў "Кур'еры". (У 1915 г. ягоныя артыкулы зноў з'явяцца ў "Нашай Ніве".)

Удзельнікі схода пасля працяглай дыскусіі прызналі неабходным падтрымаць "Кур'ер" як "орган польскай дэмакратыі". Не апошнюю ролю ў выпрацоўцы менавіта такой фармуліроўкі адыгралі браты Луцкевічы. У спрэчцы М.Ромера з летувісамі і В.Іваноўскім, якія сцвярджалі, што "Кур'ер" павінен з'яўляцца органам агульнакраёвай

---

[11] Jurkiewicz J. Demokraci wileńscy w latach 1905-1914. Zarys działalności i myśli politycznej // Acta Baltico-Slavica. XV. 1983. S. 171.

[12] Дзённік М.Ромера. Т. 3. S. 299. Запіс ад 22.10(4.11).1913 г.

------------------------------------------------------------------------------------------

дэмакратыі, Луцкевічы падтрымалі польскі бок. Яны прызналі неабходнасць развіцця польскай дэмакратыі як часткі краёвага дэмакратычнага руху[13].

Яшчэ адным вынікам сходу было ўтварэнне Арганізацыйнага і Рэдакцыйнага камітэтаў. У першым з іх палякаў прадстаўлялі Ю.Сумарок, Букоўскі і М.Ромер, летувісаў - Ян Вілейшыс, Юргіс Шаўлюс і Сцяпонас Кайрыс, беларусаў - браты Луцкевічы і Вацлаў Іваноўскі. У Рэдакцыйны камітэт увайшлі А.Луцкевіч, М.Ромер і Ю.Шаўлюс[14]. Антон Луцкевіч абавязаўся рыхтаваць для газеты два перадавыя артыкулы ў тыдзень. Аднак канчаткова пераадолець творчы і фінансавы крызіс газета ўжо не здолела.

Так выглядала знешняя канва падзей, звязаных з польскамоўнай і рускамоўнай выдавецкай дзейнасцю А.Луцкевіча ў 1912-1915 гг. Напрыканцы 1912 г. пад кантролем віленскага беларускага кола знаходзіліся чатыры выданні: два беларускія - "Наша Ніва" і "Саха", адно польскамоўнае - "Кур'ер краёвы" і адно рускамоўнае - "Вечерняя газета".

Паспрабуем зразумець унутраную падаплёку гэтай гісторыі. Навошта Антону Луцкевічу спатрэбіўся ўвесь гэты "маскарад"? Чым было выклікана ягонае імкненне да цэнтралізацыі віленскага дэмакратычнага друку ў беларускіх руках? Як выданне "Вечерней газеты" і "Кур'ера краёвага" паўплывала на грамадска-палітычную і міжэтнічную сітуацыю ў краі? Як гэтая выдавецкая дзейнасць адбілася на развіцці беларускага руху?

Адказаць на гэтыя пытанні дапаможа аналіз публікацый "Вечерней газеты" і "Кур'ера краёвага". Звернем увагу і на матэрыялы "Нашай Нівы". Аналіз, праўда, будзе абмежаваны пераважна артыкуламі А.Луцкевіча.

Што ж сабой уяўляла пазіцыя гэтых трох* выданняў па асноўных праблемах жыцця беларуска-летувіскага краю?

---

[13] Там жа. S. 323. Запіс ад 16(29).11.1913 г.

[14] Дзённік М.Ромера. Т. 3. S. 329. Запіс ад 22.11(3.12).1913 г.

* "Саха" (рэд. А.Уласаў) асвятляла праблемы сельскай гаспадаркі.

У праграмных артыкулах першых нумароў "Вечерней газеты" і "Кур'ера краёвага" А.Луцкевіч сфармуляваў галоўныя задачы выданняў, якія цалкам адпавядалі дэмакратычнаму варыянту краёвай ідэалогіі.

"Вечерняя газета" № 1 ад 18.09(1.10).1912 г.: "У нас ніякім чынам нельга зыходзіць з інтарэсаў якой-небудзь адной нацыянальнай групы. Ва ўмовах разнастайнасці нацыянальнага складу насельніцтва трэба ўвесь час мець на ўвазе інтарэсы краю, як адзінага цэлага. Толькі ў гэтым выпадку магчыма нармальнае развіццё кожнай асобнай народнасці. Усведамленне, што ўсе мы, жыхары гэтай зямлі, з'яўляемся грамадзянамі краю - вось наша зыходная кропка пры высвятленні патрабаванняў розных груп насельніцтва". Поўнае задавальненне этнічных і сацыяльных патрабаванняў А.Луцкевіч звязваў з устанаўленнем дэмакратычнага ладу. Пад апошнім у гэтым артыкуле разумелася правядзенне ў жыццё ў поўным аб'ёме "вялікіх палажэнняў, абвешчаных яшчэ Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г."

У праграмным артыкуле № 1 "Кур'ера" падкрэслівалася небяспека ваяўнічага шавінізму, які "ўносіць у народныя масы ўзаемную нянавісць і ўнутраную барацьбу, пагражае распадам краю і стратай ім магчымасці абараняцца ад людзей, якія імкнуцца знішчыць на гэтай зямлі ўсялякае пачуццё асобнасці". Між тым, "у краі, дзе побач з летувісам жыве паляк, побач з беларусам - яўрэй, у краі, няшчасны лёс якога перадвызначыў ягонае адставанне і пазбавіў магчымасці свабоднага развіцця, няма месца для ўнутранай барацьбы". А.Луцкевіч заклікаў усіх "грамадзян Краю" да працы на ягоную карысць і на карысць народа.

На старонках "Кур'ера" і "Вечерней газеты" шырока ўжываўся тэрмін "грамадзянін Краю". Аўтары публікацый даводзілі, што жыццёва важныя для Краю пытанні павінны вырашацца з улікам інтарэсаў усіх этнасаў гістарычнай Літвы[15], асуджалі вялікарускі і вялікапольскі шавінізм[16],

15 Напр., Генрык Букавецкі [А.Луцкевіч]. Прынцыповае пытанне // Кур'ер краёвы. 1912. № 19; б/п [А.Луцкевіч?]. Одна из причин

заяўлялі пра неабходнасць барацьбы з праявамі шавінізму сярод беларусаў і летувісаў[17], выкрывалі сутнасць дзейнасці т.зв. "Белорусского общества" як арганізацыі вялікарускіх шавіністаў у беларускай "вопратцы"[18].

Асновай краёвай згоды лічылася супрацоўніцтва дэмакратычных сіл усіх этнічных рухаў[19]. Краёвасць досыць натуральна прыводзіла да дэмакратычных поглядаў: "Усё больш ясным становіцца той шлях, які мясцовым рускім людзям падказвае само жыццё. Як грамадзяне краю, мы павінны ўважыць яго карэннае насельніцтва, прыслухацца да ягонага голасу і пажаданняў, лічыць яго інтарэсы сваімі інтарэсамі і працаваць на агульную карысць"[20]. У сваю чаргу, дэмакратызм, які зыходзіў з павагі да народных патрабаванняў, непазбежна нараджаў краёвую пазіцыю[21].

Абодва выданні пашыралі ідэалогію краёўцаў-дэмакратаў. "Вечерняя газета" рабіла гэта сярод рускіх, але не пакідала цалкам па-за ўвагай і палякаў. У шэрагу артыкулаў апошніх спрабавалі пераканаць у тым, што толькі іх шчыры паварот да дэмакратыі можа гарантаваць будучыню польскай грамадскасці гістарычнай Літвы[22].

---

трений // Вечерняя газета. 1913. № 337 і інш.

16 Напр., б/п [А. Луцкевіч?]. Конквистадоры // Вечерняя газета. 1913. № 360; м.г. [М.Ромер]. Хто быў правы? // Кур'ер краёвы. 1913. № 127 і інш.

17 Напр., б/п [А.Луцкевіч?]. Национальные течения и демократия // Вечерняя газета. 1914. № 468 (гл.дадатак 1) і інш.

18 Напр., Вечерняя газета. 1913. № 188.

19 Напр., K-wiec [А.Луцкевіч]. Права і абавязкі // Кур'ер краёвы. 1912. № 3.

20 б/п [А.Луцкевіч?]. От русских прогрессивных избирателей г.Вильны // Вечерняя газета. 1912. № 12.

21 Веслаў Каліноўскі [А.Луцкевіч]. Выбар дарогі // Кур'ер краёвы. 1913. № 258.

22 Напр., б/п [А.Луцкевіч?]. А речи всё теже... // Вечерняя газета. 1912. № 64; б/п [А.Луцкевіч]. Два выступления // Вечерняя газета. 1913. № 263 і інш.

А вось для "Кур'ера краёвага" пашырэнне дэмакратычных поглядаў сярод палякаў было адной з галоўных задач. Антон Луцкевіч у сваіх артыкулах даволі часта апеліраваў да гістарычных традыцый. Напрыклад, "Генрык Букавецкі": "З паняццем польскасці заўсёды звязвалася паняцце свабоды", "Веслаў Каліноўскі": "Як некалі з іменем паляка атаясамлівалася вольнасць, так зараз наша (польская-А.С.) нацыянальная будучыня звязана з дэмакратыяй"[23].

А што ж "Наша Ніва"? Як удзельнічаў А.Луцкевіч у яе выданні?

Варта заўважыць, што да № 38 (20.09) за 1912 г. газета рэгулярна змяшчала артыкулы беларускага дзеяча пад крыптонімамі: А.Н., а-н-а., Г.Б. (у выданнях на беларускай лацінцы адпаведна:A.N., a-n-a., H.B.). З № 38 перадавыя артыкулы спачатку пісаў А.Уласаў, пазней - В.Ластоўскі, С.Плаўнік, М.Баброўіч і інш. Артыкулы А.Луцкевіча з'явіліся на старонках "Нашай Нівы" ізноў у 1913 г. Але ў параўнанні з 1911-1912 гг. яны выглядалі як эпізод.

Нават павярхоўны аналіз публікацый галоўнай беларускай газеты ўказвае на тэматычны паралелізм з матэрыяламі "Кур'ера краёвага" і "Вечерней газеты". У першую чаргу, гэта прапаганда краёвай ідэалогіі ў яе дэмакратычным варыянце і барацьба з этнічным шавінізмам[24]. Падчас выбарчай кампаніі ў IV Дзяржаўную думу "Наша Ніва" падтрымала кандыдатаў, якіх адстойвала "Вечерняя газета". У адным з артыкулаў "Нашай Нівы" адзначалася: "<...> мы, беларусы, можам верыць толькі шчырым расійскім прагрэсістам, каторые зрадніліся з нашым краем, лічаць сябе грамадзянамі нашай старонкі"[25]. Цікава, што з артыкуламі ў падтрымку

---

[23] Кур'ер краёвы. Адпаведна, 1912. № 8 і 1912. № 12.

[24] а-н-а [А.Луцкевіч]. Край і народ // Наша Ніва. 1912. № 28-29 (гл.дадатак 2); а-н-а [А.Луцкевіч]. Змаганне з хваробай // Наша Ніва. 1913. № 9 і інш.

[25] Наша Ніва. 1912. № 40.

кандыдатаў "Вечерней газеты" ў №№ 42-44 выступаў Я.Манькоўскі.

Усе тры выданні вялі сумесную барацьбу супраць вялікапольскага і вялікарускага шавінізму. Яны разам давалі адпор нападкам шавіністычнага друку. У першую чаргу, гэта тычылася "Виленского вестника" і "Гонца цодзеннэго"[26]. Адначасова А.Луцкевіч на старонках "Нашай Нівы" па-ранейшаму падкрэсліваў дэмакратызм беларускага руху[27].

Адныя з самых цікавых матэрыялаў "Вечерней газеты" і "Кур'ера краёвага" - гэта матэрыялы, якія распавядалі пра беларускі рух. Яны займалі значнае месца ў абодвух выданнях. Ужо ў гэтым праяўляўся "беларускі ўхіл" краёўца Антона Луцкевіча. Публікацыі абаранялі "Нашу Ніву" і ўвесь беларускі рух ад абвінавачванняў вялікарускіх і вялікапольскіх шавіністаў, якія імкнуліся давесці, што няма ніякага беларускага руху. Ёсць толькі "польская" або, адпаведна, "руская" інтрыга[28]. Матэрыялы распавядалі пра сітуацыю ў беларускім руху[29], адстойвалі права беларускай мовы быць мовай выкладання[30].

І рускамоўнае, і польскамоўнае выданне імкнуліся выклікаць сімпатыі да беларускага руху. "Вечерняя газета" асцярожна згадвала пра мясцовыя беларускія карані большасці рускай грамадскасці краю[31]. "Кур'ер краёвы" заклікаў палякаў шукаць згоду і паразуменне з беларусамі.

[26] Напр., б/п. Газэтнае хуліганства // Наша Ніва. 1913. № 9 і б/п. Бандытызм "Газеты цодзеннай" // Кур'ер краёвы. 1913. № 52.

[27] а-н-а [А.Луцкевіч]. Пуцяводная ідэя // Наша Ніва. 1914. № 11.

[28] Веслаў Каліноўскі [А.Луцкевіч]. Палітычная шкода // Кур'ер краёвы. 1913. № 206.

[29] Напр., Генрык Букавецкі [А.Луцкевіч]. 1913 год у жыцці беларусаў // Кур'ер краёвы. 1914. № 1; А.Н. [А.Луцкевіч]. Из белорускои жизни // Вечерняя газета. 1913. № 290.

[30] б/п [А.Луцкевіч?]. Родной язык в школе // Вечерняя газета. 1912. № 53; Бо-вичъ [М.Бабровіч]. Борьба за родной язык // Вечерняя газета. 1914. № 552; Веслаў Каліноўскі [А.Луцкевіч]. Палітычная шкода // Кур'ер краёвы. 1913. № 206 і інш.

[31] Напр., б/п [А.Луцкевіч?]. Национальная культура // Вечерняя газета. 1912. № 92.

Пры гэтым падкрэсліваліся дэмакратычныя тэндэнцыі ў беларускім руху: "Шчыры дэмакратызм беларускага руху <...> ягоная лаяльнасць у адносінах да суграмадзян іншых нацыянальнасцяў - гэта гарантыя, што нашыя імкненні знойдуць жывы водгук сярод беларусаў"[32]. Згода з беларусамі тлумачылася інтарэсамі барацьбы з вялікарускім шавінізмам[33] і адсутнасцю выразных перспектыў далейшага развіцця польскага руху на тэрыторыі гістарычнай Літвы[34].

Якраз у вызначэнні адносін польскай грамадскасці да беларускага Адраджэння можна заўважыць найбольш істотны момант "беларускага ўхілу" краёвасці Антона Луцкевіча і іншых дзеячаў нашаніўскага кола. У асобных публікацыях "Нашай Нівы"[35], у шэрагу артыкулаў "Кур'ера"[36], у польска-беларуска-летувіскіх дыскусіях лістапада 1913 г., што тычыліся будучыні "Кур'ера краёвага", вызначылася беларуская пазіцыя, якая не адпавядала разуменню краёвасці ні М.Ромерам, ні "Пшэглёндам Віленьскім".

Апошняе выданне досыць дакладна вызначыла сутнасць беларускага (і летувіскага) разумення краёвасці. Л.Абрамовіч і прыхільнікі "Пшэглёнда" лічылі, што пазіцыя беларусаў (і летувісаў) грунтавалася на адсутнасці веры ў магчымасць захавання польскасці ў Краі. Да гэтага трэба дадаць іх перакананне, што мясцовыя палякі - гэта нашчадкі паланізаваных летувісаў і беларусаў. Такая пазіцыя нараджала патрабаванні, каб польская грамадскасць працавала дзеля развіцця свядомасці беларусаў і летувісаў. "Пшэглёнд" катэгарычна адвяргаў

---

[32] Генрык Букавецкі [А.Луцкевіч]. Час патрабуе // Кур'ер краёвы. 1913. № 12.

[33] Генрык Букавецкі [А.Луцкевіч]. Прынцыповае пытанне // Кур'ер краёвы. 1912. № 9.

[34] К-вец [А.Луцкевіч]. Do ut des // Кур'ер краёвы. 1913. № 98.

[35] Напр., Г.Б. [А.Луцкевіч]. З газэт // Наша Ніва. 1912. № 19-20 і інш.

[36] Напр., Ястшэмбец І. [Манькоўскі Я.?]. Трывожны сігнал // Кур'ер краёвы. 1913. № 80 і інш.

падобныя заявы. Ён, як ужо адзначалася, абвінавачваў "Кур'ер" у "пабочных уплывах"[37]. Аднак цалкам раскрываць таямніцу выдання палякі не сталі. Усё ж такі дэмакратычныя сілы ў Вільні шмат што аб'ядноўвала.

"Беларускі ўхіл" можна заўважыць і ў асобных артыкулах "Вечерней газеты": "Справа культуры, справа прагрэсу настолькі важная, што яе павінен падтрымліваць кожны грамадзянін краю. Тут няма месца для меркаванняў праславутага нацыянальнага эгаізму: хто можа, той павінен садзейнічаць культурным намаганням сваіх слабейшых суседзяў, з якімі яго моцна звязаў гістарычны ход падзей"[38].

Падобныя заявы прыводзяць да думкі, што беларусы нашаніўскага кола і, у першую чаргу, А.Луцкевіч часцей разумелі краёвасць як сумеснае жыццё розных этнасаў Краю і імкнуліся забяспечыць за ўласным этнасам лепшыя ўмовы. Дарэчы, гэта набліжала іх пазіцыю да пазіцыі групы "Пшэглёнда Віленьскага". Аднак гэтае ж падабенства непазбежна рабіла іх апанентамі.

М.Ромер характарызаваў беларускія і летувіскія "прэтэнзіі" ў дзённіку і на старонках "Кур'ера" як праявы этнічнага шавінізму[39]. Але пры гэтым галоўны ідэолаг краёвасці быў упэўнены, што А.Луцкевіч і яго сябры ўрэшце рэшт зразумеюць польскую пазіцыю і пагадзяцца з тым, што палякі маюць поўнае права на развіццё ўласнай культуры[40]. У аднолькавай ступені з летувісамі і беларусамі яны павінны ўдзельнічаць у вызначэнні будучыні Краю.

Надзея М.Ромера, як паказалі дыскусіі вакол "Кур'ера", была дастаткова абгрунтаванай. Відавочна, што нашаніўскае беларускае кола ў гэты час моцна спадзявалася на пазітыўныя вынікі супрацоўніцтва з польскімі

---

[37] б/п [Л.Абрамовіч?]. Пабочныя ўплывы // Пшэглёнд Віленьскі. 1913. № 22/23.

[38] м.р. [М.Ромер]. Грамадзянская пазіцыя // Кур'ер краёвы. 1913. № 77.

[39] Дзённік М.Ромера. Т. 3. S. 324. Запіс ад 17(30).11.1913 г.

[40] б/п. [А.Луцкевіч?]. Практическое применение краёвой теории // Вечерняя газета. 1913. № 436.

краёўцамі-дэмакратамі. Дзеля згоды А.Луцкевіч быў гатовы пайсці на пэўныя ўступкі. Магчыма, ён разлічваў, што пазіцыя М.Ромера будзе пашырацца сярод польскай грамадскасці. У тым, што гэта прынясе вялікую карысць як беларускаму руху, так і ўсяму Краю беларускі дзеяч быў упэўнены.

Але надзеі не спраўдзіліся. І на пачатку 1915 г. А.Луцкевіч на старонках "Нашай Нівы" выступіў з вельмі рэзкай крытыкай "нашых" палякаў: "Нашыя" палякі-інтэлігенты кажуць, што яны маюць поўна работы "для сваіх "- для "польскага сялянства і пралетарыяту" на нашай зямлі. Але ж польскага "дэмаса" - на смех малая жменя. А поруч з гэтай жменяй мільёны цёмных і галодных беларускіх сялян, каторыя блізка не маюць йшчэ сваёй інтэлігенцыі, для каторых німа каму працаваць... Працаваць для тых мільёнаў - гэта для нашых палякаў грэх і здрада, хоць колькі ж між імі сыноў таго ж беларускага народу! <...>

Яны не разумеюць, што прайшоў час панавання над намі і трэба цяпер адслужыць нашай старонцы, трэба не толькі называцца, але і быць грамадзянамі, трэба карміць галоднага і асвяшчаць цёмнага селяніна не толькі за тым, што ён - "свой", што ён пераробіцца на паляка, але затым, што гэта сьвятая павіннасць. А раз гэта павіннасць, а не ласка, дык і вучыць беларусаў трэба не так, як хоча вучыцель, а так як гаворыць народ, каторы захаваўшы сваю мову праз соткі гадоў, праявіў ясна сваё жаданне заставацца беларусам"[41].

Гэтая крытыка не мела дачынення да М.Ромера і прыхільнікаў ягонай краёвай пазіцыі. Ужо праз нумар А.Луцкевіч адзначыў, што "поруч з "прыгоншчыкамі" ў нашай старонцы ёсць людзі, каторыя, баронячы сваю польскую культуру, не забываюць, што яны тутэйшыя грамадзяне, што і на іх ляжыць павіннасць памагаць галодным, асвяшчаць цёмных людзей, нягледзячы, якой яны нацыі і веры.<...>

---

[41] а-н-а. [А.Луцкевіч]. Кліч да згоды // Наша Ніва. 1915. № 10.

-----------------------------------------------------------------------------------------------

Мы верым, што сілы польскай дэмакратыі ўзрастуць, калі над зямлёй Беларусі засвеціцца зорка лепшай будучыны. А шчыры дэмакратызм створыць той залаты мост, каторы з'еднае ўрэшце народы нашага краю ў адну вялікую згодную сям'ю і каторы польскія нацыяналісты цяпер не даюць збудаваць"[42].

У заключэнні хацелася б яшчэ раз звярнуць увагу на матывы, якія падштурхнулі А.Луцкевіча да рэалізацыі незвычайнага беларускага выдавецкага праекта.

У 1912-1915 гг. Антон Луцкевіч падзяляў асноўныя прынцыпы краёвай ідэалогіі ў яе дэмакратычным варыянце. Магчыма, нават, што ягоны крыптонім "К-вец" вытворны ад слова "краёвец".

Пашырэнне краёвасці сярод рускай і польскай грамадскасці, якая ў большасці складалася з нашчадкаў некалі паланізаваных або русіфікаваных беларусаў (і летувісаў) ён лічыў карысным, як для ўсяго Краю, так і для беларускага Адраджэння.

Але ўзнікала пытанне, як прапагандаваць краёвую ідэалогію? Выкарыстаць "Нашу Ніву" і пашыраць краёвасць ад імя беларусаў? Але перад "Нашай Нівай" стаялі зусім іншыя задачы. Да таго ж беларускамоўная прапаганда была абмежавана этнічнымі рамкамі і наўрад ці магла аказаць сур'ёзны ўплыў на рускую і польскую грамадскасць Краю. І зусім па-іншаму яна ўспрымалася рускімі і палякамі, калі гучала на іх родных мовах.

"Вечерняя газета" і "Кур'ер краёвы" змяшчалі вялікую колькасць матэрыялаў пра беларускае Адраджэнне. Тое, што яны друкаваліся на польскай і рускай мовах ствярала магчымасць данесці праўду пра беларускі рух непасрэдна да польскага і рускага чытача. Гэта ўмацоўвала пазіцыі беларускага руху, пашырала кола ягоных прыхільнікаў або, па меньшай меры, прывучала польскую і рускую грамадскасць да думкі пра непазбежнасць беларускага Адраджэння.

А.Луцкевіч, відавочна, разлічваў і на тое, каб з дапамогай польскамоўнага і рускамоўнага выданняў

---

42 а-н-а. [А.Луцкевіч]. Іх адказ // Наша Ніва. 1915. № 12-13.

вярнуць у рэчышча беларускага руху хаця б частку страчанага раней беларускага насельніцтва. Дарэчы, М.Ромер сцвярджаў у дзённіку, што "вяртанне зрусіфікаваных элементаў да роднага беларускага асяроддзя і ўключэнне іх у беларускі рух" з'яўлялася галоўнай задачай "Вечерней газеты"[43]. Цалкам магчыма, што падобная задача, хаця і ў іншай ступені, стаяла і перад "Кур'ерам краёвым".

Істотнае месца ў прапагандзе краёвасці займала барацьба супраць этнічнага шавінізма. У адным з артыкулаў на старонках "Нашай Нівы" А.Луцкевіч заклікаў усе народы гістарычнай Літвы падаць сабе рукі і супольнымі сіламі бараніцца ад гэтай хваробы, каб "зніштожыць сяўбу ненавісьці і злосьці". А далей адзначаў: "Вось бачым добрую жменю расійскіх, польскіх і літоўскіх газет, каторыя - каждая ў сваім народзі - змагаюцца з чарнасоценствам. У Вільні выходзіць "Вечерняя газета", "Кур'ер краёвы", "Lietuvos Ukininkas", "Vilniaus Żinios", і ўсе яны поруч з "Нашай Нівай" ідуць да аднэй мэты: стараюцца развіваць "просты" народ, каб урэшці сам ён узяў свае справы ў свае рукі і з пагардай адвярнуўся ад тых, хто хоча выкарыстаць яго цемнату дзеля пашырэння націоналізма"[44].

Выдавецкі праект Антона Луцкевіча спрыяў дэмакратызацыі рускай і польскай грамадскасці Краю. Дарэчы, калі ўлічваць актыўную ролю нашаніўскага кола ў арганізацыі і дзейнасці віленскага асветніцкага таварыства "Вестник знания", то можна прыйсці да высновы, што з беларусаў складалася амаль уся "руская" дэмакратыя Краю. Пра польскую дэмакратыю гэтага не скажаш, але і тут дзейнасць беларусаў адыгрывала значную ролю.

Ці мела гэтая выдавецкая дзейнасць якія-небудзь негатыўныя вынікі для беларускага руху? Наўрад ці. Праўда, рускія і польскія шавіністычныя выданні атрымалі дадатковыя "доказы" таго, што беларускі рух - гэта "польская" або "руская інтрыга", накіраваная супраць

---

[43] Дзённік М.Ромера. Т. 4. S. 115. Запіс ад 19.05(1.06).1914 г.
[44] а-н-а. [А.Луцкевіч]. Змаганне з хваробай // Наша Ніва. 1913. № 9.

рускай або, адпаведна, супраць польскай грамадскасці. Але падобныя заявы мелі месца і раней.

Усё вышэйсказанае падаецца справядлівым з прагматычнага пункту погляду. Але можна выказаць яшчэ адну думку. Справа ў тым, што краёвасць з'яўлялася ломкай традыцый і стэрэатыпаў вузкай этнічнай прапаганды, якія ў гэты час ўжо сфарміраваліся ў народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы. У пэўным сэнсе краёвасць трымалася на ўнікальнай атмасферы шматэтнічнага Краю і, асабліва, Вільні. Гэтая атмасфера нараджала людзей, якія адчувалі сябе адначасова рускім і беларусам (Іван Краскоўскі* ), палякам і летувісам (Данатас Маліноўскас, Міхал Ромер), палякам і беларусам (Вітаўт Чыж**). Гэта была атмасфера сапраўднага этнічнага "карнавала", дзе адсутнічалі выразныя этнічныя межы, дзе ў залежнасці ад жыццёвых абставін маска станавілася тварам і наадварот.

Той жа беларус Антон Луцкевіч на старонках "Вечерней газеты" станавіўся рускім, а на старонках "Кур'ера краёвага" - палякам. Магчыма, мы сустракаемся з пэўнай заканамернасцю беларускай гісторыі. Яна вельмі багатая персанажамі, якія выступалі ў двух або нават трох іпастасях і адначасова належалі беларускай, польскай, летувіскай і рускай гісторыі. Можа гэта была праява "вольнага беларускага духа", што шукаў уласныя шляхі? Пра яго пісаў яшчэ Ігнат Канчэўскі ў сваіх "дасьледзінах беларускага сьветапогляду". Беларусь нараджала такіх людзей таму, што была зямлёй, дзе зліваліся розныя этнічныя, культурныя і рэлігійныя патокі. Кожны з іх знаходзіў прытулак і прыжываўся ў "беларускім доме".

---

* М.Ромер характарызаваў яго як "беларуса па паходжанню і рускага па культуры" (Дзённік М.Ромера. Т. 3. **S**. 352. Запіс ад 15(28).1913 г.). Ён жа паведаміў, што ў віленскім аддзяленні Саюза аўтанамістаў-федэралістаў менавіта І.Краскоўскі прадстаўляў рускую грамадскасць (Дзённік М.Ромера. Т. 4. **S**. 20. Запіс ад 13(26).02.1914 г.).

** На пачатку 1915 г. В.Чыж (Я.Яленьскі) заявіў пра сваё жаданне ўступіць у віленскую арганізацыю прыхільнікаў незалежнасці Польшчы (Дзённік М.Ромера. Т. 4. **S**. 383. Запіс ад 11.(24).02.1915 г.).

Калі мы пагадзімся з тым, што гэты этнічна-культурны "карнавал" мае свае глыбінныя гістарычныя падставы, нам будзе лягчэй зразумець асобы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Вікенція Канстанціна Каліноўскага, Аляксандра Ельскага, Рамана Скірмунта, Эдварда Вайніловіча і некаторых іншых. Дык можа краёвасць, якую адстойвалі М.Ромер, Р.Скірмунт і іх паплечнікі, не з'яўлялася толькі праявай пострамантычных і трохі наіўных спадзяванняў, а ўяўляла сабой адну з падстаў беларускай гісторыі?

Што ж датычыць даследавання выдавецкай дзейнасці А.Луцкевіча і ўсяго нашаніўскага беларускага кола, то яно павінна працягвацца. Застаюцца шматлікія пытанні. Напрыклад, якую ролю адыгралі ў гэтай выдавецкай дзейнасці віленскія масонскія ложы. (У 1910-1915 гг. яны аб'ядналі частку дэмакратычных сіл усіх этнічных рухаў гістарычнай Літвы. Сябрамі ложаў былі браты Луцкевічы, В.Ластоўскі і І.Краскоўскі[45].) Варта задумацца і над тым, чаму з двух выданняў большы поспех выпаў на долю "Вечерней газеты"? Ці можна лічыць гэта адлюстраваннем пэўных тэндэнцый, якія мелі месца сярод рускай грамадскасці Краю, ці толькі вынікам публіцыстычнай дзейнасці А.Луцкевіча? Чаму дэмакратызм "Вечерней газеты" і "Кур'ера краёвага" не выходзіў за межы ліберальна-дэмакратычнай ідэалогіі? Ці можна ставіць праблему сувязяў паміж "групай" Антона Луцкевіча і Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыяй?

Застаецца пытанне і пра тое, чым была краёвасць у беларускай гісторыі пачатку 20 ст.? Прагматычным разлікам прадстаўнікоў тых этнічных рухаў, якія адчувалі ўласную слабасць? Пострамантычнымі ілюзіямі некалькіх палітыкаў, далёкіх ад тагачаснай рэчаіснасці? Ці напоўсвядомай праявай глыбінных падстаў беларуска-літоўскай гісторыі? Гэтыя і іншыя пытанні яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў.

---

[45] Дзённік М.Ромера. Т. 4. S. 404. Запіс ад 4(17).03.1915 г.

---

## Дадатак 1.

Б/п. [А.Луцкевіч?]. Национальные течения и демократия // Вечерняя газета. 1914. № 468.

Во всех столкновениях на национальной почве - например, между поляками и литовцами* и др. - серьёзная роль принадлежит той массе народной, которая менее всего сознаёт свою национальную принадлежность. Эта аморфная в национальном отношении масса легко может быть использована в корыстных целях каждой из борющихся сторон: все зависит от средств воздействия, имеющихся в их распоряжении.

Когда польским националистам нужно придать больше весу своим выступлениям, они заявляют, что говорят от имени "польских масс", - т.е. аморфной массы, которую литовцы и белорусы признают своей. Некоторые периодические издания не постеснялись даже признать учиненный в костеле св. Иоанна фанатизированной толпой скандал "сознательным выступлением польской демократии"** . Точно также литовские националисты - наиболее крайние - склонны утверждать, что в Литве совершенно нет польских народных элементов - даже в городских центрах, где об этом, собственно, спорить не приходится.

Подобную картину являют и русско-белорусские отношения, равно как польско-белорусские. Недостаточно сознающую свою национальную обособленность белорусскую массу представители русского и польского национализма считают "своей": русские - православную часть, поляки - католическую. И обе народности, считающия себя призванными господствовать в Белоруссии, во всех случаях, где

---

* Тут і далей А.Луцкевіч мае на ўвазе летувісаў. - А.С.

** Размова ідзе пра выбух незадавальнення часткі католікаў увядзеннем летувіскай мовы ў дадатковае набажэнства. - А.С.

требуется поддержка массы, говорят опять-таки от имени безсознательных белорусов.

Спор из-за этой аморфной массы и является главным основанием для национальных трений и национальной борьбы в нашем крае. И потому невольно приходится искать разрешения спорных вопросов на почве выяснения физиономии "этнографического материала" - народа.

Национальныя движения - литовское и белорусское - до известной степени разрешают их, но лишь постольку, поскольку от самозащиты и восстановления своих естественных прав возрождающиеся народности не переходят к политике захвата, характерной для националистических групп. И наших больных вопросов не разрешат ни русские, ни белорусские, ни польские, ни литовские националисты: вся надежда на те демократические элементы, которые в среде возрождающихся крестьянских народностей обычно - да и в нашем крае - играют руководящую роль.

Просмотрите хотя-бы ряд номеров русских, польских, литовских и белорусских демократических изданий, - и вы везде увидите горячее стремление к созданию мирного modus'a vivendi, к достижению условий, при которых за каждой народностью было бы признано право на самоопределение, при которых право это могло бы осуществляться в действительности. Везде горячо приветствуется пробуждение национального самосознания в этом "этно-графическом материале", из которого сейчас каждый делает, что угодно, стараясь использовать для своих политических целей. Стремлениям националистов к захвату демократия противопоставляет национальную свободу, вполне справедливо считая, что только путем сознательного размежевания народностей возможно мирное сотрудничество их на пользу края.

Процесс индивидуализации народностей захватывает всю Западную Европу, захватил и Россию и наш край в частности. Этот процесс сейчас заметен и среди еврейского

населения в Польше (особенно в связи с бойкотом* ) и у нас.

Но если в Польше действует причина случайнаго характера, то у нас этот процесс вызван теми ненормальными отношениями, какие установились между принявшим русскую культуру и язык еврейством и другими национальностями края. Течение, имеющее конечной целью эмансипацию еврейской народности, выходит не из больших центров, где для него почти нет места, а из местечек и уездов, где еврейский элемент находится в непосредственном общении с народной массой другой национальности. Оттуда идет инициатива создания соответственной прессы, а издающийся в Вильне на разговорном еврейском языке журнал "Ди Идише Вэлт" за последнее время стал уделять много места вопросу о взаимоотношениях еврейской демократии и демократии других народностей, указывая, что именно индивидуализация евреев может создать почву для установления мирного modus'a vivendi.

Мы, понятно, вполне сознаем, что при развитии каждой национальности в ней совершается процесс дифференциации, что возникают националистические течения, враждебныя идеалам краевой демократии. Но тем серьезнее задача демократических элементов всех местных народностей, связанных общей территорией и общими интересами: задача эта - борьба с проявлениями национализма в своей национальной среде и объединении всей краевой демократии.

## Дадатак 2.

а-н-а. [А.Луцкевіч]. Край і народ // Наша Ніва. 1912. № 28-29.

Кожын чэлавек працуе дзеля таго, каб жыць. Жаданьне паддзержаць сваё жыцьцё - гэта агульная мэта.

---

* Маецца на ўвазе байкот яўрэйскага гандлю і рамяства ў Царстве Польскім, які быў ініцыіраваны польскімі шавіністамі. - А.С.

Так вядзецца ад найдаўнейшых часоў, і мэта працы людзей астаецца тая самая. Змяняецца толькі спосаб і форма яе.

Тысячы гадоў таму назад людзі жылі, бытцам зьверы, па лясох і карміліся мясам тых зьвероў, каторых самі забівалі. Жылі яны ўсе паасобку, або сваёй невялічкай сямьёй, бо іх дзеці, як падрасталі, ішлі далей сваёй дарогай, пакідаючы бацькоў. Тады кожын глядзеў на другога, як на ворага: адзін у аднаго адбіваў пажыву. Цяжкіе то былі часы: апрача сіл прыроды, с каторымі чэлавек ня ўмеў змагацца, апрача дзікіх зьвяроў, што яго лёгка маглі зніштожыць, - усюды прыходзілася перэмагаць ешчэ і сваіх жэ братоў-людзей за кусок мяса, за яду.

Мала-па-малу людзі перэхадзілі да працы на ральлі. Тут семья не разбегалася па лясох за пажывай, каторай раней кожын шукаў толькі для сябе: тут была ўжо патрэбна супольная праца многіх рук, і семья пачала разрастацца. Гэтак складаўся род, а пазьней і цэльнае племя. Ведама, і тады кожын думаў перш-на-перш аб сабе і сваёй карысьці, але ўжо людзі зразумелі, што, працуючы разам, кожын больш лягчэй прыдбае пажывы, чым працуючы асобне, дый ад дзікіх зьвероў ад ворагоў будзе зашчыта. Чэлавек, працуючы для сябе, працаваў ужо крыху і для іншых. Быў заведзен раздзел працы: каму што было пад сілу, хто да чаго быў складней, той і рабіў тое: хто зямлю выробляў, хто на палеваньне хадзіў, хто хатніе работы рабіў, ці жывёлу дагледаў.

Разрасталіся роды, племёны; паяўляліся гасударствы. І ўсюды, куды не глянь, бачым адно: ўсё болей і болей развіваецца супольнае, грамадзянскае жыцьцё і праца ўсяго племені, усяго народу вядзецца дзеля карысьці ўсіх разам і кожнаго паасобку. Грамадзянская праца дзеля агульнай карысці пераходзіць і за граніцы аднаго гасударства: яна агортывае ўвесь сьвет. І наш селянін, сеючы жыта, што пасьля паедзе ажно у Англію, так сама памагае англічанам, як англічане, выдумываючы і робячы розные машіны і прылады, прыносяць карысць нам.

Чым вышэйша культура насяленьня, тым лепей яно разумее, што багацьце, напрыклад, купецкаго стану можэ ўзрастаць толькі тады, калі багацее і развіваецца ўвесь край,

калі селяне больш дабра маюць на прадажу і больш тавароў купляюць; гэтак сама для вёскі мае вялікую вагу развіцьцё таргоўлі, бо тады за ўсё, што родзіць зямелька, можна і лепшую цэну дастаць, і прадаць лягчэй, дый танней абходзіцца тое, што да гаспадаркі патрэбна. Адным словам, чым барджэй развіваецца экономічнае жыцьцё старонкі, тым лепей жыць кожнаму стану.

Хто ўсё гэта уцяміў, той зразумее, што працуючы дзеля падняцьця роднаго краю, ён прыдбае карысць і для сябе, усё роўна, ці то будзе купец, ці селянін-хлебароб, ці фабрыкант, або памешчык. Падыймаць экономічнае жыцьцё сваей старонкі, развіваць яе творчэскіе сілы і культуру - вось задача, дзеля каторай могуць працаваць усе жыцелі, ня гледзячы на іх палажэньне ў грамадзянстве, заняцьце, стан, заможнасць: будучына [жыцеля] звязана з будучынай таго краю, дзе ён жыве.

Праўда, кожын знае, што ўсе станы вядуць заўсягды між сабой экономічную вайну: селянін і рабочы дабіваюцца вялікшай платы за сваю працу, карацейшаго рабочаго дня; фабрыкант і памешчык бачуць сваю карысць у тым, каб плату ўрэзаць, а лік гадзін працы павялічыць. Гэтак сама карысць гандляра вымагае, каб даражэй прадаць свой тавар, а купіць яго танна; сельскі гаспадар, наадварот, хацеў-бы таму гаспадару сваё дабро прадаць дорага, а за яго тавар аддаць менш грошы. І ўсё-ж такі для ўсіх будзе карысна, калі іх агульнае экономічнае жыццё будзе шпарка развівацца, а не стаяць на мейсцы, калі ўвесь край будзе багацець.

Багата ёсць прычын, каторые спыняюць развіцьцё экономічнаго жыцьця кожнай старонкі. Між імі бачым такіе прычыны, як суровасць клімату, неўраджайнасць зямлі, балоты, або недахват вільгаці, камяністыя горы і іншыя прыродныя варункі. І ўсё-ж такі розум людзкі і праца здалелі іх шмат перэмяніць: балоты асушаюць, дзе суха - ваду праводзяць і г.д. Калі з гэткімі прычынамі чэлавек спраўляецца, дык німа споркі, што можна справіцца і з такімі прычынамі, каторые крыюцца ў самых людзях, у грамадзянстве. Проці цемнаты, проці санлівасьці і ленасці ваеваць можэ кожын, пашыраючы прасьвету, развіваючы

эканомічную самапомач, заводзячы ўселякіе грамадзкіе арганізаціі і ўстройствы.

Развіцьцё эканомічнаго жыцьця і прасьветы - гэта дзьве дарогі, па каторых кожын народ, кожын край ідзе да культуры.

Але і развіцьце культуры спатыкае часта шмат перашкод. Багата людзей і дагэтуль не разумее, ці ня хочэ разумець, што развіваць культуру і выяўляць свае творчэскіе сілы кожная нація можэ тады, калі ёй дадзена на гэта поўная воля. Поўная свабода культурна-націанальнаго развіцьця - гэта першы варунак для развіцця такога краю, дзе, як у Беларусі і Літве, жыве ажно пяць асобных нацый: беларусы, літвіны, расейцы, палякі, жыды; толькі тады будзе падыймацца агульная культура краю, калі кожная нація здалее развіваць у сябе ўсе творчэскіе сілы, развіваць сваю націанальную культуру. Ізноў жэ пры развіцьці краёвай культуры хутчэй ідзе развіцьцё культуры ў кожнай націі.

З усяго, што мы тутака сказалі, выходзіць вось што. Эканамічнае і культурнае развіцьцё краю заўсягды дае аграмадную карысць як людзям розных станоў і прафэсій, так і цэлым націям. Значыць, кожын, хто працуе для свайго краю, прыносіць карысць усім яго жыхаром бяз розніцы заняцьця і палажэньня ў грамадзянстве, стану, націі. Такую працу могуць вясьці ўсе грамадзяне нашай зямлі Беларускай: гэта - іх супольная задача, каторая павінна быць праводнай зоркай для ўсіх, хто сваю будучыну і сваю долю злучае з будучынай нашаго краю.

Дадатак 3.

Веслаў Каліноўскі [А.Луцкевіч]. Выбар дарогі // Кур'ер краёвы. 1913. № 258.

Дзве дарогі, два прынцыпова розныя накірункі перад намі. Абуджаць народ ад спячкі і інертнасці, выкрасаць з яго іскру творчасці, вучыць узнімаць голас у сваю абарону і ўздымаць душу да вялікіх ідэалаў чалавецтва - гэта праца дэмакратаў, гэта адна з самых высакародных задач. Для

развіцця Краю, для развіцця кожнай нацыянальнай групы недастаткова, каб скарбамі культуры карысталіся толькі пэўныя, т.зв. "вышэйшыя" колы, каб толькі яны ўспрымалі ўсе дасягненні нацыі і стваралі новыя культурныя каштоўнасці. Хаця інтэлігенцыя, гэты інтэлект, мозг нацыі, увесь час атрымлівае падпітку знізу, з народных сфер, сам народ усё ж застаецца пасіўным. Так дарэмна гіне вялізарны запас сіл, які таіцца ў сермяжнай масе. Гэтыя сілы праяўляюцца выпадкова - у нешматлікіх індывідах, у выбранцах лёсу. У імя дабра народа і нацыі, у імя дабра ўсяго Краю, у імя прынцыпа справядлівасці трэба напружваць усе сілы, каб нерухомую глыбу - народ - ажывіць, і прыцягнуць мільённую армію да творчай, стваральнай працы.

Але побач з гэтай працай мы бачым іншыя намаганні, намаганні сіл, якія імкнуцца назаўсёды захаваць за сабой прывілеяванае становішча, не разумеючы, што ігнараванне інтарэсаў народу раўназначна разбурэнню падмурка ў жыцці Краю. Такая пазіцыя рэакцыйная, эгаістычная і блізарукая. Яна варожая ўсялякаму прагрэсу і дэмакратыі.

Ужо з самога вызначэння дэмакратычнай дзейнасці выразна выцякае выснова, што, імкнучыся да як мага поўнага развіцця духоўных сіл народа, дэмакратыя павінна як найвышэйшае дабро ацэньваць скарбы нацыянальнай культуры, нацыянальную адметнасць. Адсюль ідзе патрабаванне дэмакратыі забяспечыць поўную свабоду культурнага развіцця кожнай народнасці, павага да яе адметнасці і асаблівых патрабаванняў.

Рэакцыя высоўвае лозунгі нацыяналізма, прапагандуе панаванне сваёй нацыі над іншымі. Яны разумеюць, што, пануючы сярод сваіх, забяспечаць панаванне над іншымі, атрымаюць для сябе істотную карысць. Адсутнасць павагі да правоў уласнага народа абарочваецца адсутнасцю яе да іншых народаў, калі яны слабейшыя. З мацнейшымі рэакцыянеры заўсёды шукаюць згоды. Яны гатовы стаць на калені, каб толькі захаваць уладу над уласным народам...

Такімі дарогамі ідзе сёння нашае Краёвае грамадства. Калі рэакцыянеры і нацыяналісты розных адценняў грунтуюць сваю дзейнасць на падзеле і распальванні

варожасці сярод рознаплемянных народных слаёў, то дэмакратыя ўсіх нацыянальнасцей жыве адзінай думкай - вызваленне народу. Іншага шляху ў яе няма.

Жыццё прымушае кожнага, хто адыгрывае актыўную ролю ў сваёй грамадскасці, зрабіць свой выбар: з народам ці супраць народу. Ад выбранай дарогі будзе залежыць развіццё нашага Краю.

Мы выбіраем першы кірунак - з народам. Гэты курс не азначае саюза толькі з дэмакратычнай часткай польскай грамадскасці. Інтарэсы і імкненні дэмакратычных сіл усіх нацый Краю настолькі ідэнтычныя, што грамадска-палітычная ідэалогія краёвай дэмакратыі - адзіная для ўсіх.

Удзел дэмакратычных элементаў розных нацыянальнасцей ва ўсіх агульных справах - гэта аснова нацыянальнага жыцця кожнага народа. Свабодныя ад непатрэбнай і пагубнай барацьбы з братнімі народамі, яны ўсю сваю стваральную энергію накіроўваюць на развіццё ўласнай нацыянальнай культуры. А ў гэтай справе заўсёды можна разлічваць на сімпатыю і дапамогу нашых братоў-дэмакратаў іншых народаў. Народ, які не дабіўся нацыянальнай свабоды, не можа жыць поўным жыццём, таму патрабаваннем кожнага шчырага дэмакрата з'яўляецца ліквідацыя ўсіх форм гвалту. Пакуль будуць існаваць перашкоды, якія затрымліваюць або эканамічнае, або культурна-нацыянальнае развіццё хаця б адной з грамадскасцей нашага Краю, да таго часу дэмакратыя не спыніць сваіх намаганняў дзеля набліжэння лепшай будучыні нашай агульнай Айчыны.

Аўтар выказвае шчырую падзяку гісторыку Рымантасу Мікнысу, размовы з якім спрыялі падрыхтоўцы гэтага артыкула. Даследчая праца ў бібліятэках і архівах Вільні стала магчымай дзякуючы фінансавай падтрымцы Інстытута "Адкрытае грамадства" (**Research Support Scheme. № 64/1997**).

* * *

***Юры Бохан*** *(Менск)*

# КЛАСІФІКАЦЫЯ ПОЗНЯСЯРЭДНЯВЕЧНЫХ ШПОР ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 14 - 16 СТ.

Сярод прыстасаванняў для кіравання канём, шпоры ("астрогі") з'яўляліся адзіным элементам, які ўваходзіў непасрэдна ў экіпіроўку вершніка. Разам з тым, форма і канструкцыя шпор былі цесна звязаны і з рыштункам каня, асабліва з даўжынёй путлішчаў і тыпам сядла (кожны тып вымагаў іншай пасадкі вершніка)[1].

Шпоры з Вялікага Княства другой паловы 14-16 ст. можна падзяліць на некалькі груп, зыходзячы з **формы дужак** і **шыпа**. Аднак патрэбна зазначыць, што ў шэрагу выпадкаў класіфікацыя паводле гэтых крытэрыяў выглядае даволі ўмоўнай па прычыне наяўнасці пераходных варыянтаў.

Як сведчаць археалагічныя матэрыялы, шпоры самага ранняга тыпу, што ўжываліся на працягу разглядаемага перыяду (група І), сустракаліся ўжо ў 13 ст. Яны мелі дужку з плаўным альбо каленчатым выгінам. Канцы дужкі забяспечваліся зачэпамі ў выглядзе адзінарных ці двайных петляў простакутнай альбо круглай формы. Шпора прышпільвалася да нагі з дапамогай двух рамянёў, пры гэтым адзін рамень праходзіў пад ступнёй, а другі паверх яе. На пятачнай частцы дужкі маецца пашырэнне, часам у выглядзе язычка. Яно прадухіляла коўзанне шпоры па пяце. Шып, які служыў непасрэдна для прышпорвання каня, скіраваны ўніз. Ён мае кароткую шыйку і вілку - раздвоены канец, які ўтрымліваў зоркападобнае колка. У цэлым шпоры

[1] Wawrzonowska Zd. Rząd koński i oporządzenie jeździeckie // Uzbrojenie w Polsce średniowiecznej. 1350-1450. Łódz, 1990. S. 189.

гэтай групы адпавядаюць тыпу V паводле класіфікацыі А.М.Кірпічнікава[2].

У 14-15 стст. гэтыя шпоры падвергліся пэўнай трансфармацыі. Яна праявілася найперш у павелічэнні даўжыні шыпа, а ў шэрагу выпадкаў і ў яго плаўным выгінанні ўверх[3]. Найбольш тыповымі ўзорамі позніх шпор групы I з'яўляюцца экзэмпляры, знойдзеныя ў Гародні (Мал.1:1-2), на тэрыторыі былога Пераяслаўскага павета Уладзімірскай губерні (Мал.1:3), у могільніку Круміняй у Літве (Мал.1:7) і ў могільніку ля в. Вензаўшчына Шчучынскага раёна (Мал.1:8)[4]. Разам з тым, аб магчымасці пазнейшага ўжывання шпор з кароткім шыпам сведчаць знаходкі ў Заслаўі. Тут у слаях 15-16 стст. былі знойдзены шпоры, даўжыня шыпа якіх складала 2,7 - 3,3 см (Мал.1:4-6)[5]. Увогуле ж, як можна меркаваць, шпоры групы I выкарыстоўваліся ў Вялікім Княстве Літоўскім найбольш інтэнсіўна да 15 ст., што супадае з іх датаваннем на тэрыторыі суседняй Польшчы[6].

У 15 ст. у Еўропе распаўсюдзіўся спецыфічны тып шпор, сфармаваны на базе ўзораў першай групы, які характарызуецца вельмі доўгім шыпам і зорачкай з нешматлікімі спічастымі промнямі. Лічыцца, што на кшталтаванне падобных экзэмпляраў аказала ўплыў адмысловая рыцарская пасадка ў сядле на выпрастаных

---

[2] Кирпичников А.Н. Снаряжение всадника и верхового коня на Руси IX-XIII вв. Ленинград, 1973. С. 37.

[3] Кирпичников А.Н. Снаряжение всадника и верхового коня... С. 68; Ён жа. Военное дело на Руси в XIII-XVвв. Ленинград, 1976. С. 49-50.

[4] Трусаў А.А., Собаль В.Е., Здановіч Н.І. Стары замак у Гродне XI-XVIII стст.: Гісторыка-археалагічны нарыс. Мінск, 1993. Мал. 57 : 13, 18; Кирпичников А.Н. Военное дело на Руси в XIII-XV вв. Табл. XX : 2; Volkaite-Kulikauskiene R. Kruminiµ senkapis // Lietuvos archeologija. 1979. T. 1. Pav. 6 : 2.

[5] Заяц Ю.А. Зброя блізкага бою, рыштунак вершніка і верхавога каня з раскопак Заслаўя // Помнікі культуры. Новыя адкрыцці. Мінск, 1985. Рыс. 3 : 3-5.

[6] Wawrzonowska Zd. Rząd koński i oporządzenie jeździeckie. S. 190.

нагах, якая абмяжоўвала згінанне ног у каленах (каб не губляць стрэмя)[7]. Аднак, улічваючы, што такая пасадка была распаўсюджана ў Еўропе яшчэ да 15 ст., можна выказаць меркаванне, што на павелічэнне даўжыні шыпоў паўплывала і гатычная мода з яе імкненнем да спічастых і выцягнутых форм. У сувязі з гэтым вышэйзгаданыя шпоры (група II) можна назваць, праўда, ўмоўна, "гатычнымі". У класічных "гатычных" шпораў, якія былі распаўсюджаны ў Польшчы з сярэдзіны 15 ст. (час найбольшага ўвасаблення гатычных рысаў у вытворчасці ўзбраення), дужка не толькі мела пашырэнне ў пятачнай частцы, але забяспечвалася шырокім месяцападобным напятачнікам[8]. Шып такіх шпор мог быць скіраваны ўніз, мог размяшчацца гарызантальна і нават уздымацца ўверх. Найбольш яскравым узорам шпор групы II з'яўляецца экзэмпляр 15 ст. са Шклова. Даўжыня ягонага шыпа, злёгку ўзнятага ўверх, складала каля 9 см, дыяметр васьміпрамянёвай зорачкі - каля 5 см. Дужка з каленчатым выгінам ля канцоў забяспечвалася гарызантальна размешчанымі падвойнымі петлямі, якія пераходзілі ў шырокі напятачнік і ўтваралі з ім адну гарызантальную лінію (Мал.2:3). Шыйка шыпа аформлена ў выглядзе перакручанага стрыжня[9].

Шпора, канструкцыйна блізкая да шклоўскай, была знойдзена ў Менску[10]. Яна знаходзілася ў слаі з матэрыяламі 17 ст., аднак, хутчэй за ўсё, была выраблена ў больш раннія часы. Дужка гэтай шпоры мае каленчаты выгін у апошняй трэці даўжыні. Падвойныя петлі і шырокі напятачнік размяшчаюцца гарызантальна, аднак не ўтвараюць адной

---

[7] Nowakowski A. Oporządzenie indywidualne. [w:] Polska technika wojskowa do 1500 roku. [w:] Z dziejów nauki i techniki. Warszawa, 1994. T. 1. S. 250.

[8] Wawrzonowska Zd. Rząd koński i oporządzenie jeździeckie. S. 190.

[9] Саганович Г.Н. Кузнечное ремесло Белоруссии XIV-XVIII вв. Дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1988. Рис.22:8.

[10] Заяц Ю.А. Оборонительные сооружения Минска XI-XIII вв. Минск, 1996. С. 72. Рис.28:7; Собаль В. Традыцыя кавальства і металаапрацоўкі сярэднявяковага Менска [у:] З глыбі вякоў. Наш край. Гісторыка-культуралагічны зборнік. Мінск, 1992. С. 75. Мал.2:10.

ліній. Даўжыня шыпа складае 6,3 см. На шыйцы шыпа, непадалёк ад месца яго злучэння з дужкай, маецца аздабленне ў выглядзе вузкага падвоенага паяска (Мал.2:4). Шпора з надзвычай доўгім шыпам (каля 15,2 см) і шасціпрамянёвай зорачкай выяўлена ў Наваградку (Мал.2:1)[11]. Фрагмент шпоры з шыпам даўжынёй каля 8 см і васміпрамянёвай зорачкай знойдзены ў слаях 15-16 стст. у Крычаве (Мал.2:5)[12].

Цікавы ўзор "гатычнай" шпоры знаходзіцца ў зборах Гарадзенскага гісторыка-археалагічнага музея (інв. № 8904). Ён быў знойдзены ў маёнтку Бацікі былога Бельскага павета Гарадзенскай губ. Шпора мае дужку без напятачніка і нават без пашырэння ў пятачнай частцы, але з каленчатым выгінам у апошняй трэці даўжыні. Па канцах дужкі зверху размешчаны дзве пары раздзельных вушкападобных петляў. Доўгі, каля 9 см, шып мае на шыйцы ўпрыгожанне ў выглядзе вузкага спіральнага жгута і злёгку скіроўваецца ўніз (Мал.2:2). Не выключана, што гэтая шпора належыць да ранніх варыянтаў "гатычных" шпор, у якіх яшчэ назіраліся рысы, характэрныя для ўзораў групы I.

Яшчэ адной тэндэнцыяй у эвалюцыі познясярэднявечных шпор было выпростванне іх дужак. Найбольш інтэнсіўна гэты працэс адбываўся ў 15-16 стст., калі распаўсюдзіліся экзэмпляры з абсалютна простай у бакавой праекцыі дужкай[13]. Падобная дужка, у цэлым, значна карацейшая, чым ва ўзорах папярэдніх груп, характэрна для шпораў групы III. Іх шып, найчасцей змадэляваны ў выглядзе простага стрыжня чатырохвугольнага сячэння, размяшчаўся ў адной плоскасці з дужкай альбо быў скіраваны пад нязначным вуглом уніз.

---

[11] Гуревич Ф.Д. Отчёт о работе новогрудской экспедиции в 1977 г. // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Спр. 569. Рис.17:3.

[12] Ткачоў М.А., Мяцельскі А.А. Зброя і рыштунак вершніка з раскопак Крычава // Гістарычна-археалагічны зборнік. Мінск, 1994. № 4. С. 193. Мал.5:5.

[13] Саганович Г.Н. Кузнечное ремесло Белоруссии XIV-XVIII вв. С. 64-65.

Даўжыня шыпоў вагаецца досыць значна: ад кароткіх, супаставімых па памерах з шыпамі шпор групы I, да доўгіх.

У рамках трэцяй групы можна выдзеліць два варыянты. Для шпор варыянта А ўласцівы вузкі ці звужаны ў накірунку зорачкі шып, тады як дужка можа быць вузкай альбо шырокай (адносна шырыні шыпа). Экзэмпляр з шырокай дужкай і шыпам даўжынёй каля 7,5 см знойдзены ў пахаванні канца 15-пачатку 16 ст. у могільніку ля в. Грэжэ Мажэйкскага раёна Летувы[14]. Асаблівасцю гэтай шпоры з'яўляецца доўгі адагнуты язычок у пятачнай частцы дужкі, нетыповы для шпор групы III (Мал.3:1). Фрагмент шпоры варыянта А, з шырокай дужкай і звужаным шыпам даўжынёй 4,2 см выяўлены разам з матэрыяламі 16 ст. у Заслаўі (Мал.3:4)[15]. Дзве шпоры гэтага ж варыянта былі выпадкова знойдзены ў могільніку Бячай ля воз. Вяпрай у Летуве[16]. Адна з іх мае адносна шырокую дужку і звужаны да шасціпрамянёвай зорачкі шып даўжынёй каля 5,8 см (Мал.3:2). На канцах дужкі маюцца па тры акруглыя пятлі. Дзве з іх знаходзяцца ў верхняй частцы дужкі, адна - ў ніжняй. Другая шпора забяспечана кароткім (3 см) шыпам з васьміпрамянёвай зорачкай, вузкай дужкай і здвоенымі акруглымі петлямі на яе канцах, якія размешчаны гарызантальна (Мал. 3:3). У абодвух экзэмплярах шып нязначна адагнуты ўніз. Шпора з простай вузкай дужкай і гарызантальным шыпам даўжынёй каля 4 см, які завяршаецца шасціпрамянёвай зорачкай, выяўлены таксама на гарадзішчы Пуня ў Летуве[17].

Да ўзораў групы III (А) набліжаецца шпора з Ліды, знойдзеная ў слаях 16-пачатку 17 ст.[18] Разам з тым канец

---

[14] Varnas A. Griżes km. (Mażeikių raj.) XV a. Pabaigos - XVII a. Senkapiai // Lietuvos TSR Mokslų Akademijos darbai. 1986. N. 3 (96). Pav.2:10.

[15] Заяц Ю.А. Зброя блізкага бою ... С. 189. Рыс.3:6.

[16] Zabiela G. Beciu senkapis // Lietuvos archeologija. Vilnius, 1995. T. 11. Pav.1:2-3.

[17] Volkaite-Kulikauskiene R. Punios pilikalnis. Vilnius, 1974. Pav. 12.

[18] Трусаў А.А. Краўцэвіч А.К., Сагановіч Г.М. Металічныя вырабы Лідскага і Мірскага замкаў // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. 1987. № 4. С. 82. Рыс.2:38.

шыпа ў яе плаўна загінаецца ўніз і, што галоўнае, не мае зорачкі, а завяршаецца толькі вастрыём. Апошняе наогул не характэрна для шпор 14-16 стст. Не выключана, што падобнае арыгінальнае завяршэнне шыпа, даўжыня якога складае 17 см, стала вынікам перапрацоўкі пашкоджанага (напрыклад, абламанага) экзэмпляра.

Да варыянта В групы III адносяцца шпоры з шырокай дужкай і роўным ёй па шырыні шыпам, змадэляваным у выглядзе больш ці меньш доўгай паласы. Шпоры падобнага кшталту былі выяўлены ў Віцебску (Мал.3:6-7) і Крычаве (Мал.3:5)[19]. Для ўсіх іх характэрныя простакутныя двайныя петлі на канцах дужак і зорачкі ў выглядзе зазубранага колка.

Экзэмпляры трэцяй групы, асабліва варыянт В, канструкцыйна набліжаюцца да шпораў, якія выкарыстоўваліся ў 16 ст. гусарамі[20]. У Рэчы Паспалітай гусарскія шпоры бытавалі да сярэдзіны 17 ст., пасля чаго былі выцеснены шпорамі заходнееўрапейскага кшталту, набліжанымі да райтарскіх і кірасірскіх, якія мелі кароткія выгнутыя шыйкі[21]. Апошнія, па ўсёй верагоднасці, фігуруюць у пісьмовых крыніцах Вялікага Княства Літоўскага другой паловы 16 ст. як "астрогі нямецкія", побач з "гусарскімі" і "казацкімі" шпорамі[22]. Яны прадстаўлены і археалагічнымі знаходкамі (група IV). Для шпор гэтай групы апроч кароткага шыпа, плаўна ці каленчата выгнутага ўніз, характэрны простыя ці слабавыгнутыя ў бакавой праекцыі дужкі, што набліжае іх да экзэмпляраў групы III. У большасці выпадкаў шыпы шпор чацвёртай групы маюць каля дужкі аздабленне ў выглядзе

---

[19] Саганович Г.Н. Кузнечное ремесло Белоруссии XIV-XVIII вв. Рис.22:6-7; Ткачоў М.А., Мяцельскі А.А. Зброя і рыштунак вершніка з раскопак Крычава. С. 193. Мал.5:2.

[20] Бехайм В. Энциклопедия оружия. Санкт-Петербург, 1995. Рис. 620; Żygulski Zd. Broń w dawnej Polsce na tle uzbrojenia Europy i Bliskiego Wschodu. Warszawa, 1982. S. 175-176, 192.

[21] Żygulski Zd. Broń w dawnej Polsce... S. 285. Il. w alb. 302.

[22] АВАК. Т. 14. Вильна, 1887. С. 264; АВАК. Т. 3. Вильна, 1870. С. 290.

аднаго ці некалькіх патаўшчэнняў альбо паяскоў. Найбольш характэрныя ўзоры такіх шпор знойдзены ў Лідзе (Мал.4:1), Друцку (Мал.4:2), Крэве (Мал.4:4), Крычаве (Мал.4:3) і Міры[23].

Шпоры групы IV былі сканструяваны, верагодна, у 15 ст. на базе шпор групы I. На цесную сувязь экзэмпляраў абодвух груп указвае наяўнасць пераходных варыянтаў са значна выгнутымі дужкамі і з шыйкай, якая мела каля дужкі характэрныя патаўшчэнні ці паяскі. Шып такіх шпор можа быць як просты, так і выгнуты[24]. Цікавы ўзор, які мае ўсе прыкметы групы I, але з паясковым аздабленнем шыйкі простага шыпа, выяўлены ў Заслаўі ў слаях канца 15-першай паловы 16 ст. (Мал.1:6).

**Мал.1. Шпоры групы I: 1-2 - з Гародні (паводле А.Трусава, В.Собаля, Н.Здановіч); 3 - з былога Пераяслаўскага павета Уладзімірскай губ. (паводле А.Кірпічнікава); 4-6 - з Заслаўя (паводле Ю.Зайца); 7 - з Круміняй (паводле Р.Валкайтэ-Кулікаўскене); 8 - з Вензаўшчыны.**

**Мал.2. Шпоры групы II: 1 - з Наваградка (паводле Ф.Гурэвіч); 2 - з маёнтку Бацікі былога Бельскага павета Гарадзенскай губ.; 3 - з Шклова (паводле Г.Сагановіча); 4 - з Менску (паводле В.Собаля); 5 - з Крычава (паводле М.Ткачова і А.Мяцельскага).**

**Мал.3. Шпоры групы III: 1 - з в. Грэжэ (паводле А.Варнаса); 2-3 - з Бячай (паводле Г.Забелы); 4 - з Заслаўя (паводле Ю.Зайца); 5 - з Крычава (паводле М.Ткачова і**

---

[23] Саганович Г.Н. Кузнечное ремесло Белоруссии XIV-XVIII в. Рис.22:4; Кирпичников А.Н. Военное дело на Руси ... Табл. XX : 7; Сагановіч Г.М. Кавальска-слясарскія вырабы з раскопак Крэўскага замка // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Мінск, 1993. С. 96. Мал.29:22; Ткачоў М.А., Мяцельскі А.А. Зброя і рыштунак вершніка з раскопак Крычава. Мал.5:1; Трусаў А.А., Краўцэвіч А.К., Сагановіч Г.М. Металічныя вырабы Лідскага і Мірскага замкаў. С. 82. Рыс.2:35.

[24] Кирпичников А.Н. Военное дело на Руси ... Табл.XX:3-4.

**А.Мяцельскага); 6-7 - з Віцебска (паводле Г.Сагановіча).**

**Мал.4. Шпоры групы IV: 1 - з Ліды (паводле Г.Сагановіча); 2 - з Друцка (паводле А.Кірпічнікава); 3 - з Крычава (паводле М.Ткачова і А.Мяцельскага); 4 - з Крэва (паводле Г.Сагановіча).**

KAMUNIKAT.org

---

# ДАКУМЕНТ

## АНТОН ЛУЦКЕВІЧ ПРА БЕЛАРУСКАЕ АДРАДЖЭННЕ ПАЧАТКУ 20 СТ.

У аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Летувы захоўваецца (F21-337) рукапіс, невядомага беларускаму чытачу, артыкула Антона Луцкевіча. Ён прысвечаны гісторыі беларускага культурнага Адраджэння пачатку 20 ст. З тэксту рукапісу можна зрабіць выснову, што А.Луцкевіч працаваў над ім у канцы 1910-пачатку 1911 г. Артыкул прызначаўся да друку ў адным з украінскіх перыядычных выданняў. На першай старонцы рукапісу знаходзіцца маларазборлівы надпіс, зроблены алоўкам: *"Літ.-Надв. Вістнік"*.

Перадгісторыя напісання артыкула дакладна невядома. Аднак знаёмства з "беларускімі" матэрыяламі аддзела рукапісаў азначанай бібліятэкі дазволіла заўважыць, што ў гэты ж час А.Луцкевіч рыхтаваў аналагічны артыкул для аднаго з перыядычных яўрэйскіх выданняў Вільні, працаваў над рэфератам, прысвечаным беларускаму руху, каб выступіць у адной з асветніцкіх арганізацый Масквы і г.д. Верагодна, знойдзены артыкул з'яўляўся часткай кампаніі па азнаямленні з дасягненнямі беларускага культурнага Адраджэння народаў-суседзяў.

Артыкул дазваляе паглядзець на дасягненні і праблемы беларускага Адраджэння пачатку 20 ст. вачыма аднаго з кіраўнікоў беларускага руху. Разважанні і ацэнкі А.Луцкевіча заслугоўваюць асаблівай увагі.

Рукапіс напісаны алоўкам на 34 старонках.

Тэкст рукапісу друкуецца ў поўнай адпаведнасці з арыгіналам.

***Алесь Смалянчук.***

*Працi цячэньня вады*
*Зможэ толькi жывое паплыць.*
*Хвалi - ж рэкi заўсягды*
*Тое цягнуць, што скончыло жыць.*
***Максiм Багдановiч.***

I. Весьма сильно распространён взгляд, будто среди народов нашей планеты одни, достигнувшие к настоящему моменту высокого развития своей национальной культуры, имеют право гражданства - право на дальнейшее национально-самостоятельное существование, а все прочие лишены этого права и в национальном отношении обречены на гибель.

Такой взгляд существует давно, несмотря на то, что в круг этих "избранных" полноправных национальностей врываются всё новые: не говоря уже о народах Востока, почти на наших глазах возродились чехи, украинцы, сербы, хорваты, далее литовцы, а за ними возрождается Прованс и Каталония, возрождаются различные "цветные" племена.

Таким образом, жизнь сама опровергает это странное мнение, потому что не однообразие, а многообразие - богатство форм - двигает жизнь и создает для человечества всё новые и новые ценности.

Белорусское национальное возрождение - хронологически самое последнее среди возрождений славянских народностей. Явление это столь новое, что при взгляде на достигнутые им результаты, приходится невольно удивляться быстроте роста белорусского движения. Небезинтересно поэтому изследовать, каковы его пути и цели.

II. Прежде всего припомним, что белоруссы, как особая нация, имеют серьёзное историческое прошлое. Оно общеизвестно, да при том столь близко с прошлым Украины, с которой белорусы жили общей нравственной жизнью, пользовались общей письменностью вплоть до XVIII столетия, что только в общих чертах коснемся истории белоруссов.

Белорусская народность сложилась приблизительно в начале нашего тысячелетия. Она является результатом полного слияния нескольких родственных славянских племён - кривичей, дреговичей, родимичей и других, входивших в состав группы западно-русских славян. Позже

- уже в XIV, XV и XVI ст. - белоруссы, ставшие волею судеб главной составной частью Литовского государства, сумели создать собственную цивилизацию, которая оказалась столь сильной, что даже литовцы - народ, не имевший абсолютно никакого этнического родства со славянами, - приняли эту цивилизацию всецело. В означенный период белорусский язык стал государственным и литературным языком на всем пространстве Великого Княжества Литовского, о чем свидетельствует огромное количество как письменных, так и печатных памятников, среди которых особенно видное место занимает свод законов Литовского государства, первоначально рукописный, а после дважды изданный по-белорусски. "Литовский Статут" - это лучшее доказательство, как сильна должна была быть белорусская общность, если литовцы приняли даже юридические нормы белоруссов. Но уже в XVII ст. полное господство белорусской цивилизации прекращается вследствие неблагоприятного уклада социально-политических отношений и разных других причин. Все более и более усиливается влияние на Литву поляков и польской цивилизации. К концу XVII ст. белорусские интеллигентные классы почти совершенно полонизировались, и с тех пор единственным носителем и хранителем национальной души, родного языка и всех индивидуальных белорусских особенностей являлись белорусские народные массы.

Но денационализация интеллигенции народа, - как это показали, например, чехи, - не решает вопроса о жизни или смерти этого народа. Поэтому и белорусский народ не умер, несмотря на то, что в течение свыше двухсот лет все лучшие силы, все более выдающиеся личности, вышедшие из белорусской среды, поглощались польской или русской цивилизацией. Вырабатывавшаяся веками индивидуальность народа сказалась в том, что эти личности, внося свои национальные особенности в культурную сокровищницу поляков и русских, весьма сильно влияли на направление, по которому шло дальнейшее развитие культуры обеих народов. Общеизвестно, например, колоссальное влияние Мицкевича на формирование национальной души* польского народа; а ведь Мицкевич, вышедший из

* У гэтым і ў іншых выпадках усё падкрэслена Антонам Луцкевічам. - А.С.

ополяченной белорусской дворянской семьи, рожденный и воспитанный на белорусской земле, всей своей психикой был неразрывно связан с белорусским народом и отражал в себе белорусскую национальную душу. Имя Мицкевича в этом отношении не является единственным, но и его достаточно: что белорусы, работавшие для создания польской национальной культуры, должны были хотя и совершенно безсознательно, вносить в нее свои национальные начала, - это совершенно не требует доказательств и понятно само собой.

Не будем также доказывать влияние обрусевших белоруссов на русскую культуру, которое несомненно. Приведем только следующий интересный взгляд на этот вопрос русского литератора профессора Овсянико-Куликовского. По его мнению, собственно-великорусской (московской) культуры нет; и ее нельзя отождествлять с тем, что мы обыкновенно называем русской культурой. Дело в том, что, - как результат психологического синтеза национальных особенностей трех обособленных племён группы русских славян: великоруссов, украинцев и белоруссов - возникла как будто четвертая русская национальность - российская интеллигенция, которую Овсянико-Куликовский называет общероссами. Равным образом, русский (российский) язык, хотя в основании его лежит московское наречие, принял массу совершенно чужых для последнего слов и оборотов, достиг высокой степени развития и стал мировым языком. Над созданием этого языка, - говорит Овсянико-Куликовский, - украинцы и белоруссы работали (конечно, невольно или безсознательно) чуть ли не столько же, сколько великоруссы, внося свои вклады не только в виде родного языка, но и в виде прочих индивидуальных черт своей национальности. Мало того, Овсянико-Куликовский даже самое существование и развитие "общеросской" культуры ставит в зависимости от существования названных выше ее первоисточников и от постоянного притока из них свежих сил*.

* См. Овсянико-Куликовский. Н.В.Гоголь. - издание "Вестник Воспитания", 1903. Приведённую теорию Овсянико-Куликовского оставляем на его личной ответственности. (Заўвага А.Луцкевіча.)

Если белоруссы, лишенные в течение столь продолжительного времени возможности развиваться самостоятельно, как национальная единица, сумели оказывать такое сильное влияние на два родственных народа, которые в культурном отношении гораздо сильнее их самих, - то не подлежит никакому сомнению, что белорусский народ обладает большим запасом жизненной силы. Историческое прошлое и эта жизненная сила и послужили основанием для современного национального движения белоруссов, равно как является порукой того, что движение это серьезное и имеет несомненное будущее.

III. Когда польское влияние лишило белорусскую интеллигенцию классов, общий колорит жизни белорусского края мало изменился. Удивительным образом ополячившаяся белорусская шляхта сумела примирить в себе польский государственный патриотизм с патриотизмом местным, провинциальным; даже сражаясь за Речь Посполитую, эта шляхетская масса не чувствовала особенной близости к обывателям Царства Польского - настоящим полякам - и сохраняла чувство белорусского (или, как обыкновенно говорили по старой памяти, литовского) гражданства. А на plebs белорусский обращали слишком мало внимания, чтобы заняться планомерной полонизацией его. Так было не только до, но и значительное время после раздела Польши. Под властью России первоначальное положение почти не изменилось, только интерес к белоруссам в этот период оживился. Сначала только польские этнографы обратили своё внимание на этот народ, конечно, с научной точки зрения. Затем заинтересовались ими и польские повстанцы, безуспешно пытавшиеся привлечь белорусскую массу на свою сторону в борьбе с русским правительством. Русская же государственная политика оказалась последней, а русская наука занимается белоруссами серьёзно 3-4 последних десятка лет.

В жизни Белоруссии произошел крутой переворот только во второй половине XIX ст., когда правительство начало правильную кампанию против польского элемента в так называемом Северо-Западном крае. Правительство решило уничтожить здесь всё польское, считая Белоруссию "исконни русским" краем, а так как признаки национальные и вероисповедальные часто смешиваются и даже отождествляются, то все репрессии направлялись

одновременно против поляков и против всех вообще католиков, следовательно и против части католической белоруссов*

Кроме посредственных, на белоруссов посыпались и непосредствено против них направленные репрессии, начиная с запрещения в 60-х годах печатать книги на белорусском языке. В то же самое время поляки, в страхе за самое свое существование в Белоруссии, решительно стали вести полонизационную работу, считая, что численным увеличением "польского" элемента за счёт белоруссов можно будет компенсировать потери, понесенные благодаря правительственным мероприятия. И вот, для белорусского национального дела наступили, пожалуй, наихудшие времена: белоруссы попали под перекрёстный огонь двух воюющих сторон - поляков и русских.

В своей денационализаторской работе русское правительство располагало и располагает крупными орудиями: это - обрусительная военная служба, церковь православная и школы, весь административный аппарат с массой импортаваных из середины России чиновников-великоруссов, наконец, переселения великорусских крестьян-староверов в белорусский край. Такими же средствами стараются действовать в Белоруссии и поляки: в их руках находится католическая церковь; они заводят польские начальные школы; во все общественные и частные учреждения, находящиеся в руках поляков, принимаются исключительно поляки, при чем даже белоруссы-католики не имеют туда доступа; наконец, польские помещики этого края выписывают польских крестьян (мазуров) местами в качестве сельских рабочих, местами для колонизации ими белорусских земель.

Вот обстановка при которой начало делать и делает первые свои шаги белорусское движение, развивающееся на наших глазах. Правда, движение это подготовлялось в течение чуть ли не ста лет: на всём протяжении XIX в. мы видим попытки возстановления белорусской письменности; но только те из них, которые имели место в 80-х годах, находятся в непосредственной связи с современной нам

---

* Белоруссы по вероисповеданию делятся на 2 группы: одна - католическая, состоящая из 2 млн. человек, другая - православная, состоящая из 6 млн. (Заўвага А.Луцкевіча.)

работой над возрождением белорусского народа, - а все предыдущие носят характер чистой этнографии. Правда и то, что первый горячий призыв держаться всего родного, любить свою "бацькоўшчыну - Беларусь", свою "простую мову" был сделан поэтом-народником Ф.Богушевичем в 80-х годах. Правда, наконец, что с этого времени среди белорусской университетской молодежи не прекращается национальная работа в форме кружков, издания белорусских книг и т.п. Но действительно народным белорусское движение стало лишь со времени освободительного движения в России в 1904-1905 г., а потому период белорусского национального возрождения можно считать лишь годами.

Существует неразрывная связь между национальным сознанием данного индивида и его сознанием человека и гражданского достоинства. В белорусском движении эта связь проявилась особенно ясно. На самом деле белорусская национальная работа дореволюционного периода сводилась к облагораживанию всего "родного" в духе заветов Богушевича. Следствием было то, что среди белоруссов мало-помалу зарождалось сознание личного достоинства, уважение к самому себе, которое было совершенно атрофировано предыдущим пренебрежением со стороны единственных интеллигентов, которых белорусс знал – пана и чиновника – к "простой мове" белорусса, к его национальным проявлениям. Так подготовлялась почва для восприятия идей о правах человека и гражданина, посеянных революцией. А в свою очередь, революция, когда мужика на один момент поставили в положение человека равного всем прочим, когда с ним о его нуждах заговорили на его родном языке – ускорила развитие в нем национального чувства.

Условиями, при которых началось пробуждение белорусской народной массы, предопределилось – по крайней мере на ближайшее время, - то направление, по которому должно было идти белорусское национальное движение. Это направление – спокойная творческая работа над созданием своей национальной культуры, основанная на началах чисто демократических и потому лишенная национального шовинизма и человеконенавистничества.

Спокойная творческая работа на началах истинного демократизма, без тени национального шовинизма, без человеконенавистничества – это путь, от которого

белорусское национальное движение до сих пор не отклонилось ни на шаг.

Национальные идеалы, которые слагались в уме белорусского крестьянина и полуинтеллигента на основании горячих митинговых речей и громких, красивых фраз прокламаций белорусских, были очень смутны, расплывчаты и побуждали более живые умы доискиваться серьезного обоснования их. Летучие листки, копеечные брошюры стали недостаточной пищей для тех, кто уже начал национально прозревать . И вот в 1906 г. были сделаны две попытки дать более солидную пищу алчущим: в Петербурге основалось белорусское издательское товарищество "Загляне сонца і ў наша ваконца", сразу приступившее к изданию лучших произведений на белорусском языке – белорусских "классиков"; в Вильне открылась первая белорусская газета "Наша Доля", просуществовавшая, впрочем, лишь около двух месяцев и закрытая ввиду систематических конфискаций (из 6 номеров – 5 конфисковано) за революционное направление. Все же газета сделала очень много: сам факт появления белорусской периодической печати привлёк к реальной работе для национального дела массу людей, доказав им, что эта работа вполне возможна. День выхода первого номера был как бы торжеством белорусской идеи.

Вообще 1906 г., замкнувший период революции в белорусском крае, был для белоруссов боевым в национальном отношении. В этом году начала более или менее правильно организовываться белорусская народная – деревенская и местечковая интеллигенция (правильнее полуинтеллигенция); основался белорусский союз народных учителей*, кадры которых в Белоруссии составляются из крестьянских сынов, воспитываемых в учительских семинариях и институтах в духе русского (российского) национализма; движение захватывает и самые институты и семинарии для учителей, и вот воспитанники четырех учительских семинарий образовывают свой союз с национальной белорусской окраской, подвергшийся очень суровым гонениям. Нечего и говорить, какое значение имели эти факты: значительная часть молодых народных

---

* Основатели отбывают в Москве трёхлетнее заключение в крепость. (Заўвага А.Луцкевіча.)

учителей – наиболее энергичных, которые предназначались для "обрусения" края – начала пропаганду белорусских национальных идей. Началось движение и среди учащихся духовных семинарий, особенно православных, имевшее, впрочем, одно не совсем удачное для национального дела последствие: более сознательные православные семинаристы не пошли в священники, а все устремились в высшие учебные заведения и этим лишились возможности работать в деревне.

Все, что делалось в эти годы, делалось еще по инерции, полученной от общего подьёма в революционный период, но с началом реакции общий размах слабеет. При виде крушения общероссийского освободительного движения у всех опускаются руки, слабеет вера в успех начатой работы, пропадает воодушевление, естественное при взрыве национального движения. В это время в Вильне начала выходить новая белорусская газета – еженедельник "Наша Ніва", которая, начиная с самого конца 1906 г. продолжает беспрерывно выходить и теперь. Вопреки общему апатичному настроению, группа более стойких и твёрдых людей, приступивших к изданию "Нашай Нівы", считала, что для национального дела не всё потеряно, раз можно издавать книги и газеты на белорусском языке. "Наша Ніва" - это первая после революционного движения серьёзная попытка вести спокойную культурно-национальную работу среди белоруссов.

Целью своей газета объявила: работать для культурного и экономического поднятия белорусского края и народа, развивать у белоруссов национальное самосознание, воспитывать чувство человеческого и гражданского достоинства, крепко сплотить все разрозненные религиозным антагонизмом части одного национального целого (православных и католиков), развивать национальную душу белорусского народа. Конечно, эффект от выхода "Нашай Нівы" не мог равняться в первое время с тем эффектом, какой при тогдашних обстоятельствах производила ярко-"красная" "Наша Доля", ещё в то время существовавшая.

Но всё же газета была сразу так поставлена, что пошла в народ и дошла до него. Мало-помалу шла серьёзная работа в более живых крестьянских умах: в душе белорусса, который столько времени находился в положении

безправного раба и уже начинал отрекаться от всего родного, стыдиться своего языка и т.д., более и более укреплялось сознание, что и он - человек. Белорусская книга, белорусская газета стали для него необходимостью. И вот постепенно "Наша Ніва" становится как бы выразительницей всё более крепнущего белорусского народного движения. Из самых отдаленных уголков Белоруссии, куда только дошла газета или известие о ней, поплыли письма и корреспонденции, написанные мозолистой рукой мужика-хлебороба, местечкового ремесленника, народного учителя и т.п. Как подсчитала и опубликовала сама Редакция, в течение трех первых лет существования газеты – лет наиболее тяжелого гнёта реакции – в "Нашай Ніве" (115 номеров) было напечатано 960 собственных оригинальных корреспонденций из 489 местностей - деревень и местечек Белорусского края. И необходимо отметить, что ни за корреспонденции, ни за расходы по пересылке их корреспонденты – в большинстве крестьяне не получают ни копейки. Газету они считают своей. Фактически, такой взгляд на "Нашу Ніву" вполне обоснован: она стала выразительницей всего народного белорусского течения, стала как бы его собственностью, подобно зеркалу, она отражает в себе всю жизнь белорусской деревни, является голосом не Редакции только, а всего сознательного белорусского "громадзянства" – сознательной части "простого" народа.

Белорусс издревле был склонен высказывать все свои душевные движения, все переживания, надежды и желания преимущественно в песне, что доказывают весьма богатые собрания народных поэтических произведений. Эта склонность, по-видимому, не атрофировалась доныне: число белорусских поэтов из народа страшно велико. Понятно, среди них есть поэты и "поэты", но всего, печатавшихся в "Нашай Ніве" за первые 3 года, насчитывается 61 поэт, и написали они 246 стихотворений; число же не попавших в печать, безусловно, ещё значительнее. Первое место среди настоящих поэтов "Молодой Белоруссии" принадлежит, несомненно, Януку Купале. Это - молодой человек, вышедший из крестьянской хаты, без всякого образования, получивший "воспитание"... в качестве рабочего на помещичьем винокуренном заводе и обладающий при всем

----------------------------------------------------------------------------------------------
этом такой творческой интуицией, такой лёгкостью и разнообразием формы, что, пожалуй, со временем станет белорусским Шевченкой. Еще отметим имена Якуба Коласа, народного учителя, Максима Богдановича и др. В области прозы за те же 3 года в "Нашай Ніве" находим 36 авторов, давших 91 произведение (оригинальное).

Наряду с энергично действующим Петербургским издательским товариществом "Загляне сонца і ў наша ваконца" работают ещё три новые: в Минске – "Мінчук", в Вильне – "Наша хата" и издательство "Палачанін". Особенную энергию в издательском деле в крае проявляет названная "Наша хата" и редакция "Нашай Нівы". Издаются книжки для белорусской национальной школы (начальной), которая кое-где начинает прививаться, несмотря на запрещения правительства, открываются белорусские библиотечки. Открылся было учительский журнал на русском языке – "Белорусский учитель" – но пока вышел только один номер.

Последний 1910 г. характеризуется усиленным ростом белорусского движения. Этот год важен двумя приобретениями: это – белорусский театр и народные хоры. В Вильне, Петербурге, Гродно, Слуцке и т.д. создались драматические труппы любителей, создались творческие кружки публично исполняющие белорусские песни. Зародилась оригинальная драматическая литература. Собираются, разрабатываются и издаются песни белорусского народа, а мотивы, которых белорусс имеет огромное богатство, служат уже темами для больших симфонических произведений, пока ещё, к сожалению, небелоруских композиторов. Будируется вопрос о белорусском клубе в Вильне, Петербурге.

Наряду с работой над развитием национальной "души", среди белоруссов делаются попытки работать реально на экономической почве. Устраиваются всякого рода кооперативы – потребительские товарищества, ссудо-сберегательные кассы, сельскохозяйственные кружки, устраиваются выставки сельского хозяйства для крестьян, образцовые фирмы и т.п. Но эта деятельность встречает серьёзное противодействие: заводить кооперативы особенно в Вильне и Гродненской губернии становится почти невозможно вследствие препятствий со стороны местной администрации, действующей по указаниям "свыше".

В заключении обзора белорусского национального движения мы коснемся в нескольких словах и движения среди учащейся молодёжи и среди духовенства.

Учащаяся в высших и, частью средних учебных заведениях молодёжь принимает все более активное участие в национальной работе. Большинство кружков уже примыкает по своему направлению, пожалуй, ближе всего к течению "Нашай Нівы". Они занимаются чисто научной работой – изучение края и т.п., подготавливают почву для будущих научных белорусских институций, в том числе для музея, для которого частными лицами сделаны уже солидные собрания. Из университетских городов самым деятельным в отношении белорусской национальной работы является Петербург, куда собираются лучшие силы белорусской молодёжи.

Что касается духовенства, то православное настолько твёрдо держат в своих руках черносотенные владыки, что священники, даже сочувствующие белорусскому возрождению, боятся чем-либо проявлять публично свое сочувствие. К тому же приток молодых священников, которые стали сознательными белоруссами ещё во время обучения в семинариях, очень слаб, потому что, как мы выше сказали, все они стремятся в университеты. И все же, как это ни странно, в черносотенном лагере поднимался серьезно вопрос о том, чтобы уроженцев Белоруссии переводить на места священников в Центральную Россию, - а вместо них присылать в белорусские приходы великоросских священников: местные, дескать, недостаточно энергичны в деле "обрусения" края.

Лучше обстоит дело с католическим духовенством. Пример ли движения среди литовских ксендзов тут действует, или католические власти церковные либеральнее в этом отношении, чем православные владыки – последнее, впрочем, очень и очень проблематично – трудно сказать. Одно только можем констатировать: среди молодых ксендзов (равно как и в семинариях и в духовных академиях ) попадаются чаще и чаще сознательные белорусские патриоты. Они начали местами – в глухой провинции – говорить проповеди на белорусском языке, издали уже 2 катехизиса по-белорусски.

Между прочим, большую услугу белорусскому делу оказывают - литовские ксендзы-патриоты, живущие в

белорусских приходах. Дело в том, что виленские епископы-поляки, не сочувствующие литовскому национальному движению, идущему в разрез с интересами поляков на литовской территории, стараются систематически устранять из литовских приходов тех ксендзов-литовцев, которые деятельно работают над возрождением своего народа. Таких ксендзов обыкновенно назначают в Белоруссию. Тут, не зная белорусского языка, они невольно долгое время являлись полонизаторами белоруссов, так как употребляли при сношениях с народом исключительно польский язык. Теперь же, когда началось белорусское движение, литовские ксендзы поняли свою роковую роль и стараются исправить невольное зло, которое в течение многих лет делали белоруссам. Теперь они являются ревностными сеятелями в народе национального сознания, и за это им большое спасибо!

В последнее время ксендзы-белоруссы собираются издавать клерикально-национальную белорусскую газету. С её появлением в белорусском движении может создаться новое течение – клерикально-патриотическое, которое должно бы дать толчок к такой же работе и православному духовенству.

Изложенные проявления белорусского национального движения объединены между собой одной общей целью: эта цель – национальное возрождение белорусов, горячее желание развить национальную индивидуальность этого народа, создать для него свою собственную, самостоятельную культурную жизнь. Этой же целью воодушевлены и белорусские сознательные ксендзы. Но наряду с этим широким течением, захватывающим все новые и новые позиции, мы замечаем и некоторые особые струйки, направляющиеся в совершенно другие стороны.

Отметим, во-первых, ещё одно клерикальное течение. Поскольку описанное выше ставит на первом плане идеалы национальные, работает propter patria, постольку второе работает исключительно propter Christo. Ïðåäñòàâèòåëè ýòîãî âòîðîãî òå÷åíèÿ, íà÷èíàÿ ñ áывшего âèëåíñêîãî епископа áàðîíà Ðîïïà, смотрят на белорусский язык как на могущественное средство для проведения в народные массы своих целей. Но это течение очень слабое. Польское большинство клира не соглашается на такое косвенное поддержание столь несимпатичного для поляков белорусского движения. Поэтому и проект этой группы

издавать свой журнал на белорусском языке, кажется, отложен ad infinitum.

Столь же органически чуждым белоруссам является и черносотенно-обрусительное течение. Это – так сказать – "частное" издание правительственной политики. В Вильне существует общество под фирмой "Крестьянин", которое за деньги, жертвуемые "неизвестными" лицами, издаёт на русском языке программного характера журнальчик под названием "Крестьянин", посвящённый белорусским крестьянам и от их имени выступающий. Цель журнала – противодействовать развитию национального самосознания у белоруссов, "частным" образом работать для денационализации края и изображать "голос народа и народных учителей", как понадобится черносотенным партиям, г.г. Замысловским и т.п.

От имени же учителей белорусских говорит "Крестьянин" на том основании, что вокруг него всегда вращается несколько человек учителей, желающих получить лучшее местечко и ради этого или иных выгод, записывающихся в черносотенную организацию.

Года два тому назад часть членов общества "Крестьянин" – его левое крыло, пожалуй, действительно, отличающееся некоторыми искренними демократическими чертами – откололось, так как видело безуспешность работы "Крестьянина". Эта группа начала было издавать свой орган, в котором, взамен за отречение белоруссов от своей национальной индивидуальности, обещала добиваться для белорусского края разного рода экономических благ, правильной постановки просветительского дела (конечно, на государственном языке) и т.п. Но газета, после выпуска первого номера, кстати, конфискованного цензурой, закрылась, и это течение погибло.

К черносотенно-обрусительному течению примыкают крестьянские депутаты III Государственной Думы. Да это и понятно: закон 3 июля поставил выборы в такие условия, что сознательным белоруссам нечего было и думать попасть в депутаты. И это величайший урон для белорусского дела: ведь по отзывам местных "народных представителей" Государственная Дума и русское общественное мнение судит о нуждах белорусского народа, а каковы эти отзывы – понятно само собой.

* * *

KAMUNIKAT.org

# РЭЦЭНЗІІ

## *Zasztowt L.* ***Kresy. 1832-1863. Szkolnictwo na ziemiach litewskich i ruskich dawnej Rzeczypospolitej.*** *Warszawa, 1997. - 456 s.*

У 1997 г. убачыла свет грунтоўнае даследаванне Л.Заштаўта, прысвечанае гісторыі асветы на землях т.зв. "крэсаў" у 1832- 1864 гг.

Паняцце "крэсы", вынесенае аўтарам у загаловак работы, мае ў польскай гістарыяграфіі і публіцыстыцы своеасаблівае значэнне. На яго наклала свой адбітак характэрнае для ментальнасці "сярэднестатыстычнага" паляка "рамантычнае" ўяўленне аб тэрыторыі Беларусі, Украіны і Летувы як даўнейшых польскіх землях, страчаных у выніку гістарычных катаклізмаў. У рабоце Л.Заштаўта генезісу гэтага тэрміна і ягонай геаграфічнай лакалізацыі прысвечаны адмысловы раздзел. Паняцце "крэсаў" у значэнні тэрыторыі былога ВКЛ і праваўзбярэжнай Украіны ў польскай свядомасці пачало фармавацца на мяжы 19 і 20 ст. і набрала поўны семантычны змест у часы ІІ Рэчы Паспалітай. Не апошнюю ролю ў гэтым адыграла польская мемуарыстыка і мастацкая літаратура, найперш, творы Г.Сянькевіча. Тэрмін "крэсы" больш адпавядае побытавай свядомасці і палітычнай лексіцы. Разам з тым, як справядліва адзначыў Л.Заштаўт, польская навука да гэтага часу не пазбавілася погляду на беларускія, летувіскія і ўкраінскія землі як на частку былых польскіх тэрыторый, як на "крэсы" польскага нацыянальнага руху і польскай культуры. Гэты пункт гледжання, які сфарміраваўся ў міжваеннае дваццацігоддзе, і сёння застаецца характэрным для шэрагу паланістаў.

Погляд на гісторыю і культуру ВКЛ, як на частку польскай гісторыі і культуры з некаторым "адценнем"

рэгіяналізму, мае свае карэнні не толькі і не столькі ў нейкім польскім шавінізме. Высоўванне на першы план у разглядзе гісторыка-культурнага працэсу ролі "палітычнага народа", г.зн. прывілеяваных колаў насельніцтва ВКЛ і найперш паланізаванай шляхты выкрэсліла з поля бачання даследчыкаў-паланістаў шматмільённыя масы беларускага і летувіскага сялянства і мяшчанства. Гісторыя "крэсаў", такім чынам, падавалася як гісторыя спаланізаванай шляхты і каталіцкага святарства, з невялікімі дадаткамі гісторыі літоўскіх яўрэяў, украінскага казацтва і г.д. Толькі ў апошні час польская гістарыяграфія нарэшце "знайшла" ў мінулым былой Рэчы Паспалітай вытокі беларускай, летувіскай, украінскай гісторыі і прызнала права гэтых народаў на агульную з палякамі гістарычную спадчыну[1]. Кніга Л.Заштаўта - адзін з прыкладаў такога падыходу да аналізу гісторыка-культурнага працэсу на тэрыторыі былога ВКЛ, якая ў даследуемы аўтарам перыяд была часткай Расійскай імперыі.

У польскай гістарыяграфіі вывучэнне гісторыі асветы на тэрыторыі Беларусі і Летувы 19 ст. мае працяглую традыцыю. Яшчэ ў мінулым стагоддзі ўбачылі свет працы, прысвечаныя Віленскаму універсітэту. Сёння падобныя распрацоўкі можна лічыць дзесяткамі. З грунтоўных работ апошняга дзесяцігоддзя варта ўзгадаць манаграфію Д.Бавуа, напісаную вядомым французскім даследчыкам у традыцыях польскай гістарыяграфіі[2]. Праца Л.Заштаўта з'яўляецца працягам і адначасова дапаўненнем гэтай манаграфіі, што прасочваецца не толькі ў храналогіі, але і ў структуры абодвух работ.

Храналагічныя рамкі работы Л.Заштаўта выходзяць далёка за межы, пазначаныя ў назве. Польскі навуковец зрабіў кароткі агляд развіцця асветы на землях былога ВКЛ,

---

[1] Напрыклад, **Bardach J. O dawniej i niedawniej Litwie. Poznań,1988.**

[2] **Beauvois D. Szkolnictwo polskie na ziemiach litewsko-ruskich. T. 1-2. Rzym - Lublin, 1991.**

пачынаючы з часоў дзейнасці Камісіі Народнай Адукацыі Рэчы Паспалітай. Адмысловую ўвагу ён надаў гісторыі Віленскага універсітэта і Віленскай навучальнай акругі. Дзейнасць Медыка-хірургічнай акадэміі і Духоўнай семінарыі ў Вільні, Кіеўскага універсітэта Св.Уладзіміра разглядаецца як працяг традыцый, закладзеных у першай трэці 19 ст.

Трэба адзначыць, характэрную для польскіх гісторыкаў, грунтоўную гістарыяграфічную базу даследавання. Абапіраючыся на працы сваіх папярэднікаў, Л.Заштаўт уводзіць у навуковы зварот значную колькасць архіўных матэрыялаў, пераважна, з РГИА і **LVIA**. Храналогія выкарыстаных архіўных матэрыялаў і мемуарыстыкі выходзяць далека за межы даследуемага перыяду.

Гісторыя асветы на землях былога ВКЛ у манаграфіі Л.Заштаўта (як, дарэчы, і ў згаданай вышэй працы Д.Бавуа) падаецца на фоне агульнага стану асветы ў Расійскай імперыі. У манаграфіі ёсць тое, што звычайна адсутнічае ў работах беларускіх навукоўцаў, а менавіта апісанне ўстаноў асветы ўсіх узроўняў на паўднёвых, паўночных і заходніх ускраінах імперыі і кароткія біяграфіі іх кіраўнікоў. Праўда, беларускі гісторык, пэўна, не можа цалкам пагадзіцца з усімі ацэнкамі Л.Заштаўта. Прычына хаваецца ў розных пунктах погляду. Нацыянальныя інтарэсы беларусаў і палякаў нетоесныя.

Каштоўнасць манаграфіі Л.Заштаўта для даследаванняў беларускай гісторыі не выклікае сумнення. Найперш, яна ўтрымлівае вельмі падрабязны, амаль вычарпальны факталагічны матэрыял аб школьных установах Беларусі 19 ст. Прычым прадметам даследавання сталі амаль усе тыпы школ - ад універсітэта да народнай школы. На жаль, адсутнічае толькі матэрыял аб яўрэйскай адукацыі, якая да 1844 г. мела на нашых землях своеасаблівую аўтаномію. Адсутнічаюць звесткі і пра ваенныя корпусы (Полацкі і

Берасцейскі), якія ў той час выконвалі не толькі адукацыйную, але і палітычную ролю.

Гісторык прааналізаваў колькасць навучальных установаў і яе дынаміку на працягу першай паловы стагоддзя, матэрыяльны стан асветы, навучальныя планы і праграмы, склад выкладчыцкага корпуса, штодзённае жыццё гімназій і вучылішчаў і інш. Адмысловая ўвага была нададзена рэарганізацыям школьнай сістэмы, якіх багата было ў той час. Л.Заштаўт падрабязна спыніўся на мерапрыемствах, якія ішлі ў рэчышчы нацыянальнай палітыкі ўрада. Таксама, як і ў ацэнках персаналій, гісторык выступіў з пазіцыі польскіх нацыянальных інтарэсаў. Дзеянні ўладаў па абмежаванні польскай асветы ён ацаніў адмоўна. Лёс беларускай, украінскай і летувіскай культуры пры гэтым у разлік не прымаўся.

Адным з вынікаў "палонацэнтрычнага" погляду на гісторыю Рэчы Паспалітай з'яўлялася не толькі ігнараванне ў ёй ролі народаў ВКЛ, але таксама адсутнасць у польскіх навукоўцаў цікавасці да тых даследаванняў, якія праводзяцца беларускімі, летувіскімі і ўкраінскімі гісторыкамі. Калі ў дачыненні да летувіскай гістарыяграфіі гэтае становішча пастунова пераадольваецца, то беларуская гістарычная навука дагэтуль для большасці польскіх даследчыкаў застаецца "terra incognita". Гэта датычыць не толькі навуковых распрацовак, але таксама публікацый крыніц. Некаторыя з іх былі б вельмі дарэчы для польскіх калег, улічваючы, што матэрыялы беларускіх архіваў яны, звычайна, ведаюць слаба. Такі прабел існуе, на жаль, і ў працы Л.Заштаўта. З работ беларускіх калег польскі гісторык выкарыстаў толькі кнігу М.Улашчыка "Предпосылки крестьянской реформы в Литве и Западной Белоруссии". Па-за ўвагай засталіся працы А.Цвікевіча, Д.Карава, кнігі Г.Кісялёва і Г.Каханоўскага, і яшчэ некалькі грунтоўных беларускіх даследаванняў. Магчыма, што ў гэтым выпадку прызнанне права беларусаў на гісторыю "крэсаў" не толькі б дэкларавалася ва ўступным раздзеле

разглядаемай кнігі, але было б рэалізавана ў ацэнках і высновах .

Безумоўна, выданне кнігі Лешка Заштаўта ў перакладзе на беларускую мову карысталася б вялікім попытам не толькі ў навукоўцаў, але таксама сярод настаўнікаў і краязнаўцаў.

Святлана Куль-Сяльверстава (Гародня)

* * *

## Szwarc A. Od Wielopolskiego do Stronnictwa Polityki Realnej. Zwolennicy ugody z Rosją, ich poglądy i próby działalności politycznej (1864-1905). Warszawa, 1996. - 332 s.

Аб'ектам даследавання Анджэя Шварца стаў згодніцкі (**ugodowy**) накірунак польскага руху ў межах Расійскай імперыі на працягу наступных 40 год пасля паўстання 1863-1864 гг. Сваю ўвагу аўтар засяродзіў пераважна на дзейнасці згоднікаў з Каралеўства Польскага і з кола рэдакцыйнай суполкі польскай газеты "Край", якая выдавалася ў Пецярбургу з 1882 г.

Даследаванне грунтавалася на досыць шырокай базе крыніц. Гэта праграмныя дакументы згоднікаў, матэры-ялы з іх асабістых архіваў ( напрыклад, з архіва рэдактара "Края" Эразма Пільтца), успаміны (у тым ліку "беларуска-летувіскіх" згоднікаў Эдварда Вайніловіча, Іпаліта Корвін-Мілеўскага, Канстанціна Скірмунта і Аляксандра Мейштовіча), польская публіцыстыка ("Край", варшаўскае "Слова", кракаўскі "Час" і інш.), руская публіцыстыка ("Новое время", "Московские ведомости", "Виленский вестник", "Киевлянин" і інш.), дакументы расійскай мясцовай адміністрацыі, цэнтральных дзяржаўных установ і

інш. Варта адзначыць, што ў якасьці гістарычнай крыніцы былі выкарыстаны (і даволі ўдала) мастацкія творы (аповесці Вацлава Гансяроўскага ("**Ugodowcy**". Львоў, 1901) і Юзафа Вайсэнхофа ("**Sprawa Dołęgi**". Варшава, 1901)).

Аўтар прааналізаваў амаль усю польскую і расійскую навуковую літаратуру, у якой закраналіся праблемы згодніцтва ў польскім руху канца 19-пачатку 20 ст.

На пачатку даследавання А.Шварц спыніўся на самым паняцці "згодніцтва". Ён прапанаваў адрозніваць "згодніцтва" як палітыку кампрамісу ці паразумення з уладамі дзеля абароны інтарэсаў польскага этнасу, ад "лаялізму" як адмаўлення ад польскай мовы і каталіцкай рэлігіі дзеля асабістых інтарэсаў. Падобны падзел паспрыяў больш адэкватнаму адлюстраванню намаганняў і матываў дзейнасці згоднікаў. На думку аўтара, падзел паміж згодніцтвам і лаялізмам праходзіў праз адносіны да роднай мовы (шырэй: да роднай культуры) і роднага веравызнання. Адступніцтва пачыналася з адмаўлення ад польскай мовы і каталіцкай веры.

Даследчык звярнуў увагу на тое, што негатыўны вобраз "згодніка-калабаранта" быў уведзены ў масавую свядомасць агітатарамі і прапагандыстамі з ППС на рубяжы стагоддзяў. Гэты досыць далёкі ад рэчаіснасці стэрэатып, спароджаны палітычнай барацьбой, моцна перашкаджаў навукова-ўзважанай ацэнцы дзейнасці згоднікаў. Не меншую шкоду, па меркаванні А.Шварца, нанесла неабгрунтаванае перакананне ў тым, што феномен згодніцтва звязаны выключна з ідэалогіяй кансерватызму.

А.Шварц прааналізаваў эвалюцыю згодніцкай дактрыны, ахарактарызаваў людзей, якія ў розныя часы складалі "гвардыю" згоднікаў, і паказаў вынікі згодніцкай палітыкі.

На думку аўтара, эвалюцыя згодніцкай дактрыны ў вялікай меры вызначалася фактарамі знешнепалітычнага і ўнутрыпалітычнага становішча Расійскай імперыі. У другой палове 60-х гадоў 19 ст. згоднікі (Леапольд Кроненберг, Юліўш Энох, Аляксандр і Зыгмунт Велепольскія і інш.)

настойліва спрабавалі "завязаць" новыя кантакты з расійскім урадам. Іх мэтай было спыненне антыпольскіх рэпрэсій. Апроч традыцыйных гарантый палітычнай лаяльнасці згоднікі заяўлялі пра гатоўнасць "польскага боку" адмовіцца ад усялякіх прэтэнзій на тэрыторыю былога Вялікага Княства Літоўскага. Польскасць "зачынялася" ў межах Каралеўства Польскага.

Тэндэнцыі згодніцтва ўзмацніліся пасля разгрому Францыі Прусіяй і ўтварэння ў 1871 г. Германскай імперыі. Гэтыя падзеі, на думку А.Шварца, спрыялі росту сярод польскай грамадскасці пачуцця ўласнага бяссілля.

А вось згодніцтва другой паловы 70-х гадоў было звязана з надзеямі на перамены ва ўнутранай палітыцы Расіі ў сувязі з перамогай у вайне з Турцыяй. Галоўнай ідэяй новай дактрыны згодніцтва, якая выйшла з кола Эразма Пільтца і Владзімежа Спасовіча, было прызнанне за польскай культурай права на існаванне і ўраўнанне палякаў у правах з рускімі. У сваю чаргу польскі бок адмаўляўся ад ідэі аўтаноміі Каралеўства Польскага. Аўтары гэтай канцэпцыі казалі пра тую велізарную эканамічную карысць Расійскай дзяржаве, якую непазбежна прынясе супрацоўніцтва з палякамі (с. 134).

У ліпені 1882 г. у Пецярбургу пачала выходзіць польская газета "Край", якая стала адным з галоўных суб'ектаў палітыкі згодніцтва ў яе ліберальным варыянце. Аўтар меў усе падставы адзначыць вялікую папулярнасць "Краю" сярод польскай грамадскасці Летувы, Беларусі і Украіны. Газета мела ў гэтых рэгіёнах сваіх пастаянных карэспандэнтаў, і, звычайна, змяшчала шмат інфармацыі, якая датычыла эканамічнага і культурнага становішча. Дарэчы, вывучэнне публікацый "беларуска-летувіскіх" аўтараў можа даць каштоўныя звесткі па гісторыі Беларусі другой паловы 19 ст.

У 80-я-першую палову 90-х гадоў на пазіцыі вярхоў польскай грамадскасці моцна ўплываў фактар рэвалюцыйнага руху. У гэты час найбольш кансерватыўныя

элементы пачалі глядзець на царызм, як на адзінага выратавальніка той арыстакратычнай і шляхецкай Польшчы, якая з кожным днем усё больш належала мінуўшчыне. Страх перад рэвалюцыяй, які спалучаўся з атаясамліваннем групавога (арыстакратычнага) інтарэсу з патрыятызмам, прымушаў зноў і зноў шукаць кампрамісу з царызмам або нават станавіцца на шлях адступніцтва.

Напрыканцы 19 ст. згодніцкая дактрына выглядала наступным чынам: прызнанне этнаграфічнай і культурнай адметнасці палякаў з адпаведнымі наступствамі, роўнасць правоў палякаў з правамі іншых падданых Расійскай дзяржавы, распаўсюджванне на Каралеўства Польскае рэформ другой паловы 60-х-пачатку 70-х гадоў узамен за лаяльнасць у адносінах да манархіі і ўрада і добрасумленнае выкананне дзяржаўных абавязкаў ("нацыянальная адметнасць - дзяржаўная лаяльнасць") (с. 219).

Згоднікі з надзеяй успрымалі ўсе нават самыя нязначныя адступленні ўрада ад антыпольскай палітыкі. Аднак, як пераканаўча паказаў польскі даследчык, усе гэтыя "адступленні" з боку Пецярбурга звычайна дыктаваліся жаданнем даць як мага менш і атрымаць як мага больш. Найбольшыя ўплывы згоднікі мелі менавіта напрыканцы 19 ст. Але нічога яны так і не дасягнулі. Прапольскія заявы некаторых вышэйшых чыноў дзяржавы тлумачыліся амаль выключна германафобіяй. На пачатку 20 ст. няўдача згодніцкага курсу стала відавочнай. Згоднікі падвергліся моцнай крытыцы з боку польскіх нацыянальных дэмакратаў і сацыялістаў.

У апошнім раздзеле сваёй працы ("У абароне. 1901 - 1905.") А.Шварц амаль упершыню звярнуў увагу на сітуацыю ў Беларусі, Летуве і Украіне (у тэксце: "на землях літоўска-рускіх"). На яго думку тут увесь час дамінавалі настроі лаялізму (адступніцтва), і нават палітыка згодніцтва здавалася занадта радыкальнай. На погляд гісторыка, да гэтага прычынілася моцнае перакананне ў дарэмнасці ўсялякіх спроб арганізаванага супрацоўлення, адмова дзеячаў Каралеўства Польскага абмяркоўваць з уладамі

"польскае пытанне" ў "Заходнім краі", пэўная гаспадарчая і грамадская адсталасць і, нарэшце, "феадальна-кансерватыўная ментальнасць", якая была характэрна для большасці мясцовых польскіх землеўладальнікаў (с. 282-283). Даследчык адзначыў пачуццё страха перад этнічна-культурнымі рухамі на беларускіх, летувіскіх і ўкраінскіх землях.

У гэтым месцы з аўтарам можна паспрачацца. А.Шварц не заўважыў істотнай розніцы паміж пазіцыяй польскіх землеўладальнікаў беларуска-летувіскага краю і пазіцыяй памешчыкаў Украіны. Між тым розніца была. Дастаткова прааналізаваць праграмы польскіх губернскіх выбарчых камітэтаў падчас выбараў да I і II Дзяржаўнай думы, выступленні польскіх дэпутатаў ад Беларусі і Летувы ў Думе і Дзяржаўным савеце і інш. Таксама варта прывесці характарыстыку, якую даў польскім дэпутатам ад Украіны ў I Думе іх калега па фракцыі, дэпутат ад Мінскай губерні Аляксандр Лядніцкі. Вядомы адвакат і дзеяч Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі ў лісце да прафесара Мар'яна Здзехоўскага ахарактарызаваў "украінскіх" прадстаўнікоў як "сапраўдных феадалаў і абсалютна апалітычных людзей" **(Lednicki W. Pamiętniki. T. 1. Londyn, 1963. S. 570).** У тым самым лісце дзейнасць польскіх дэпутатаў ад Беларусі і Летувы атрымала станоўчую ацэнку кадэцкага палітыка.

А.Шварц чамусьці не звярнуў увагу на дзейнасць адной з буйнейшых польскіх гаспадарчых установ канца 70-х гадоў 19 ст. - пачатку 20 ст. Мінскага сельскагаспадарчага таварыства. Між тым, знаёмства з дзейнасцю Таварыства і з асобай ягонага фактычнага кіраўніка Эдварда Вайніловіча абвяргае тэзіс пра "грамадскую і культурную адсталасць". У свядомасці сяброў Таварыства выразна прысутнічалі рысы буржуазнай ідэалогіі. "Феадальна-кансерватыўны менталітэт" праяўляўся пераважна ў форме пэўных патэрналісцкіх адносін да беларускага і летувіскага сялянства. Трэба звярнуць увагу і на актыўны ўдзел польскіх землеўладальнікаў беларуска-

летувіскага краю ў працы камітэтаў Асобай нарады аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці (1903), на вялізную колькасць зваротаў у абарону польскасці, з якімі стала магчымым звяртацца да ўраду на пачатку 1905 г., нарэшце, на падтрымку мясцовымі згоднікамі польскага культурнага руху. (гл. напрыклад: **Jałowiecki M. Dawne Wilno i ludzi zapomnieni. Londyn, 1955)**. У адрозненні ад польскіх памешчыкаў Украіны большасць палякаў беларуска-летувіскага краю помніла свае мясцовае паходжанне і асабліва не палохалася культурнага Адраджэння беларусаў і летувісаў. З часоў рэвалюцыі 1905-1907 гг. сярод іх пашыралася "краёвая ідэалогія", якая грунтавалася на ідэі палітычнай, а не этнічна-культурнай нацыі.

Наўрад ці даследчыкі маюць навуковыя падставы, каб заяўляць пра панаванне настрояў лаялізму (адступніцтва) сярод вярхоў польскай грамадскасці беларуска-летувіскага краю. Большасць з іх марыла пра пэўны кампраміс з уладамі, які б стварыў магчымасць нармальнага функцыянавання каталіцкага касцёла і развіцця польскай культуры. Не выпадкова вялікай сімпатыяй сярод іх карыстаўся "Край". І прысутнасць некалькіх дзесяткаў прадстаўнікоў польскіх землеўладальнікаў на адкрыцці помніку Кацярыне II у Вільні (верасень 1904 г.) была якраз актам згодніцтва. Большасць прысутных паверыла запэўненням міністра ўнутраных спраў князя П.Святаполк-Мірскага, што гэты ўчынак будзе мець напасрэдны ўплыў на стан польскасці ў краі.

Канешне, сустракаліся і канфармісты. Прыкладам можа служыць граф Ігнацы Корвін-Мілеўскі, які ў выступленні на з'ездзе аб'яднанага дваранства (1911) фактычна адрокся ад польскасці пад бурныя апладысменты прысутных. Але падобныя ўчынкі выклікалі амаль агульнае абурэнне.

У дзейнасці (і свядомасці) вярхоў польскай грамадскасці гістарычнай Літвы дамінаваў якраз згодніцкі накірунак. Цікава, што і А.Шварц у заключэнні ўсё ж

адзначыў пэўную ролю згоднікаў у польскім руху ў Беларусі і Летуве да пачатку першай святовай вайны (с. 308).

Праца польскага гісторыка развеяла стэрэатыпы, пра якія ішла гаворка на пачатку. Яна паказала, што вялікая частка польскай эліты шукала паразумення з Расіяй, а яе значная група паслядоўна падтрымлівала і прапагандавала палітычную праграму згодніцтва.

А.Шварц выдатна паказаў безвыніковасць усіх намаганняў згоднікаў, бо, як трапна заўважыў вядомы публіцыст таго часу Мікалай Карэяў, "у праваслаўнай Расіі, у якой кансерватыўныя элементы былі найбольш антыпольскімі, кансерватары-згоднікі не маглі знайсці падтрымкі" (с. 309).

Алесь Смалянчук.

* * *

## "Краёвасць: традыцыі згоды народаў у эпоху нацыяналізму". Міжнародная навуковая канферэнцыя. Познань (Польшча). 11-13 траўня 1998 г.

З 11 па 13 траўня 1998 г. у Інстытуце гісторыі Універсітэта імя Адама Міцкевіча ў Познані (Польшча) адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя гісторыкаў "Краёвасць: традыцыі згоды народаў у эпоху нацыяналізму" ("**Krajowość: tradycje zgody narodów w dobie nacjonal-izmu**"). Канферэнцыя была ініцыявана групай навукоўцаў Польшчы і Летувы (Ян Юркевіч, Алег Латышонак, Дарыюс Сталюнас). Ідэю падтрымала кіраўніцтва Познаньскага універсітэта. Галоўную арганізацыйную працу выканаў прафесар Ян Юркевіч.

Канферэнцыя была прысвечана праблеме краёвасці*.

* Краёвасць - гэта ідэалогія, якая была распрацавана ў Беларусі і Летуве на пачатку 20 ст. Яна грунтавалася на ідэі палітычнай нацыі. Краёўцы сцвярджалі, што ўсе карэнныя жыхары гістарычнай Літвы, незалежна ад іх этнічна-культурнай прыналежнасці, з'яўляюцца "грамадзянамі краю" і тым самым належаць да адзінай нацыі. У перыяд абвастрэння этнічных адносін краёвасць сталася ідэалогіяй нацыянальнага паразумення. Яна выразна супрацьстаяла этнічнаму шавінізму. Апроч гэтага краёвасць можна трактаваць і як рысу свядомасці часткі грамадства беларуска-летувіскага краю, які стаў Радзімай не толькі для беларусаў і летувісаў, але і для палякаў, яўрэяў, татар, рускіх. Розныя этнічна-культурныя патокі змешваліся, зліваліся і нараджалі ўнікальны тып "краёўца", які сапраўды адчуваў сябе грамадзянінам краю і мог адначасна належаць да двух ці нават да трох этнасаў.
Для беларускай гістарыяграфіі праблема краёвасці з'ўляецца вельмі цікавай яшчэ і таму, што яна непасрэдна датычыць праблемы

Праца канферэнцыі распачалася рэфератам прафесара Юліўша Бардаха (Варшава), які быў прысвечаны свядомасці насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага ў 17-18 стст. Вядомы польскі даследчык звярнуў увагу на тое, што ў свядомасці значнай часткі грамадства Беларусі і Летувы адчуванне ўласнай польскасці спалучалася з пачуццем пэўнай прыналежнасці да беларускага або летувіскага этнасу.

Дыскусію выклікала выступленне добра вядомага ў Беларусі гісторыка з Беластока Алега Латышонка. Ён спрабаваў знайсці агульныя рысы ў краёвасці і ў ідэалогіі "западноруссизма". Пераканаўчым ягоны рэферат назваць цяжка. Магчыма, спроба адшукаць падабенства паміж краёвасцю і "беларускім" варыянтам вялікарускага шавінізму была народжана пэўнай неакрэсленасцю паняцця краёвасці. Алег Латышонак "справакаваў" бурную дыскусію і, у пэўным сэнсе, задаў тон далейшай працы канферэнцыі.

Варта адзначыць высокі навуковы ўзровень дыскусій. Відавочна, гэтаму спрыяў досыць "камерны" характар канферэнцыі. Актыўны ўдзел у ёй прынялі 14 навукоўцаў з Польшчы, Летувы, Беларусі і Швецыі. Амаль усе яны здаўна цікавяцца праблемай краёвасці і маюць асабісты погляд на яе.

Шэраг рэфератаў быў прысвечаны асобным дзеячам краёвага руху. Так, летувіскія гісторыкі Рымантас Мікніс і Ян Савіцкі засяродзілі ўвагу на постаці аднаго з галоўных

---

фарміравання беларускай нацыі. Гісторыя краёўцаў і краёвасці пярэчыць абсалютызацыі тэзіса пра сялянскае паходжанне беларусаў. Прыклад таго ж Рамана Скірмунта сведчыць пра тое, што лічыць вярхі грамадства Беларусі цалкам страчанымі для беларускага руху нельга. Для многіх дзеячаў з "падвоенай" свядомасцю (ліцвін па паходжанню, паляк па нацыянальнасці) краёвасць была зыходным пунктам эвалюцыі ў накірунку беларускасці.

ідэолагаў краёвасці Міхала Ромера. Яшчэ адзін летувіскі даследчык, Дарыюс Сталюнас у сваім выступленні спыніўся на асобе віленскага адваката Тадэвуша Урублеўскага. Беларускі даследчык Алесь Смалянчук - на асобе вядомага ў Беларусі палітычнага дзеяча Рамана Скірмунта. Польскі гісторык Браніслаў Макоўскі - на асобах паэта Антанаса Баранаўскаса і грамадскага дзеяча Вінцаса Кудзіркі.

Праблема краёвасці разглядалася ў кантэксце ўсей еўрапейскай гісторыі. Рэферат Марыі Задэнцкай (Упсала) быў прысвечаны спробам распрацоўкі краёвай ідэалогіі вярхамі нямецкай грамадскасці прыбалтыйскіх земляў на пачатку 20 ст. Малгажата Грывач (Познань) спынілася на канцэпцыі краёвасці чэшскага філосафа і тэолага сярэдзіны 19 ст. Бернарда Бальцана.

Канферэнцыя паказала, што для далейшага даследавання азначанай праблемы велізарнае значэнне будуць мець спробы вызначыць самое паняцце "краёвасці" для розных перыядаў яе гісторыі. Таксама важна адрозніваць краёвасць як ідэалогію ад краёвасці як свядомасці. Безумоўна, больш глыбокаму разуменню гэтага гістарычнага феномена будзе спрыяць ягоны далейшы разгляд у кантэксце сусветнай гісторыі. Для гісторыі Беларусі і Летувы значную вагу набываюць даследаванні беларускага і летувіскага варыянтаў краёвасці. У прыватнасці, не выклікае сумнення прыналежнасць да краёвага руху ў 1910-1915 гг. вядомых дзеячаў беларускага руху братоў Луцкевічаў. Зразумела, што ў гэтым выпадку можна казаць пра пэўны беларускі варыянт краёвай ідэалогіі.

У апошнім выступленні прафесар Ян Юркевіч узняў пытанне, якое так ці інакш прысутнічала амаль ва ўсіх выступленнях і дыскусіях: ці з'яўляецца краёвасць пэўным гістарычным анахранізмам, ці яе можна трактаваць як спробу "піянерскага прарыву" ў будучыню? Даць

канчатковы адказ на гэтае пытанне немагчыма. Але можна пагадзіцца з прафесарам Юркевічам у тым, што, калі краёвасць і была анахранізмам, то перад такім анахранізмам можна з павагай схіліць галаву.

Алесь Смалянчук.

* * *

KAMUNIKAT.org

# КРАЯЗНАЎСТВА

*Аляксандр Краўцэвіч* (*Гародня*)

## ДЫНАСТЫЯ ЯГЕЛОНАЎ - МІФ ЦІ РЭАЛЬНАСЦЬ?*

Праблема, якая лягла ў аснову гэтага паведамлення, хутчэй не кур'ёз, а драма многіх людзей. Яна некалькі гадоў запар бударажыла цэлую краіну (нават не адну). Кур'ёзам гэта падзея можа здацца толькі людзям, якія адчуваюць задавальненне ад абмеркавання дэталяў чужога прыватнага жыцця. З другога боку гісторыя ёсць гісторыя, і мы, яе чорнарабочыя павінны займацца ўсімі яе праявамі, наколькі гэта магчыма.

31 кастрычніка 1424 г. у Пярэмышль прыбыў ганец з Кракава. Ён прывёз каралю Уладзіславу Ягайле, які ў гэты час знаходзіўся на набажэнстве ў касцёле, вестку пра нараджэнне першынца - сына Уладзіслава. Гэта была вельмі важная навіна для двух саюзных дзяржаў: Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. На момант нараджэння першынца каралю Ягайле, сыну вялікага князя Альгерда Гедымінавіча, было 76 гадоў. Мы не ведаем, якой была першая рэакцыя караля на гэтую навіну і ўвогуле, што ён пра ўсё гэта думаў. Вядома затое, што Ягайла развіў бурную дзейнасць, каб забяспечыць хлопчыку каралеўскі трон, а сабе гонар пачынальніка новай дынастыі польскіх каралёў. Гэты энергічны, прагны да жыцця і ўлады чалавек дасягнуў вяршыні свае асабістае кар'еры і адзіным магчымым крокам яшчэ далей угору было заснаванне

---

* Гэты тэкст уяўляе сабой паведамленне, зробленае на міжнароднай канферэнцыі "Усмешкі спадарыні Кліо", якая адбылася 1-2 красавіка 1995 г. у Гародні.

дынастыі. Гэтай справе Ягайла прысвяціў апошняе дзесяцігоддзе свайго жыцця.

Адразу з Пярэмышля ён шле ліст да папы рымскага: "У мяне нарадзіўся сын, які з Божай дапамогай возьме кіраванне каралеўствам і ўсімі маімі землямі як нашчадак і спадкаемца". Магчыма, гэтым афіцыйным лістом Ягайла хацеў адразу адсекчы ўсе нават нязначныя сумненні наконт яго запозненага бацькоўства. А падобныя сумненні, як пазней аказалася, мелі месца нават сярод блізкага каралеўскага атачэння.

Са з'яўленнем на свет гэтага немаўляці дынастычная сітуацыя ў Польшчы змянілася карэнным чынам. Паводле ўмоваў Гарадзельскай уніі 1413 г. польскі трон павінны былі заняць законныя нашчадкі Ягайлы і толькі ў выпадку іх адсутнасці маглі адбыцца выбары. Польскія магнаты тады ж прызналі спадкаемцай кароны Ядзвігу - дачку Ягайлы ад шлюба з Ганнай Цылейскай (з Пястаў). Пасля нараджэння Уладзіслава яна губляла ўсе правы на трон і ў магнатэрыі выплывала з рук мажлівасць уплываць на выбар ёй мужа з усімі выцякаючымі выгодамі: гандлем сваімі галасамі ўзамен за прывілеі, землі, грашовыя падарункі і да т.п. У сваіх адносінах да каралевіча магнатэрыя падзялілася на дзве партыі, адныя адразу прызналі яго спадкаемцай кароны, другія патрабавалі папярэдне ад Ягайлы пацвярджэння ўсіх сваіх ранейшых прывілеяў.

Для зацвярджэння правоў сына на польскі трон Ягайла сабраў 25 красавіка 1425 г. вальны сойм у Брэсце (Куяўскім). Яшчэ да яго пачатку кароль пачаў браць у гарадоў і шляхты пісьмовыя пацверджанні вернасці каралю, а пасля яго смерці - каралевічу і яго апекунам (каралеве Соф'і і вялікаму князю Вітаўту). У выпадку ж смерці сына гарады і шляхта павінны былі захаваць вернасць каралеўне Ядзвізе. Аднак на з'ездзе магнатэрыя запатрабавала ад караля пацвярджэння вольнасцяў і прывілеяў, прычым асобнымі дакументамі для кожнай зямлі. Польскія паны выдалі свой асобны акт, паводле якога каралевіч мог быць каранаваны

толькі калі стане паўналетнім і падцвердзіць усе ранейшыя прывілеі. Каралеве Соф'і і вялікаму князю Вітаўту гэтым дакументам апякунства адмаўлялася. Магнаты абышлі маўчаннем пытанне, хто будзе кіраваць дзяржавай пасля смерці Ягайлы, чалавека ўжо далёка не маладога. Кароль быў змушаны на нейкі час саступіць. 1 траўня 1425 г. ён асобным дакументам даў згоду на ўсе ўмовы магнатаў, але ў наступным годзе на з'ездзе ў Ленчыцы ад яго адмовіўся.

У 1426 г. каралева Соф'я нарадзіла яшчэ аднаго хлопчыка - будучага вялікага князя і караля Казіміра. У чэрвені 1427 г. яшчэ да яго з'яўлення на свет уся русінская шляхта Галіцкай зямлі згадзілася без усялякіх умоваў на патрабаванні караля. Гэта быў буйны палітычны поспех Ягайлы.

І тады, магчыма, як рэакцыя на гэтую перамогу паўстала справа па абвінавачванні каралевы ў нявернасці мужу. Ход гэтай справы дэталёва апісаны Янам Длугашам. У канцы верасня 1427 г. праходзіла сустрэча ў Гародлі вялікага князя літоўскага і караля польскага. Вітаўт у давяральнай размове расказаў Ягайле, што да яго дайшлі чуткі быццам каралева "звязалася пачуццём нязгодным з правам з некаторымі польскімі рыцарамі". Былі названыя імёны апошніх: Гіньча з Рогава, Пётр Куроўскі, Ваўжынец Зарэмба , Ян Краска, Ян з Канецполя і браты Пётр ды Дабеслаў са Шчэкоціна. Вітаўт параіў сваяку схапіць названых рыцараў, адаслаць кабет са двара каралевы ў Літву, а за самой Соф'яй пільна сачыць. Пакаёвак вывезлі, а рыцараў схапілі, аднак не ўсіх. Браты Пётр і Дабеслаў са Шчэкоціна і Ян з Канецполя паспелі ўцякчы. Уся справа атрымала пагалоску (для гэтага яна, відаць, і задумвалася). Ужо немагчыма было завяршыць яе па-ціхаму. Стварылася напружаная сітуацыя. Ворагі Ягайлы маглі скарыстаць скандал і адным ударам разбурыць усе дынастычныя планы караля. Можна сабе ўявіць, як у Польшчы людзі ўсіх станаў ад паноў да сялян перашэптваліся і кпілі са старога караля. Пакаёўкі каралевы пад катаваннем пацвердзілі яе віну, саму

Соф'ю Ягайла накіраваў у Кракаў, дзе тая ў канцы лістапада нарадзіла Казіміра.

Узнікае пытанне, а як жа было ўсё на самой справе ? Наўрад ці ў бліжэйшы час мы пра гэта даведаемся, але паразважаць можам. Здавалася б, сумнівы ў бацькоўстве Ягайлы маюць пад сабой падставу. Па-першае, надта ўжо паважны ўзрост для такой дзетанараджальнай актыўнасці - 76-79 гадоў. Па-другое, былі паказанні пакаёвак і сам факт ледзь не судовага працэсу над каралевай, маладзейшай за мужа на 57 гадоў. Як кажуць, дыму без агню не бывае.

З другога боку, можна паразважаць каму быў выгодны гэты скандал з каралевай. Тут усё больш-менш ясна - магнацкай групоўцы, якая не хацела ўмацавання дынастыі як пагрозы яе вольнасцям і палітычнаму значэнню ў каралеўстве. Распачаў усю справу як быццам Вітаўт, але адназначна ацаніць яго ролю тут не ўяўляецца магчымым. Ян Длугаш няпэўна выказваецца на гэты конт, маўляў, "дакладна невядома, ці гэта князь Вітаўт, здаўна загневаны на каралеву, вырашыў выставіць яе на смех".

Даволі спакуслiва паглядзець на справу праз прызму даўніх адносінаў паміж вялікім князем і каралём. Пасля жорсткай канфрантацыі ў 1382 г., калі страціў жыццё бацька Вітаўта Кейстут, а сам Вітаўт ратаваўся ўцёкамі, месца сяброўству між стрыечнымі братамі саступіла вострае суперніцтва. Спачатку змагаліся між сабой за ўладу ў Вялікім Княстве Літоўскім, потым супернічалі як кіраўнікі суседніх дзяржаў за славу, за будучыню. Дазволю сабе высунуць наступны тэзіс: поспех у такой справе як змаганне за ўладу прыходзіў да таго, хто быў гатовы да большых дзеля яе ахвяраў. Вітаўт забіваў, супрацоўнічаў з ворагам, пераступаў клятву, змяняў веру. Ягайла таксама праз усё гэта прайшоў, але акрамя палітычных ахвяраў ён дзеля ўлады прынёс у ахвяру яшчэ і мужчынскую годнасць. Так было ў гісторыі з яго шлюбам з каралевай Ядзвігай, калі каханага каралевы аўстрыйскага прынца магнаты выкінулі з яе ложка і ўклалі туды Ягайлу. Доўгі час Ягайла мусіў

цярпець свой статус "мужа каралевы". Цяпер жа на схіле жыцця, каб забяспечыць працяг дынастыі, ён дабіваецца фармальнага апраўдання жонкі праз суд.

Вітаўт афіцыйна выступае як абаронца гонару каралевы. Па просьбе Соф'і ён шле лісты да польскіх паноў, заклікае не даваць веры нагаворам і патрабуе афіцыйна прыняць ад каралевы ачышчальную клятву. У лісце з 1430 г. ён патрабуе ад хохмайстра Тэўтонскага ордэна тлумачэнняў, ці праўда, што ад імя хохмайстра каралю Ягайле данеслі быццам ён, Вітаўт, распаўсюджваў плёткі пра пазашлюбнае паходжанне каралеўскіх сыноў. Напэўна, у справе была замешана дыпламатычная гульня, але застаецца фактам, што імя Вітаўта фігуруе ў справе Соф'і на адным з першых месцаў.

Сама каралева Соф'я баранілася як магла. Яна прынесла ачышчальную клятву, пацверджаную сям'ю вартымі даверу дзяўчатамі перад лідэрам магнацкай партыі кардыналам Збігневам Алесьніцкім і іншымі вышэйшымі саноўнікамі каралеўства. Акрамя таго ў 1431 г. яна сама абвінавaціла рыцара Яна Страша з Бялчова ў абгаворванні яе перад Вітаўтам і літоўскімі панамі. Сведкамі з боку каралевы выступалі два малойцы са слаўнай сямёркі: Гіньча з Рогава і Пётр Куроўскі. Ян Страш кляўся і бажыўся, што ніколі не ганіў каралеву, але гэта не дапамагло яму пазбегнуць турмы. Кагосьці ж трэба было пакараць. Абвінавачванне каралевы было афіцыйна скасавана, справу закрылі. Сямёра рыцараў, якія фігуравалі ў справе нікольki не пацярпелі і засталіся на прыдворнай службе.

Толькі ў 1432 г. на з'ездзе ў Сераддзе Ягайла дамогся згоды часткі магнатаў прызнаць карону пасля смерці караля ягонаму старэйшаму сыну Уладзіславу. Аднак гэтая перамога была нядоўгай, урэшце Ягайла быў змушаны прызнаць умовы магнатаў і да канца жыцця не быў упэўнены ў працягу сваёй дынастыі. У Гарадку, лежачы на смяротным ложы, 86-гадовы кароль упрошваў прысутных паноў прызнаць каралём свайго сына Уладзіслава, які "з твару быў на яго падобны".

Ягайла дамогся свайго. Ад таго часу каралі і вялікія князі з дынастыі Ягелонаў амаль паўтары стагоддзі кіравалі Польскім каралеўствам, Вялікім Княствам Літоўскім, а таксама Чэшскім ды Венгерскім каралеўствамі. Ягайла перамог, праўда, сваімі ўступкамі магнатам і шляхце ён прычыніўся да стварэння палітычнай сістэмы "шляхецкай дэмакратыі", якая ўрэшце прывяла да пагібелі і Польскае каралеўства, і Вялікае Княства Літоўскае.

Такім чынам, справу па абвінавачванні каралевы Соф'і ў нявернасці мужу варта лічыць хутчэй палітычнай чым этычнай праблемай. Яна з'явілася на свет у выніку чыста палітычных разлікаў. Праўду пра бацькоўства Ягайлы панеслі за сабой у магілу людзі тых часоў і, напэўна, не хутка дойдзе да яе высвятлення, хоць дасягненні сучаснай навукі даюць для гэтага падставы.

Не так важна ад каго пайшлі ягайлавы дзеці, гісторыя ў сваіх аналах замацавала менавіта яго імя. Ягайла перамог Вітаўта і свой лёс. Дынастыя Ягелонаў - рэальнасць, наколькі можа быць рэальнасцю сама гісторыя.

*Мікола Гайба* (*Наваградак*)

# НАВАГРАДАК І ЯГОНЫЯ ЖЫХАРЫ Ў ПОЛЬСКАЙ КРАЯЗНАЎЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ 20 СТ.

Наваградак - адзін з самых старажытных беларускіх гарадоў. Ён узнік і сфарміраваўся на зямлі, якая стала радзімай некалькіх народаў. Лёс горада вызначаўся палітычнымі ўплывамі розных дзяржаўных утварэнняў, у склад якіх ён уваходзіў. Так, на пачатку 20 ст. Наваградак быў павятовым горадам Расійскай імперыі, а пазней ужо з'яўляўся цэнтрам ваяводства ў міжваеннай Польшчы.

Аб'ектам аналізу ў дадзеным артыкуле з'яўляецца адлюстраванне нацыянальнага жыцця і грамадска-палітычнай дзейнасці наваградчан, якое пакінула нам польская краязнаўчая літаратура першай трэці 20 ст.

На мяжы 19-20 ст. Наваградак быў звычайным беларускім павятовым горадам. Згодна перапісу 1897 г. у ім жыло 7 887 жыхароў. Сярод іх, як вызначыў перапіс, беларусы (па мове) складалі каля 21%, яўрэі - каля 63%, рускія, палякі, татары - прыкладна па 5%.

Польскія аўтары, зразумела, найперш звярталі ўвагу на праявы ў Наваградку польскага жыцця[1], на яго тагачасны стан у параўнанні з мінулымі часамі. Адна з варшаўскіх падарожніц, якая наведала Наваградак у 1906 г., убачыла яго занядбаным і пустым. У сваіх падарожных запісках яна са шкадаваннем адзначыла, што "аб яго былой славе нічога не нагадвае, акрамя замкавых руін і былога доміка Міцкевічаў". Дом гэты, аднак, быў не толькі гістарычным помнікам, але і месцам, вакол якога групавалася польская грамадскасць. Адсюль, па словах А.Снежкі, "прамяніліся ідэалы польскага духу"[2].

[1] Radysowa J. Wrażenia z wycieczki w Nowogródku // Ziemia. 1906. № 10. S. 119.

[2] Sneżko A. Dworek Mickiewiczowski w Nowogródku. Lida, 1939. S. 33.

Яшчэ адной праявай польскага, ці, лепш сказаць, польскамоўнага жыцця на пачатку 20 ст. быў касцел св. Міхала (былы дамініканскі). Фарны касцёл ужо некалькі дзесяцігоддзяў стаяў зачыненым з-за дрэннага стану. Эдвард Паўловіч, які зведаў касцёл, у 1904 г. пісаў, што гэта адзіны ў Наваградку помнік не толькі наваградчанам, але і ўсяму польскаму грамадству, з якім многія сем'і наваградчан звязаны, калі не крывёю, то духам. На яго думку, ужо адзін толькі помнік удзельніку хоцімскай бітвы Рудаміну Дусяцкаму заслугоўвае, каб быў адноўлены ўвесь касцёл"[3]. У сувязі з адкрыццём у Львове помніка Адаму Міцкевічу той жа аўтар выказаў надзею, што жыхары Наваградка "будуць вартымі слаўных продкаў", і навіна пра адкрыццё помніка Адаму Міцкевічу будзе спрыяць актывізацыі польскага грамадска-культурнага жыцця ў горадзе[4].

У 20-30-я гады, калі Наваградак уваходзіў у склад Польшчы, з'явілася велізарная колькасць краязнаўчых прац, у якіх апісвалася гістарычнае развіццё Наваградчыны і яе культурна-этнічныя асаблівасці. Наваградчане ў гэтых публікацыях звычайна паказваліся са станоўчага боку, адзначалася багацце гістарычных традыцый і прыгажосць прыроды края. У адным з даведнікаў можна было прачытаць: "Наваградская зямля, далёкая і забытая, паліта крывёю польскіх герояў. <...>Край Міцкевіча напоўнены засценкамі і сядзібамі, якія размешчаны сярод лугоў і пагоркаў, і абмыты сонечнымі промнямі"[5].

Многія аўтары падкрэслівалі талерантнасць наваградчан падчас бурлівых падзей рэвалюцыі 1905-1907 гг. Яны адзначалі, што "мясцовы люд не чыніў тут дзікіх эксцэсаў, не пайшоў нішчыць сядзібы, не паддаўся заклікам да класавай, нацыянальнай і рэлігійнай барацьбы". Тлумачылася гэта, на іх думку, "уплывамі адвечнай польскай культуры"[6].

---

[3] Pawłowicz E. W sprawie narodowych pamiątek. Lwów, 1904. S. 11-12.

[4] Там жа. S. 13.

[5] Laroj W. Nad błękitnym Niemnem. Nowogródek, 1934. S. 3.

[6] Mienicki R. Ziemia Nowogródzka w dobie porozbiorowej. Wilno,

У літаратуры тых жа 30-х гадоў мы знаходзім і апісанне падзей першай святовай вайны. Увага звычайна акцэнтавалася на адноснай талерантнасці нямецкай улады, якая сістэматычна нішчыла сядзібы, праводзіла рэквізіцыі і накладвала вялікія падаткі, але ўсё ж не перашкаджала "жменьцы палякаў, што тут засталіся" адкрываць свае школы і нават весці грамадскую дзейнасць[7].

У краязнаўчай літаратуры таго часу Наваградчына трактавалася як частка спрадвечнай польскай дзяржавы. Зусім не прымалася пад увагу, што на пачатку 20 ст. свае правы на дзяржаўнасць заявіў і беларускі народ. Мы нідзе не знойдзем згадкі пра абвяшчэнне на этнічна беларускіх землях БНР, а пазней - БССР. Хаця гэта зразумела, бо беларуская зямля была падзелена паміж Польшчай і савецкай Расіяй. Практычна ўсе канцэпцыі, якія закраналі праблему межаў Польшчы ўключалі ў яе склад і частку тэрыторыі, населенай беларусамі. Па меньшай меры, такую яе частку, якую ў хуткім часе разлічвалі спаланізаваць. У асяроддзі польскіх землеўласнікаў (і не толькі іх) бытавала думка, што ўсё беларускае трэба захаваць толькі ў якасці фальклору[8].

Як жа характарызаваліся беларусы Наваградскага краю ў краязнаўчай літаратуры? У прыватнасці, адзначалася пэўная навізна тэрміна "беларусы". "Люд, які жыве на Наваградчыне, - пісаў адзін з даследчыкаў, - прынята называць беларускім. Але такая назва паўстала не так даўно. Раней гэта была Літва або Чорная Русь. І нават цяпер сярод старых людзей жыве прымаўка: "То што ж ты хочаш - гэта ж Чорная Русь"[9]. Другі аўтар адзначаў, што пад уздзеяннем агітацыі беларускіх дзеячаў і ўплываў, што ішлі з Савецкай Беларусі палітычная свядомасць сярод беларусаў Наваградчыны ўзрасла. "Але, наогул, беларускі народ, -

---

1935. S. 70.

[7] **Żmigrodski J. Nowogródek i okolice. Wyd. 3. Wilno, 1931. S. 17.**

[8] Mironowicz E. O stosunkach polsko-białoruskich po I wojnie światowej // Białostoczczyzna. 1994. №1. S. 61-62.

[9] Moszyński K. Nowogródzkie pod względem etnograficznym // Nowogródzkie. Warszawa, 1926. S. 9.

працягваў ён думку, - мала здольны да арганізацыйнай працы, недаверлівы, абыякавы да нацыянальна-палітычных лозунгаў. Ён больш падатлівы на заклікі сацыяльнага радыкалізму, не жадае польскай улады і сімпатызуе бальшавікам"[10].

Сімпатыі беларусаў да бальшавізму адзначаліся і іншымі аўтарамі. Так, адзін з іх паведаміў, што "рускія навагрудчане (напэўна, меліся на ўвазе беларусы - М.Г.) і яўрэі віталі ўваход у горад Чырвонай Арміі ў 1918"[11].

Польска-беларускія адносіны закрануў у сваіх мемуарах Зыгмунт Бечковіч, навагрудскі ваявода ў 1926-1931 гг.[12] Ён адзначыў напружанасць гэтых узаемаадносін. Прычыну былы ваявода бачыў у дзейнасці Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, якая знаходзілася пад уплывам камуністаў, і ў "неразумных дзеяннях" яго папярэдніка, ваяводы Янушайціса. Незадавальненне беларусаў, па яго словах, выклікала і ваеннае асадніцтва, пад якое адводзіліся лепшыя землі. Сам З.Бечковіч, калі стаў ваяводам, спрабаваў перавесці беларуска-польскія адносіны на пазіцыі супрацоўніцтва, імкнуўся далучыць беларусаў да дзяржаўнага жыцця як грамадзян польскай дзяржавы. З.Бечковіч успамінаў пра свае спробы прыцягнуць памешчыкаў і асаднікаў да супрацоўніцтва з беларусамі ў гаспадарчым жыцці.

Былы ваявода спыніўся і на адносінах да польскай улады яўрэйскага і татарскага народаў. Па яго словах, гэтыя адносіны не насілі канфліктнага характару. Яўрэі ў Навагрудку складалі амаль палову ўсіх яго жыхароў. Яны былі купцамі, адвакатамі, лекарамі, настаўнікамі. Яўрэі мелі сінагогу, школы, бібліятэку, шпіталь, прытулак для састарэлых, нават спартыўную каманду. З сярэдзіны 1930-х гадоў яны выдавалі дзве газеты "Навагрудскае жыццё" і "Навагрудскі тыдзень". Татараў у Навагрудку налічвалася

---

[10] Lisiewicz E. Stosunki narodowościowe i administracyjne w wojew. Nowogródzkim // Nowogródzkie. Warszawa, 1926. S. 16.

[11] Żmigrodzki J. Nowogródek i okolice. S. 18.

[12] **Skonka Cz. Z. Beczkowicz - były wojewoda Nowogródzki // Pieśń skrzydłata. 1992. № 1. S. 19.**

-----------------------------------------------------------------------------------------------
каля 400 чалавек. Значная іх частка займалася агародніцтвам, апрацоўкай скур, працавала ў розных установах. Для сваіх духоўных патрэб татары мелі мячэць, рэлігійную школу, Народны дом. У паўсядзённым жыцці яны карысталіся пераважна беларускай мовай.

Варта заўважыць, што ў 30-я гады звесткі пра беларусаў Наваградчыны практычна знікаюць са старонак краязнаўчай літаратуры.

На заканчэнне трэба адзначыць, што на пачатку 20 ст. у польскай краязнаўчай літаратуры, прысвечанай Наваградчыне, галоўная ўвага надавалася праявам жыцця польскай грамадскасці. У публікацыях 20-х гадоў польскія аўтары пачалі звяртаць увагу на беларусаў і іншыя народы краю. Але ў сваіх падыходах да праблем грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Наваградскага краю ўсе яны зыходзілі з перакanання, што гэты край з'яўляецца неад'емнай часткай польскай дзяржавы.

* * *

KAMUNIKAT.org

# КРАЯЗНАЎЧАЕ ЖЫЦЦЁ

Тамара Вяршыцкая (Наваградак).

## НАВАГРАДСКІ "ПРАМЕНЬ"

У 1997 г. у Наваградку паўстала недзяржаўнае культурна-асветніцкае аб'яднанне аматараў ведаў "Прамень".

За 180 гадоў да гэтага, у 1817 г. маладыя ўраджэнцы Наваградчыны Тамаш Зан, Ян Чачот, Адам Міцкевіч, Ігнат Дамейка, поўныя надзей і жадання змяніць жыццё да лепшага, стварылі сярод студэнтаў Віленскага універсітэта Таварыства філаматаў (аматараў ведаў) "Прамяністыя". Шлях да паляпшэння жыцця бачыўся ім праз пашырэнне асветы.

У Наваградку заўсёды былі і ёсць энтузіясты, для якіх вывучэнне і папулярызацыя гісторыі і культурных здабыткаў свайго краю з'яўляецца справай жыцця. "Прамень" у першую чаргу імкнецца пашыраць сярод дзяцей і моладзі веды пра Наваградчыну, выхоўваць павагу да свайго краю, свайго народа і да самых сябе. У гэтай справе вельмі важна аб'яднаць аднадумцаў і стварыць магчымасці для рэалізацыі незапатрабаваных грамадствам талентаў, каб спрабаваць ажыццявіць ідэі і праекты, якія не пад сілу аднаму чалавеку.

Аб'яднанне "Прамень" разглядае Наваградак як культурны і духоўны цэнтр усяго рэгіёна, што абумоўлена яго папярэдняй гісторыяй. Былі ў ёй моманты высокіх узлётаў. Тут пачыналася гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. Адсюль кіравалі рэлігійным жыццём усёй краіны. А калі наступалі перыяды заняпаду на першы план выходзілі інтэлігенты, якія мелі належныя веды і зычліва ставіліся да народу. Гэтыя пастулаты "Прамень" і паклаў у аснову свайго існавання.

Праекты, распрацаваныя "прамяністымі" канца 20 ст., прадугледжваюць стварэнне ў Наваградку школы мастацтваў, выданне часопіса "Зямля Наваградская" (на

польскай і беларускай мовах), падрыхтоўку сумесна з музеем выставы "Шляхецкія сядзібы Наваградчыны ў 19 ст.", выданне кнігі ўспамінаў былога наваградца сп. Дж.Кагана "Як мы перажылі халакост з рускімі яўрэйскімі партызанамі" ў перакладзе на беларускую мову. Праекты накіраваны на стварэнне новых магчымасцей для творчага развіцця асобы, на даследаванне малавядомых, але важных і вызначальных гістарычных з'яў і падзей, на ліквідацыю "белых плямаў" у нашым веданні мінулага.

"Прамень" і Наваградскі гісторыка-краязнаўчы музей распрацавалі сумесны праект, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння Адама Міцкевіча. Мы імкнемся даследаваць і паказаць (з дапамогай выставы) асяроддзе, якое спрыяла станаўленню выдатных дзеячаў літаратуры І9 ст. - Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Уладзіслава Сыракомлі, Вінцэся Каратынскага і інш. Выстава прадугледжвае знаёмства з сядзібнай архітэктурай 19 ст., удзельнікамі ваенных, палітычных і грамадскіх падзей, а таксама дзеячамі мастацтва, навукі і літаратуры.

На самым пачатку свайго існавання аб'яднанне "Прамень" ініцыіравала стварэнне дзіцячага клуба "Зялёная карова". Яго дзейнасць накіравана на пошук і падтрымку таленавітых дзяцей і падлеткаў, развіццё і выхаванне іх асобы. Клуб займаецца вывучэннем гісторыі, культуры, побыту, народных рамёстваў, цікавіцца праблемамі экалогіі. Двухтыднёвы экалагічны летнік на Свіцязі, арганізаваны старэйшай групай клуба "ЗК" у жніўні 1997 г., пазнаёміў яго ўдзельнікаў з флорай і фаўнай возера, з уплывам розных аспектаў дзейнасці чалавека на біяцэноз мясцовага заказніка. У гэтым годзе плануецца правядзенне семінара па правілах і метадах экалагічнага даследавання, арганізацыя яшчэ аднаго летніка, падчас якога будзе складзена экалагічная карта заказніка, ідэнтыфікаваны прадстаўнікі флоры і фаўны, праведзена вечарына "Легенды і паданні Свіцязі". Матэрыялы даследаванняў будуць прадстаўлены грамадскасці. Адначасова малодшая група клуба займаецца пошукам слядоў славутай бібліятэкі Храптовічаў са Шчорсаў. Праект уключае збор інфармацыі па гісторыі вёскі Шчорсы і складанне генеалагічнага дрэва роду Храптовічаў, пошук кніг з бібліятэкі сярод мясцовага насельніцтва.

На сённяшні дзень Асацыяцыя недзяржаўных арганізацый г. Наваградка выдае газету "Самі аб сабе". Яе наклад - 299 паасобнікаў. Нашая газета - гэта спроба намаляваць праўдзівы партрэт сучаснага наваградца, спроба зазірнуць у глыбіню нашых душ.

* * *

KAMUNIKAT.org